Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 23 лістапада 1990 г. № 47 (3561) ● Цана 10 кап.

«ЧАЦВЁРТАЯ ЎЛАДА»: ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

Камісія ВС БССР па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека распрацоўвае заканадаўства аб друку

АБВЯШЧЭННЕ суверэнітэту Беларусі, перавод эканомікі на рынкавыя рэйкі, іншыя рэаліі нашага зменлівага жыцця спараджаюць сапраўдны заканадаўчы «бум». На разгляд чарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі, якая адкрыецца 5 снежня, мяркуецца вынесці некалькі дзесяткаў юрыдычных актаў, у большасці сваёй — першаступеннага значэння. Іх падрыхтоўкай і занятыя цяпер дэпутаты. Важнасць гэтай працы ніколькі не меншае ад таго, што яна — чарнавая, невідовішчная для фота- і тэлеаб'ектываў. Менавіта на гэтай стадыі, пад час работы ў дэпутацкіх камісіях, закладаецца якасць будучых законаў, шмат у чым вызначаецца іх лёс: застануцца яны на паперы альбо натуральна ўвойдуць у жыццё грамадства, падтрымаюць у ім пазітыўныя зрухі.

Навошта даводзіць банальныя ў прынцыпе рэчы? Ды таму, што час не спрыяе нармальнай заканатворчай дзейнасці. Зарад адмоўнай электрычнасці, што назапашваецца сярод людзей, незадаволенасць жыццём, якое пайшло ўраздроб, робіцца сёння «казырнай картай» палітычных гульняў, уплывовым фактарам барацьбы за ўладу. Хто і куды скіруе раздражнёнасць чалавека, апошнія чаравікі якога раптам запрасілі кашы, а новыя, фігуральна кажучы, не купіць і не ўкрасці? Не можа не трывожыць той факт, што ў якасці своеасаблівага громаадводу для сацыяльнай напружанасці рэакцыя выкарыстоўвае дэпутацкі корпус, найперш яго дэмакратычную частку. Маўляў, яны там няспынна засядаюць, марнуюць час, а жыццё пагаршаецца... Але, думаецца, менавіта патуранне такім настроям, іх мэтанакіраванае распальванне і трэба кваліфікаваць як «антысавецкую дзейнасць» — гэта значыць, скіраваную супраць Саветаў, канстытуцыйных і поўнаўладных органаў.

ЗАКАНАТВОРЧАЯ дзейнасць Вярхоўнага Савета рэспублікі пастаянна знаходзіцца ў полі зроку «ЛіМа». Мы ўжо знаёмілі чытачоў з тымі падыходамі, якія закладаюцца ў аснову новай беларускай Канстытуцыі, друкавалі праект закона аб культуры... 19 лістапада мне давялося прысутнічаць на першым пасяджэнні рабочай групы па выпрацоўцы праекта Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Вёў пасяджэнне старшыня камісіі ВС БССР па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека І. Каратчэня.

Дэпутат А. Вярцінскі, які прадстаўляў законапраект, адзначыў, што гэты акт мае на мэце абвясціць свабоду друку і іншых сродкаў масавай інфармацыі як адну з форм рэалізацыі права грамадзяніна на свабоду слова і свабоду інфармацыі, вызначыць прававыя, арганізацыйныя і сацыяльныя асновы дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі; адрэгуляваць іх адносіны з дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, з палітычнымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі, з грамадзянамі; акрэсліць грамадскі і юрыдычны статус, правы і абавязкі журналістаў як асноўнага суб'екта сродкаў масавай інфармацыі. Мяркуецца, што далейшая праца над праектам павінна весціся паралельна з падрыхтоўкай законаў «Аб свабодзе слова» і «Аб свабодзе інфармацыі».

Праект рэспубліканскага заканадаўства аб друку ўлічвае вопыт аналагічных актаў, прынятых ужо на саюзным узроўні, у прыбалтыйскіх рэспубліках, Малдове, а таксама вопыт некаторых замежных краін сталай дэмакратыі. Адметнасцю з'яўляецца тое, што наш праект безумоўна грунтуецца на Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, адпаведна вызначаючы прыярытэтнасць беларускага друку.

Нягледзячы на тое, што гэта было першае пасяджэнне рабочай групы, абмеркаванне адбылося грунтоўнае і зацікаўленае. І гэта натуральна, бо ўдзельнічалі ў ім пераважна практыкі, людзі, непасрэдна звязаныя з дзейнасцю сродкаў масавай інфармацыі — журналісты, рэдактары, выдаўцы, прадстаўнікі творчых саюзаў. У выступленнях пісьменніка Б. Сачанкі, намесніка старшыні Дзяржкамдруку БССР С. Нічыпаровіча, галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь» А. Шабаліна, народных дэпутатаў І. Герасюка, С. Навумчыка, Я. Глушкевіча, старшыні Рады СП Беларусі В. Зуёнка і іншых выказваліся заўвагі як канцэптуальнага, так і прыватнага характару.

У СВАЮ ЧАРГУ мне таксама хацелася б адзначыць важнасць і актуальнасць заканадаўства аб друку і свабодзе слова. Калі паслядоўна праводзіць курс на размежаванне закандаўчай, выканаўчай і судовай улад, то непазбежна паўстае пытанне аб «чацвёртай уладзе» — сродках масавай інфармацыі. Бо праз іх найперш ажыццяўляецца абавязковая перадумова любой іншай формы свабоды —права свабодна выказваць свае думкі. Грамадства павінна дазваляць аднаму чалавеку казаць, што кароль голы, нават калі здаецца, што прамоўца не мае рацыі. Як ведаць, ці не здарыцца так, што «няправільнае» сёння будзе слушным заўтра? Калі, вядома, даслухаць прамову да канца...

Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Уладзіміру Караткевічу на 60-годдзе і на вякі

Імя тваё —
Дрэва высокае
Небасхілы веры трымае.
На адужэлых суках
Нядрэмнага дрэва
Карціць пагушкацца,
пагутатацца
І тым,
Хто тужыцца ўспомніць цябе,
І хто забыцца стараецца,
І запабежнікам,
Што сталі сябрамі цяпер.
І зласліўцам,
Якія ў зайздросці магутнай
Сіпець стаміліся.
Усе чапляюцца за сукі.

А дрэва расце
Дужэй і вышэй.
Усё стрывала.
І ўсё і ўсіх яно вытрымае!

Рыгор БАРАДУЛІН.

(Гл. стар. 8—9).

У Альбуці—Коласаў музей

Урачысты момант: Даніла Міцкевіч і Максім Лужанін адчыняюць музей у Альбуці.
Фота Ул. КРУКА.

Урачыста адзначаны сёлета дзень нараджэння Якуба Коласа. Дата не круглая, але супала з ёю падзея адметная. У Альбуці адкрыты філіял Літаратурнага музея народнага песняра. Прысутных віталі дырэктар музея З. Камароўская, пісьменнікі М. Лужанін, А. Вярцінскі, У. Паўлаў, А. Жалязоўскі, старшыня Дзяржкамдруку БССР А. Вутэвіч, сын Якуба Коласа Д. Міцкевіч.

Госці сталі першымі наведвальнікамі філіяла. Пра яго расказала аўтар сцэнарыя музейнай экспазіцыі Я. Аляксеева. Тут жа былі і мастакі-афармісклі В. Ламака і Т. Голубева.

У двары сядзібы выступілі самадзейныя артысты са Стаўбцоўскага, Нясвіжскага, Уздзенскага і Валожынскага раёнаў, а таксама госці — ансамбль з братняй Украіны.

І. КУРБЕКА.

ДЗЯДЫ Ў МАГІЛЁВЕ...

Сёлета на Дзяды ў Магілёве адбыўся мітынг-рэквіем на месцы масавых забойстваў 20—30-х гадоў. У мітынгу прынялі ўдзел святары розных канфесій. Выступілі сведкі тых трагічных падзей, сябры таварыства «Мартыралог Беларусі», маладзёжнай суполкі «Машэка», Таварыства беларускай мовы. Яны гаварылі аб ахвярах сталінізму, аб трагічным лёсе сваіх блізкіх, аб мове і культуры народа, якія таксама былі знявечаны. Вялікая справа духоўнага аздараўлення грамадства павінна пачацца з аднаўлення памяці, з павароту да праўдзівай гісторыі, да народных каранёў...

М. БУЛАВАЦКІ,
старшыня Магілёўскай філіі таварыства «Мартыралог Беларусі».

Святкаванне Дзядоў у Магілёве.

...І Ў БАРАНАВІЧАХ

28 кастрычніка ў Баранавічах быў устаноўлены крыж з надпісам «Ахвярам гвалту 1939 — 1953 гг.». У цэнтры горада, на месцы, дзе ў свой час знаходзілася НКУС. Тысячы людзей прайшлі тут праз рукі сталінскіх катаў. Нездарма ў народзе гэтае месца называлася «крывым колам».

Да васьміметровага металічнага крыжа ідуць і ідуць людзі, асабліва сталага веку. Сюды пастаянна нясуць кветкі, тут гараць свечкі. Веруючыя становяцца на калені.

Усё гэта дужа не спадабалася мясцовым чыноўнікам. Гарвыканком вынес рашэнне аб зносе помніка. І вось у 2 гадзіны ночы 12 лістапада да крыжа рушылі на трактары, грузавіну і аўтобусе работнікі жылкамунгаса горада на чале з намеснікам начальніка Рыжыкавым. Ён «націскаў» на закон: маўляў, дзейнічае ў адпаведнасці з ім. Але дзіўная справа, чаму закон патрэбна выконваць ноччу? Каля гадзіны ішла «палеміка» паміж актывістамі гарадскога аддзялення БНФ і прадстаўнікамі камунальнай гаспадаркі, але ўсё ж апошнім прыйшлося развярнуць тэхніку і з'ехаць.

Л. ПЛЫГАЎКА.
г. Баранавічы.

Катастрофа адбылася ў Наваполацку. На ВА «Палімір» пад час запаўнення чыгуначнай цыстэрны атрутным рэчывам ацэтонцыянгідрын пераліўся цераз край ёмістасці. Пасля хімічны прадукт быў змыты з зямлі ў тупіковы калодзеж, але ён аказаўся разгерметызаваны. Гэта і з'явілася прычынай залпавага скіду атрутнага рэчыва ў раку Ушача, якая ўпадае ў Заходнюю Дзвіну.

«Гэтая катастрофа, магчыма,—апошні званок»,—лічыць Генадзь МАІСЕЕЎ, народны дэпутат БССР, народны дэпутат Наваполацкага гарсавета, старшыня грамадскага экалагічнага савета Наваполацка, з якім мы вядзём гутарку.

АПОШНІ ЗВАНОК

— Генадзь Фёдаравіч, крыху аб падрабязнасцях гэтага, мякка кажучы, прыкрага здарэння...

— Скінута 15 кубаметраў ацэтонцыянгідрыну. Калі перавесці яго на цыяніды, то гэта складзе прыкладна 7,6 тоны! Цыяніды—гэта састаўныя сінільнай кіслаты, мацнейшага атрутнага рэчыва. На вялізных адрэзках Ушачы і Заходняй Дзвіны было знішчана ўсё жывое! Па дадзеных прадстаўніка Белрыбвода, які працуе ў Наваполацку ў складзе камісіі, у рэках наглядаецца поўная гібель рыбы. Загінулі нават жабы. Што тычыцца вінаватых, дык іх знойдуць. Гэта задача органаў пракуратуры і іншых, як кажуць у такіх выпадках, кампетэнтных органаў. Але справа не толькі ў гэтым. Катастрофа, якая тут здарылася, а рэха яе ў поўнай меры адчулі ў Латвіі, вынік нашай безгаспадарчасці, абыякавага стаўлення да сваіх службовых абавязкаў, варварскага абыходжання з прыродай.

Пасля выкіду ў раку хімічнага прадукта экалагічныя службы Даўгаўпілса ўстанавілі кантроль за цыянідамі ў Заходняй Дзвіне. У выніку ў горадзе амаль са 150-тысячным насельніцтвам давялося адключыць пітную ваду. Такім жа чынам вымушаны былі зрабіць многія гарады Латвіі. Рэспубліка панесла каласальныя страты. Рыга, наколькі мне вядома, вымушана была тэрмінова раскансерваваць свідравіны з пітнай вадой.

— Патрабаваць кампенсацыі ад Беларусі, пэўна, кашчунна, нам і так хапае праблем з Чарнобылем...

— Але ж нехта павінен кампенсаваць гэтыя страты. Відаць, мае адбыцца сур'ёзная размова паміж прадстаўнікамі абедзвюх рэспублік. Калі яны не памяркуюцца, справу вырашыць суд ці арбітраж. Магу толькі сказаць, што, паводле папярэдніх дадзеных, страты ў Латвіі склалі каля 60 мільёнаў рублёў, у Беларусі — каля 20 мільёнаў. Не ведаю, ці зможа такую фантастычную суму выплаціць вытворчае аб'яднанне «Палімір»—віноўнік катастрофы...

Атручаная вада ўжо прайшла па Даўгаве ў Балтыйскае мора. Натуральна, што краіны, якія знаходзяцца ў балтыйскім рэгіёне, уздымаюць трывогу. Вельмі заклапочаны сітуацыяй Швецыя, Фінляндыя, Данія, а таксама нашы балтыйскія рэспублікі.

— Ці можна спрагназіраваць сітуацыю далей? У раёне ж Наваполацка вялізная прамысловая зона. Раптам пасля гэтай катастрофы штосьці недзе яшчэ прарвецца ці выльецца?

— Усе спецыялісты, якія цяпер разбіраюцца ў гэтай сітуацыі, упэўнены, што рух «зялёных» нездарма так востра ставіў пытанне аб экалагічнай неабароненасці насельніцтва нашага рэгіёна і Прыбалтыкі. Сапраўды, у нас ёсць прадпрыемствы, якія выпускаюць яшчэ больш таксічныя рэчывы: аб'яднанне «Нафтааргсінтэз», «Шкловалакно-1», «Шкловалакно-2».

Наогул, варта падумаць над тым, ці патрэбны нам такі гіганцкі прамысловы комплекс, заціснуты паміж Заходняй Дзвіной і Ушачай? На гэтай маленькай тэрыторыі мы не можам нават пашырыць ачышчальныя збудаванні. Эколагі прапаноўвалі новую пляцоўку за 25—30 кіламетраў ад горада. Туды трэба было б паступова выводзіць экалагічна брудныя і небяспечныя вытворчасці.

— А ці нельга перапрафіляваць гэтыя прадпрыемствы, альбо ўвогуле іх закрыць, калі прадпрыемствы пагражаюць нам непрадказальнымі экалагічнымі катастрофамі?

— Не думаю, што на гэта пойдуць саюзныя ведамствы. Мы ўжо змагаемся з імі не адзін год. Ну што ім да таго, што толькі ў адным аб'яднанні «Нафтааргсінтэз» палова тэхналагічнага абсталявання са 100-працэнтнай зношанасцю!

— І як жа жыве Наваполацк у такіх умовах?

— Мы пастаянна знаходзімся ў «газавай камеры». «Ружа вятроў» у нас такая, што ўсе

З ПОШТЫ «ЛіМа»

НА ПАРАДАК ДНЯ З'ЕЗДА!

Паважаныя таварышы члены Цэнтральнага Камітэта камуністычнай партыі Беларусі!

З 1-га верасня 1990 г. Закон БССР «Аб мовах у Беларускай ССР» уступіў у сілу, Саветам Міністраў БССР зацверджана дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых моў у Беларускай ССР. Але, як вядома, кампартыю Беларусі гэтыя асноватворныя дакументы ідэалогіі і духоўнага жыцця рэспублікі аніяк не закранулі. Партыя адстае ад хуткаплынных падзей часу, абыходзіць маўчаннем просьбу народа вярнуць яму родную мову, культуру, гістарычную памяць, не разумее той надзвычайнай сітуацыі, якая склалася ў рэспубліцы. Партыя дасюль не звярнулася да камуністаў у падтрымку гэтых важных дакументаў, не паказала прыклад у авалоданні і карыстанні беларускай мовай. Пераважная большасць кіраўнікоў партыі розных узроўняў праяўляе абыякавасць, нігілістычныя адносіны да беларускай мовы, яны як не карысталіся, так і не карыстаюцца ёю на з'ездах і пленумах, канферэнцыях і сходах; справаводства і дакументацыя вядзецца толькі на рускай мове.

Заклікаем вас праявіць нацыянальную і чалавечую свядомасць, уключыць у парадак дня XXXI з'езда камуністычнай партыі Беларусі пытанне аб беларускай мове і нацыянальнай культуры. Ад іх вырашэння ў многім будзе залежаць лёс усёй беларускай нацыі, ды і лёс самой камуністычнай партыі.

Па даручэнні партыйнага сходу Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута

В. ШАРАНГОВІЧ,
старшыня сходу.

КАЛІ НАМ СВЯТКАВАЦЬ ДЗЕНЬ ДРУКУ

Беларускай нацыі пашчасціла першай з усходніх славян займець свае друкаваныя выданні. Здавалася б, мы і павінны тут лідэрствава́ць. Аднак гісторыя распарадзілася інакш, наша друкаванае слова было на доўгія гады забаронена.

Сёння мы вяртаемся да сваіх каранёў. Адным з крокаў у гэтым кірунку, на маю думку, магло б стаць устанаўленне нашага нацыянальнага Дня друку. Чаму мы павінны святкаваць сваё свята 5 мая? Якое дачыненне мае гэтая дата да Беларусі?

Дык які ж дзень нам выбраць? Адказ тут можа быць толькі адназначны — 6 жніўня. У гэты дзень у Празе Францішак Скарына выдаў першую беларускую Біблію. І гісторыю беларускага друку мы пачнём тады адлічваць з XVI стагоддзя, а не з XX. Тады з пачуццём годнасці я змагу павіншаваць з прафесійным святам выкладчыкаў, аднакурснікаў, знаёмых журналістаў, павіншуюць мяне знаёмыя і родныя, пісьменнікі змогуць шчыра віншаваць усіх тых, хто працаваў над выданнем іхніх кніг, ды і калегі з-за мяжы будуць віншаваць беларускіх журналістаў і выдаўцоў, дакладна ведаючы, што гэта НАША свята.

С. СЯНКЕВІЧ,
студэнт журфака БДУ.

РЭПЛІКА ЧЫТАЧА

ДЗІЎНЫЯ АРГУМЕНТЫ

У 42-м нумары тыднёвіка «7 дней» была змешчана публікацыя пад загалоўкам «Сколько языков нужно для гласности?» за подпісам «Семидневец». Аўтар разважае над станам беларускамоўнай перыёдыкі, які склаўся ў выніку павышэння цэн на газеты і часопісы.

«Семидневец» папракае тых, хто выступае за пераход некаторых рускамоўных газет, у тым ліку і тыднёвіка «7 дней», на беларускую мову. Яны, маўляў, забываюць пра тое, што 22 працэнты насельніцтва рэспублікі — небеларусы. Ні на якой іншай мове, акрамя рускай, атрымаць інфармацыю яны не могуць. А права ж на яе атрыманне яны маюць. Так, бясспрэчна, яны маюць на гэта права. І не толькі маюць, але і шчодра ім карыстаюцца, бо ў іх распараджэнні ажно сем рэспубліканскіх рускамоўных газет, што складае 58,3 працэнта ўсіх рэспубліканскіх газет, так што гаварыць аб «бяспраўі» небеларусаў у нашай рэспубліцы проста смешна і недарэчна. Чамусьці «Семидневец» не сказаў, што карэннае насельніцтва нашай рэспублікі, беларусы, якія складаюць 78 працэнтаў насельніцтва, атрымліваюць сёння ўсяго 5 беларускамоўных рэспубліканскіх газет. Нішто сабе нацыянальны суверэнітэт рэспублікі!

«Семидневец» сцвярджае, «...что многие из тех, кто наиболее часто ссылается на принятый белорусским парламентом Закон о языках, сам закон не читали или не дочитали». На яго думку, «не читал его... и автор публикации «Пра два языкі ў роце», напечатанной в еженедельнике «Літаратура і мастацтва» за полуанонимной (?) подписью «Лімавец». А што ж сам «Семидневец»?

Дасталося ад яго аўтару ліста ў «ЛіМ» П. Бічу: «Похоже, и в руках не держал Закон о языках автор... лимовской публикации кандидат технических наук П. Бич». Не этычна гэта, шаноўны «Семидневец»! Так і ўспамінаецца пушкінскае: «Мы почитаем всех нулями, а единицами себя».

Даказваючы, што «...языком официальных средств массовой информации могут быть также русский язык и языки других национальностей», «Семидневец» спасылаецца на... Японію. «Насколько нам известно, в правовой Японии никому в голову не приходит закрыть издаваемую на английском языке «Джапан таймс». Але ж, шаноўны «Семидневец», трэба было сказаць і пра тое, што ў прававой Японіі не 58,3 працэнта газет выдаюцца на англійскай мове, што ў японскім парламенце дэпутаты выступаюць не па-англійску, а па-японску, ды і гутараць яны са сваімі выбаршчыкамі на роднай мове, чаго не скажаш пра многіх дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР.

«Семидневец» выхваляецца сваёй незалежнасцю: «Мы, например, свой еженедельник официальным не считаем». Але тут жа супярэчыць сам сабе, бо: «...ее учредителем является правительственное телеграфное агентство». Значыць, заснавальнік «7 дней» — не якаянебудзь прыватная асоба, а дзяржаўная ўстанова, якая непасрэдна падпарадкоўваецца рэспубліканскаму ўраду. А ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі ў дзевятым артыкуле запісана: «Беларуская ССР забяспечвае функцыянаванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, захаванне нацыянальных традыцый і гістарычнай сімволікі». Урад рэспублікі, яні, безумоўна, з'яўляецца адным з дзяржаўных інстытутаў, павінен забяспечваць рэальнае функцыянаванне беларускай мовы. Праўда, у тым жа артыкуле запісана, што Беларуская ССР дае магчымасць іншым нацыянальным супольнасцям ствараць свае ўласныя сродкі інфармацыі. Але ж хіба гэта дае падставы тыднёвіку «7 дней» перайсці цалкам на рускую мову?

Дзіўна чуць са старонак гэтага тыднёвіка намёк на нейкія міфічныя сілы, якія быццам бы імкнуцца начапіць біркі тым, «...кто не соглашается стать объектом насилия (г. зн. не згаджаецца на адраджэнне беларускай мовы. — В. С.), объявить их врагами родного языка, ибо язык, не раз сказано, — душа народа». Нешта я не чуў такіх выказванняў з вуснаў свядомых беларусаў, якія шануюць іншыя мовы, нацыянальныя звычаі іншых народаў, іх культуру. А вось фразу: «Я ненавижу ету беларускую мову» чуў не раз.

Дасталося ад «Семидневца» і неназваным дэпутатам: «Уже гуляет по парламентским коридорам утверждение, что должностные лица умышленно

выкіды ідуць на горад. Калі людзі выязджаюць на выхадныя ва «ўмоўна чыстую зону», яны яшчэ некалькі гадзін пакутуюць ад галаўнога болю. Мы падыходзім да той рысы, калі Наваполацк . можа стаць «паўночным Чарнобылем». Прычым не толькі для Беларусі, але для ўсяго рэгіёну Балтыі.

— Генадзь Фёдаравіч, ходзяць чуткі, што вайскоўцы маюць нейкае дачыненне да катастрофы?

— Чуткі гэтыя не маюць падстаў.

— Чаму мы даведваемся пра гэтую катастрофу з цэнтральнага друку, ад радыёгаласоў, а нашы беларускія сродкі масавай інфармацыі спачатку маўчалі?

— Есць яшчэ ў нас «аматары» схаваць ад грамадскасці негатыўную інфармацыю, хоць, як кажуць, шыла ў мяшку не ўтоіш. Грэшна казаць, але мо гэтая катастрофа прымусіць урад (і рэспубліканскі, і цэнтральны) звярнуць зараз больш пільную ўвагу на патрэбы навапалачан.

— Што вы наогул можаце сказаць аб наступствах уплыву хімічных выкідаў на арганізм чалавека?..

— Каля 70 працэнтаў абследаванага насельніцтва маюць адхіленні ў формуле крыві. Дарэчы, для нас гэта не было нечаканасцю. Зараз у Наваполацку выкідваецца да 150 інгрыдыентаў шкодных хімічных рэчываў. А кантралюем мы толькі 12! У нас дагэтуль няма перасоўнай экалагічнай лабараторыі для замераў шкодных выкідаў на месцах. Справа ў тым, што выкіды такіх рэчываў, як сінільная кіслата, ацэтонцыянгідрын, вінілхларыд, выкіды сярністай вытворчасці практычна нельга ўбачыць вокам. Не ўсё мае пах і колер. Наваполацк, відаць, адзіны горад у Савецкім Саюзе, дзе ў паветра выкідваецца такі букет атрутных рэчываў. У адным з апошніх нумароў нашай гарадской газеты «Химик» была змешчана інфармацыя аб тым, што на скрыжаванні вуліц Дружбы і Маладзёжнай сутачнае ўтрыманне ў паветры прымесяў аміяку ў 13,5 раза вышэй за норму. Гэта толькі аміяк. А што па астатніх выкідах? А што ў сумацыі? Такая інфармацыя не ўлічваецца і не сумуецца.

Гэтая катастрофа, магчыма, — апошні званок, апошні напамінак аб тым, што трэба прымаць самыя тэрміновыя меры па папярэджанні аварый на наваполацкіх прадпрыемствах. Мы жывём побач з мінамі запаволенага дзеяння. Адна ўжо выбухнула. Што чакае нас далей?

Гутарыў Л. СВІРЫДАЎ.

противятся возрождению родного языка». Але ж такога ніхто не скажа, напрыклад, пра былога партыйнага функцыянера, народнага дэпутата, а цяпер міністра замежных спраў Пятра Краўчанку. Ну, а тыя, хто толькі гуляе ў «адраджэнне», а сваімі практычнымі справамі тармозіць гэты рух, хай глянуць праўдзе ў вочы. Як вядома, самы дзейсны спосаб агітацыі — гэта асабісты прыклад. Ну, а як назваць таго дэпутата, які галасаваў за Закон аб мовах, абяцаў сваім выбаршчыкам, што будзе змагацца за адраджэнне роднай мовы, а ў парламенце выступае па-руску, хоць закон ужо ўступіў у сілу?

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў публікацыі «Семидневца» ёсць і слушныя думкі — наконт закона аб друку, аб залежнасці журналістаў і націску на іх з розных бакоў, аб цяжкім стане, у якім аказалася беларускамоўная прэса. Чытаючы гэтыя радкі, міжволі думаецца: няўжо гэта пісаў адзін і той жа аўтар? І ўсё ж канцоўка публікацыі развейвае сумненні: «Семидневец» застаецца верны сваім пастулатам. «А если ставить вопрос так, что печататься надо только на родном языке, то можно остаться вообще без газет и журналов: и белорусских и русских». Але ж, шаноўны «Семидневец», ніхто не ставіць пытанне, каб усё без выключэння друкавалася толькі на беларускай мове. Гэта было б проста абсурдна. Толькі ці ж не беларускамоўны друк павінен быць прыярытэтным у рэспубліцы. Гэта і будзе спрыяць нацыянальнаму адраджэнню, пашырэнню нацыянальнай свядомасці сярод беларусаў.

В. СОКАЛ.

в. Зубялевічы,
Ляхавіцкі р-н.

КПБ: туга па «маналітным адзінстве»?

БЮРО КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ выступіла са спецыяльнай заявай, у якой дадзена палітычная ацэнка падзеям, якія адбыліся ў Мінску 7-га лістапада г. г. Карыстаючыся сваім неад'емным правам «чалавека і грамадзяніна», хацеў бы, у сваю чаргу, даць палітычную ацэнку гэтай заяве.

У ёй гаворыцца: «Вернасць ідэалам Кастрычніка, сацыялістычнаму выбару былі пераканаўча прадэманстраваны на мітынгах, шэсцях, маніфестацыях, урачыстых сходах, што адбыліся ў гарадах, пасёлках, працоўных калектывах». Аднак, як абвяшчае далей заява, «радасць галоўнага дзяржаўнага свята краіны была азмрочана імкненнем пэўных сіл стварыць у рэспубліцы атмасферу нецярпімасці, канфрантацыі і сацыяльнай напружанасці». Пад гэтымі «пэўнымі сіламі» Бюро ЦК КПБ разумее «альтэрнатыўныя мітынгі і дэманстрацыі, арганізаваныя апазіцыйнымі КПСС сіламі», перш за ўсё БНФ.

І так, дэмаркацыйная лінія, якая падзяляе чыстых і нячыстых, праведзена з ювелірнай дакладнасцю. Усе, хто дэманструе «вернасць ідэалам Кастрычніка» і КПСС, з імем якой звязаны «Вялікі Кастрычнік», адносяцца да катэгорыі «працоўных рэспублікі». Тыя ж, хто сумняваецца ў гэтых ідэалах і стаіць у апазіцыі да КПСС, залічваюцца да ведамства «дэмагогаў і зламысных ілгуноў, дэзінфарматараў і паклёпнікаў». Такі вось «палітычны плюралізм».

Што ж, кожны мае права мець уласны палітычны аршын. Аднаго толькі я ніяк не магу зразумець: у чым Бюро ЦК КПБ бачыць пераканаўчасць дэманстрацый на карысць «ідэалаў Кастрычніка» і, наадварот, непераканаўчасць дэманстрацый тых, хто не адчувае роўна ніякай радасці з нагоды «сацыялістычнага выбару»? Дзе крытэрый? Можа, такім крытэрыем для членаў ЦК КПБ служыць колькасны склад дэманстрантаў? Не ведаю, у Мінску ў той дзень не быў, падлікаў не праводзіў. Ды і каму патрэбна зараз гэтая гульня ў лічбы? Даўно час зразумець, што, акрамя палітычнай арыфметыкі, існуе яшчэ палітычная алгебра, якая дае больш дакладнае адлюстраванне палітычнай рэальнасці.

«Ніхто не мае права, — гаворыцца ў заяве, — перакрэсліць нашу гісторыю, працоўныя намаганні і маральную стойкасць народа, які здолеў ажыццявіць першую ў свеце сацыялістычную рэвалюцыю, прайсці праз суровыя выпрабаванні і выстаяць».

Перакрэсліваць ці не перакрэсліваць гісторыю — гэта пытанне не права, а аб'ектыўнай магчымасці. Гісторыю ні перакрэсліць, ні перапісаць набела нельга. І, значыць, гаворка можа ісці ў дадзеным выпадку толькі пра тое, як ацаніць яе, гэтую гісторыю. Бюро ЦК КПБ дэманструе ў сваёй заяве «вернасць ідэалам Кастрычніка, сацыялістычнаму выбару» і заклікае камуністаў «згуртавацца ў гэты адказны час, даць рашучы адпор правакатарам, абараніць заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі». У імя абвешчанага намі палітычнага плюралізму ніхто не можа забараніць КПБ і яе ЦК мець такі погляд на кастрычніцкі пераварот 1917 года і на тыя «заваёвы», якія за ім адбыліся. Ніхто не можа забараніць ёй звярнуцца да сваіх членаў з заклікам абараніць і свой «выбар», і свае «заваёвы». Але чаму ў імя таго ж палітычнага плюралізму Бюро ЦК КПБ пазбаўляе права іншых мець свой пункт гледжання і на «Вялікі Кастрычнік», і на яго «заваёвы»? Дзіўны нейкі плюралізм атрымліваецца ў членаў Бюро ЦК КПБ. Відаць, тут зноў спрацоўвае логіка «сацыялістычнага плюралізму» як плюралізму «для большасці». Так, плюралізм у перакладзе з латыні азначае множнасць. Але адсюль яшчэ зусім не вынікае, што чым больш глотак крычыць «Няхай жыве Вялікі Кастрычнік!», тым больш плюралізму.

Як жа Бюро ЦК КПБ мае намер адстойваць сваё разуменне нашай гісторыі? «Абавязак камуністаў, якія працуюць у дзяржаўных структурах і праваахоўных органах, —строга стаяць на варце законнасці і парадку, захавання Канстытуцый СССР і БССР», — чытаем мы ў заяве. Узнікае пытанне: чаму Бюро ЦК КПБ апелюе толькі да камуністаў, якія «працуюць у дзяржаўных структурах і праваахоўных органах»? Ці ж гэта не з'яўляецца канстытуцыйным абавязкам любога работніка дзяржавы і яго інстытутаў? Калі адкінуць рыторыку наконт захавання Канстытуцыі СССР і БССР, сутнасць звядзецца да вельмі простага: ёсць улада КПСС, якую яна мае намер, як і раней, сцвярджаць з дапамогай пазадзяржаўных форм свайго ўладарання — партыйных арганізацый у праваахоўных органах, судзе, пракуратуры і г. д. Хто ж з'яўляецца сапраўдным парушальнікам законнасці і правапарадку?

І апошняе. «Сваімі дзеяннямі, — гаворыцца ў заяве, — лідэры БНФ яшчэ раз пацвердзілі, што іх сапраўдная мэта — барацьба за ўладу і ліквідацыя сацыялістычнага ладу. Усе іх ранейшыя разважанні аб дэмакратыі, дасягненні грамадзянскай згоды аказаліся цынічнай хлуснёю».

Што гэта — палітычная наіўнасць альбо разлік на палітычную наіўнасць другіх? Ці не блытаюць члены Бюро ЦК КПБ палітычныя партыі і рухі з таварыствамі сабакаводаў і філатэлістаў? Ды каму ж невядома, што палітычныя партыі і ствараюцца як зброя барацьбы за ўладу? Пытанне заключаецца толькі ў тым, якія сродкі яны выкарыстоўваюць у барацьбе за ўладу — канстытуцыйныя, як гэта робяць усе сапраўды дэмакратычныя, парламенцкія партыі, ці антыканстытуцыйныя, да якіх звярнулася КПСС у 1917 годзе і якія яна культывавала апошнія тры чвэрці стагоддзя?

Мітынг, ініцыятарам якога быў БНФ (і не толькі ён), быў санкцыяніраваны, як гэта вынікае з заявы, Мінскім гарвыканкомам, г. зн. органам дзяржаўнай улады. У чым жа бачыць Бюро ЦК КПБ парушэнне закона? «Была зроблена, — гаворыць заява, — чарговая атака на Кастрычнік і сацыялізм, на У. І. Леніна». Ну і што з гэтага вынікае? У чым тут крамола? Спадзяюся, атака была прадпрынята без выкарыстання хімічнай, бактэрыялагічнай і іншых форм зброі? На якой падставе Бюро ЦК КПБ лічыць канстытуцыйным і дзяржаўным толькі тое, што адпавядае яе ідэалогіі і палітычнай праграме? Ці не час, нарэшце, прывыкнуць, што адмаўленне ад ідэалагічнай і палітычнай манаполіі — гэта «ўсур'ёз і надоўга».

Так, нам як ніколі патрэбна сёння грамадзянская згода. Такая згода магчыма пры адной ўмове: павазе да палітычнага апанента, прызнанні яго роўнасці, уменні не толькі гаварыць (тым больш крычаць і стукаць кулаком па стале), але і слухаць. Разумення гэтага я якраз і не знайшоў у заяве Бюро ЦК КПБ. Палітычнае кіраўніцтва КПСС (і КПБ) пераканана, што ў яе на руках усе козыры. Гэта яе права. Не трэба было б толькі забывацца на лёс пушкінскага Герма́на. Бо можа здарыцца, што трэцяй картай КПСС акажацца не туз, а піковая дама.

Валянцін АКУЛАЎ.

P. S. Напісанае зусім не азначае, што я апраўдваю дзікунскую сцэну, якая адбылася каля помніка Леніну. Да Леніна можна ставіцца па-рознаму. Можна лічыць «правадыром працоўных», можна лічыць бацькам бальшавіцкага генацыду. Але ў кожным выпадку трэба заставацца цывілізаванымі людзьмі.

В. А.

ДЗЕСЯТКІ ГАДОЎ наша грамадства пазбаўлялі традыцыйнай маралі, вынішчалася рэлігія, нішчыліся набыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры. Замест іх у душы людзей з дзяцінства закладваліся прынцыпы маралі камуністычнай, якіх абавязаны былі трымацца мільёны «простых» грамадзян і якія былі лішнімі для парт-дзяржнаменклатуры. Дзесяцігоддзямі праводзіўся прынцып «забароны на прафесію», калі нечлены камуністычнай партыі не маглі перасягнуць у сваёй кар'еры пэўнай мяжы. Здаецца ўсе зразумелі, што так далей рухацца нельга. Дзеля выжывання грамадства павінны адбыцца кардынальныя перамены. Але гэтага, падобна, не жадаюць разумець кіраўнікі камуністычнай партыі. Калі і гаворыцца імі пра перамены, то звычайна ў рамках ранейшых ідэалагічных канцэпцый. Па-ранейшаму жывая канцэпцыя класавай барацьбы. Па-ранейшаму не здадзена ў музейныя запаснікі тэорыя дыктатуры класа. Гаворачы пра кансалідацыю грамадства, лідэры кампартыі па-ранейшаму не ідуць на адкрыты дыялог са сваімі апанентамі, па-ранейшаму імкнуцца да захавання манаполіі літаральна ва ўсіх сферах жыцця.

Падзеі 7 лістапада ў Мінску сталі лагічным вынікам 73-гадовай гісторыі дзяржавы. Яшчэ не было ніколі, каб з пустазелля вырастала што-небудзь вартае. Гэтак і ў грамадска-палітычным жыцці не можа ў адначассе ўзнікнуць адназначна здаровы рух да пераменаў. Камуністычная партыя, сама не жадаючы саступіць ні кроку з аднойчы абранага, як паказала гісторыя не толькі нашай краіны, заганнага шляху, патрабуе крокаў насустрач ад іншых арганізацый. Яскравым прыкладам нежадання і няўмення рабіць крокі да пераменаў можа стаць сённяшняя сітуацыя ў эканоміцы, на спажывецкім рынку, у сацыяльнай сферы. Па-ранейшаму пасады займаюць кіраўнікі-камуністы. Па-ранейшаму ў складзе як Вярхоўнага Савета БССР, так і большасці мясцовых Саветаў пераважаюць дэпутаты-камуністы. А што мяняецца? Больш таго, са старонак перыядычных выданняў, якія знаходзяцца пераважна ў руках кампартыі, ідзе непрыхаваная антысавецкая прапаганда. Мала якое пасяджэнне гаркомаў ці абкомаў абыходзіцца без крытыкі ў адрас Саветаў за развал той або іншай сферы жыцця. Толькі гэта не больш, як прапагандысцкі прыём. Наўрад ці цяперашнія Саветы за паўгода сваёй дзейнасці да такой ступені маглі разваліць тое, што метадычна развальвалася ўсе гады манапольнага праўлення камуністычнай партыі. Прычыны тых крытычных выступленняў у адрас Саветаў, верагодней, у настальгіі па колішняй непадзельнай, манапольнай уладзе.

Шэсце і мітынг 7 лістапада, як і дзяжурства сяброў Рабочага саюза Беларусі каля будынка Мінгарсавета 15 лістапада друк назваў антыкамуністычнымі. Дарэчы, надзвычай дзіўна гучаць словы заявы ЦК КПБ, што шэсце і мітынг, апроч іх антыкамуністычнай накіраванасці, мелі і антыдзяржаўны характар. Хіба што кампартыя нейкім асаблівым чынам трактуе вядомы лозунг «Дзяржава — гэта мы!» Гэта былі выступленні супраць таталітарнай формы праўлення камуністычнай партыі. Удзельнікі абодвух акцый выступалі і супраць манапольнага становішча КПСС у нашай дзяржаве. Сёння, калі многія з нас прызнаюць неабходнасць будаваць узаемадачыненні ў грамадстве на аснове агульначалавечай маралі, без увагі на розныя «ізмы», — антыманапольныя, антыкамуністычныя лозунгі менавіта такога плана маюць поўнае права на існаванне.

Чаму ж тады так усхадзіліся прадстаўнікі камуністычных арганізацый рознага рангу? Думаецца, прычына не толькі ў факце «зневажання» помніка Леніну. Факт гэты ўсё ж нельга вырываць з цэлага кантэксту падзей і разглядаць адарваным ад астатніх надзвычай важных фактаў нашага жыцця.

Дзень за днём набліжаюць кампартыю Беларусі да яе чарговага з'езда. Выказваюцца меркаванні, што гэта будзе апошні з'езд камуністаў на Беларусі. Наўрад ці, бо КПБ выяўляе сябе дастаткова жыццяздольнай арганізацыяй. Іншая справа, што нельга адназначна запрагназіраваць ход беларускага камуністычнага форуму. Паўмесяца таму назад пра сваё ўтварэнне заявіла Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі. Разварушваюцца сябры Беларускай нацыянальна-дэмакратычнай партыі. Чуваць ужо і пра сацыял-дэмакратаў. Не зусім падуладны кіраўніцтву КПБ і рабочы рух. Людзі, нераўнадушныя да сённяшніх працэсаў у грамадстве, сабраліся ў Грамадзянскай радзе Беларусі. Ні адна з гэтых арганізацый не выказвае жадання ўсталёўваць цесныя кантакты з КПБ, а некаторыя выступілі з рэзкай яе крытыкай. У самой кампартыі выявіліся тэндэнцыі, далёкія ад колішняга «маналітнага адзінства». Як жа можна з'яднаць шэрагі камуністаў на Беларусі? Найбольш дзейсным і простым спосабам можа стаць згуртаванне іх супраць «агульнага ворага». Такім даўнім ворагам для кіраўніцтва КПБ з'яўляецца БНФ. Іншая справа, што не знаходзілася да пэўнага часу дастаткова важкіх падстаў, каб адкрыта заявіць пра гэта. А тут і прычына наспела, і падставы знайшліся...

Ігар ЧАРНЯЎСКІ,
старшыня пастаяннай камісіі Мінсавета па культуры, ахове і адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны.

Сяргей ГРАХОЎСКІ

З іслацкіх сцежак

Цярпенне

Прайдзі цярпліва з нараджэння
Да скону свой цярністы шлях,
Бо ўсё жыццё — адно цярпенне —
Утопія, хлусня і страх.

Мы ж нараджаемся для шчасця,
А шчасце абмінае нас,
Затое беды і напасці
Наканаваў трывожны час.

Нам, нашым дзецям і унукам,
Адвучаным любіць і пець,
І прапагандаю, і друкам
Прывучаным заўжды цярпець.

Хоць зніклі д'яблавы іконы,
Яшчэ плыве пякельны чад,
І мы з трывогаю да скону
Глядзім наперад і назад.

Пятнаццаць рублёў

Пятнаццаць рублёў на труну
Бяры і бярыся за справу,
Жабрацтва цярпі і ману,
Хвалі і ўмацоўвай дзяржаву.

Хай косці свіцяцца і кроў
У жылах булькоча, як пена,
Хваліся, што жыў і здароў
І акумулірыў рэнтгены.

Пакутнік — падвопытны люд,
Як снег на прадвесні, знікае,
За гэта ўсяпышні прысуд
Даўно вінаватых чакае.

За мукі такую цану
Дзяржава дае нескупая,
Ды толькі бяда, — на труну
Пятнаццаць рублёў не хапае.

Чароўныя дамы

Лэдзі, дамы і сіньёры,
Не ў купальніках на моры,
А ў аранжавых жылетах
Загараюць у кюветах,
У каляных целагрэйках
П'юць кефір на ржавых рэйках
І у шпалы да зямлі
Заганяюць кастылі.
Ад Находкі і да Брэста
І бабулі, і нявесты
У робах і ў гумовых ботах
На адказнейшых работах
З ломам, тачкаю, кайлом
Завіхаюцца на злом.

Дома вымыюць пялёнкі,
Ноччу абавязкі жонкі
З нашым часам ва ўнісон
Ледзь выконваюць праз сон.
Лэдзі, дамачкі, — жанчыны,
Ці не раннія маршчыны
Шчокі вам размалявалі,
Каб нідзе не забывалі
Кожны дзень рабіць да поту
Ганаровую работу.
А за гэта да жылетаў
Вам прышпіляць медалі,
Што шчаслівы Край Саветаў
Так высока вы ўзнялі.

●

Запахла тапалёвым тленам,
І сівер шастае ў трысці,
А я дасюль не знаю, дзе нам
Прытулак і спакой знайсці.

Усё няпэўна, не трывала,
Нідзе прыстанішча няма,
Ужо і рэкі закавала
Дзесь недалёкая зіма.

Дарога быццам і прамая,
Заводзіць зноў у тупікі,
І мы прыстанішча не маем, —
Адвечныя вандраўнікі.

Вечарэе

Захадам сонца падпалена неба,
Паружавелі снягі.
Дзякаваць Богу, што болей не трэба
Даўнія сплочваць даўгі.

Чорнае голле напомніла краты,
Цені плывуць уваччу,
Воран пракаркаў: «Не вінаваты».
Але ніхто не пачуў.

Уезджаны зімнік рыпіць пад нагамі,
Ціха і пуста ў палях,
Недзе высока дыміцца над намі
Крыжам адзначаны шлях.

Пройдзена шмат, а звароту не будзе.
Толькі б яшчэ развітацца паспець.
Сходзяць у вечнасць змарнелыя людзі,
Новыя прыйдуць цярпець.

Захад датлеў. Вечарэе. Венера
На небасхіле ад сцюжы дрыжыць
І акрылялі жаданне і вера, —
Толькі б яшчэ да світання дажыць.

Дарагія абаронцы

Ніхто мне не адказвае на стук,
Ніяк у кабінеты не прарвацца,
Таму звяртаюся праз друк
І толькі пра адно хачу спытацца,

Чаму вас не відно ў чарзе,
Шаноўныя кіраўнікі і слугі!
А вось калека на адной назе
На сцюжы скача бугі-вугі,

Каб выстаяць свінога капыта
Ці пляшку паталоннага кагору,
Бо так усіх прыціснула бяда,
Што непітушчы вып'е з гора.

Для нашых слуг звычайныя харчы —
Вяндлінку, балычок і апельсіны
На базу цягнуць цегачы,
Дадому — «спецыяльныя машыны».

Там — смаката сабе і жонцы,
І родзічы ўсё пакаштуюць...
Ох, дарагія абаронцы
Нам вельмі дорага каштуюць.

Іх «Волгі» учарнелыя імчаць,
Бо сіла ўся ў чыноўнай масе,
Каб зноў з трыбуны пракрычаць
Пра клопат аб рабочым класе.

Калі цярпенне лопне, дзівакі,
Што семдзесят гадоў маўчалі здуру,
Зацісну́ўшы да хрусту кулакі,
Успомняць пра наменклатуру.

Балючае

Спустошана зямля,
Атручаныя рэкі,
Бо столькі год здаля
Кіруюць недарэкі,

Хапуга, то бандыт
У ліпкіх мяккіх ботах
Наш усталёўваў быт
На катаржных работах.

Філосаф і паэт,
Вучоны і араты
Ступалі след у след
Пад кулі і за краты.

А ў света навіду
Крычалі дэмагогі,
Што ў камунізм вядуць
Шырокія дарогі.

Мы ж заграбалі жар
Уласнымі рукамі,
Цягнулі ўвесь цяжар,
А сталі жабракамі.

Дагэтуль з розных сфер
Мы часам церпім здзекі,
Бо правяць і цяпер
Упартыя няўмекі.

Прадчуванне

Буслы паскідалі яечкі з гнязда:
Трывожацца людзі—чакае бяда.

Галодная доўгая прыйдзе зіма,
А хлеба і к хлебу у многіх няма.

Лугі і разоры дажджы залілі,
Прыбілі калоссе да самай зямлі,

А недзе адгэтуль далёка-далёка
Пякла і смаліла пякельная спёка.

На Волзе, на Доне, Дняпры і Кубані
Ішло з ураджаем штодзённа змаганне.

Дзе ж той гаспадар і руплівы, і дбайны,
У якога заглухлі душа і камбайны!

Чаму ён нічога паправіць не можа,
Калі па асфальце пасеяна збожжа!

Скажыце, што з намі зрабілася, людзі!
Адказу няма і, напэўна, не будзе.

Мы ж некалі шчодра кармілі паўсвета,
А сёння нікому не верыцца ў гэта.

Ад страху буслы выкідаюць яечкі,
А мы на хаўтурах запальваем свечкі.

На праект «Закона аб падатках»

Мінфін зрабіўся рэкецірам,
Накінуўшы на ўсіх пятлю:
З шасці рублёў дзярэ чатыры,
З рубля з палцінай — па рублю.

Каб толькі пракарміць араву
Чаляднікаў і махляроў,
Сілком адваяваўшых права,
Смактаць з жывых і з мёртвых кроў.

Краіна жабракоў разутых
І перакормленых хапуг
Прывучана цярпець пакуты
І ледзьве пераводзіць дух.

А чынадрал, на грошы падкі,
Паціху шэпча: «Пры-ы-ду-шу!»
І ўвёў разбойныя падаткі
На розум, сэрца і душу.

Вярхамі страчана пашана
Да творцаў і да чытачоў.
Хай піша оперы Нішанаў,
Раманы — Паўлаў і Лук'янаў,
Раскажа казкі Маслюкоў.

Карткі

Няма ні парадку, ні згоды, ні ладу:
Мы самі сабе абвясцілі блакаду.
Напэўна, крумкач ачмурэлы накаркаў:
«На карткі, на карткі, на карткі, на карткі!»
Па картках жыву з грамадзянскай вайны,
І толькі без картак хапала маны
Пра светлае заўтра, пра шчаснае сёння,
І карткі з маною прыходзяць на сконе.
Мыла па картках, тытунь і алей,
Не выстарчыць хлеба, — галодны калей,
Паркалю няма на пялёнкі ні метра,
І дзіўна, што картак няма на паветра.
Калі б міністэрства было Атмасферы,
Яе б размяркоўвалі функцыянеры.
Чаго ж мы чакаем? На што спадзяемся?
То плачам, то самі з сябе пасмяемся,
Бо сцюжай і голадам нас гартавалі,
А мы невядома каго ратавалі.
Мы часам ад болю дарэмна лютуем.
МЫ Ж ЛЮДЗІ, МЫ САМІ СЯБЕ УРАТУЕМ
На радасць нашчадкам, зладзеям назло.
Дай, Божа, каб толькі крыві не было.

Некралог

Перад смерцю роўныя мы ўсе,
І адна апошняя дарога,
Але зацвярджаць парторг нясе
У ЦК старонку некралога.

Там найбольш дасведчаных галоў,
Здатных на разумную параду.
Калі сам падпіша Сакалоў,
Адпяюць па першаму разраду.

НОВЫЯ ВЫДАННІ

«ДЗЕЦІ І МЫ»

Сярод новых перыядычных выданняў, якія пачнуць выходзіць у Беларусі з наступнага года, — і газета Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя У. І. Леніна «Дзеці і мы». З ёю асобныя чытачы ўжо знаёмы. Выйшлі тры так званыя пробныя нумары, выпушчаны з дабрачыннымі мэтамі. З наступнага года гэта будзе штомесячнік аб'ёмам восем лімаўскіх палос.

Пра тое, якія мэты ставіць перад сабой новае выданне, якія матэрыялы зоймуць у ім галоўнае месца, нашаму карэспандэнту расказвае рэдактар газеты «Дзеці і мы» Уладзімір ЯГОЎДЗІК.

— Мы доўгія гады, не надта задумваючыся над сэнсам, сцвярджалі, што дзеці — самы прывілеяваны клас у савецкім грамадстве. Гучала ўсё гэта прыгожа, ледзь не афарыстычна, ды, на жаль, не адпавядала рэальнаму жыццю з яго сапраўднымі праблемамі. Дагаварыліся мы да таго, што цяпер дзяцей неабходна ратаваць. Ад чарнобыльскай радыяцыі, якая ў першую чаргу стала бядой для неакрэплых дзіцячых душ... Ад бацькоў-алкаголікаў, што кідаюць сваіх хлопчыкаў і дзяўчынак на волю лёсу... Ад жорсткасці адміністратараў дзіцячых дамоў, якія не надта задумваюцца, кім вырастуць іх выхаванцы... Ад гора-педагогаў ў школе... Ад той пастаяннай жорсткасці, што дае сёння знаць аб сабе ледзь не на кожным кроку...

Газета «Дзеці і мы» і скіравана, можна сказаць, на абарону маленства. Заснавальнік яе — Беларускае аддзяленне дзіцячага фонду, але гэта не значыць, што мы ізалюемся ў сваіх уласных праблемах. Гатовы падтрымліваць сувязі — самыя цесныя — прытым з усімі ўстановамі, арганізацыямі, фондамі, якіх гэтаксама турбуе будучыня дзяцей, а, значыць, лёс самога грамадства. Разам з тым хачу адразу сказаць, што на дзіцячых праблемах мы не збіраемся рабіць нейкую палітыку. Газета павінна стаць свайго роду кансалідуючым звяном для ўсіх (незалежна да якой партыі ён належыць, якой веры прытрымліваецца), хто занепакоены тым, каб з дзіцячага тварыка не ўпала ніводная слязінка.

Абараніць трэба ўсіх дзяцей, а не толькі тых, хто пакрыўджаны лёсам. Таму хочацца, каб газета прыйшла ў кожную сям'ю, школу, дзіцячы садок. Каб ёй зацікавіліся бацькі, дзядулі і бабулі, выхавацелі і настаўнікі. Нарэшце, каб яе з задавальненнем узялі ў рукі і самі дзеці.

Апошняе магчыма ў тым выпадку, калі ў газеце будуць самыя разнастайныя матэрыялы. Мяркуем, што пастаяннай стане старонка «Буслянка». «Буслянка» — гэта ўваходзіны ў свет народных паданняў, гульняў, песень, танцаў.

Думаю, прыйдзецца даспадобы і рубрыка «Добры чалавек». У ёй раскажам пра людзей, якія па-сапраўднаму любяць дзяцей. Паўтараю, жорсткасці ў грамадстве вельмі шмат, але ж нямала і дабра, шчырасці, шчодрасці, той душэўнасці, якая спакон вякоў была характэрна для нашага народа. Вось толькі адзін прыклад. Ёсць жанчына, інвалід, якая штомесячна на рахунак дзіцячага фонду высылае адзін працэнт ад сваёй мізэрнай пенсіі. Капейкі? Няхай! Гэтыя капейкі, даражэй за рублі, бо за імі — канкрэтны чалавек, якому баліць за дзяцей.

Рэгулярна будзем запрашаць на старонкі газеты людзей самых розных прафесій, у тым ліку і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, цікавых субяседнікаў, якім ёсць пра што пагаварыць з хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Іх выступленні стануць своеасаблівымі ўрокамі духоўнасці, нацыянальнага выхавання. Мы ж павінны пазбаўляцца праяў ганебнага нацыянальнага нігілізму, які і сёння не дае беларусам магчымасці «людзьмі звацца».

Тэма тэм — Чарнобыль. Традыцыйную рубрыку «Дзеці Чарнобыля», якая не знікае са старонак самых розных выданняў, хочам падаваць крыху ў іншым плане — «Чарнобыль і дзеці». Дзеці Чарнобыля — гэта той знак бяды, які пастаянна дае аб сабе знаць і ад якога нідзе не дзенешся, нікуды не схаваешся. Чарнобыль і дзеці—аспект праблем куды шырэйшы. Гэта ўжо гаворка не толькі пра маленькіх пакутнікаў, што знаходзяцца ў забруджаных раёнах, а і пра лёс дзяцей усёй Беларусі. Бо ўсе мы — заложнікі Чарнобыля. Бо ўся Беларусь — зона вялікай бяды, і найперш ратаваць ад яе трэба дзяцей.

Спадзяёмся і на сустрэчы з замежнымі гасцямі, якія прыязджаюць у рэспубліку па лініі дзіцячага фонду. Інтэрв'ю з імі, іншыя матэрыялы — магчымасць глянуць на свае праблемы як бы стороннімі вачыма, збоку, а, значыць, часам убачыць і тое, што самім незаўсёды бачна.

Прадчуваю пытанне асобных лімаўскіх чытачоў: маўляў, ёсць ужо нямала саюзных і рэспубліканскіх выданняў, якія займаюцца дзіцячымі праблемамі, праблемамі выхавання юнага пакалення, — дык ці патрэбна яшчэ адно? Скажу на гэта так: ні «Семье» ні той жа «Настаўніцкай газеце» мы не думаем перабягаць дарогу. А мы пастараемся, каб наша газета не паўтарыла іншыя выданні.

На заканчэнне дадам, што будзем змяшчаць і мастацкія творы — вершы, апавяданні пра дзяцей і для дзяцей. Плошчы малавата? Мяркуем, што з цягам часу газета будзе выходзіць раз у два тыдні. Мо і аб'ём пабольшае.

На газету «Дзеці і мы» на наступны год пакуль што не позна падпісацца. Індэкс яе — 74876. Цана падпіскі на год — 1 рубель 80 капеек. Асобны нумар можна будзе набыць у кіёску «Саюздруку» за пятнаццаць капеек.

Гутарыў А. ВІШНЕЎСКІ.

Як вядома, род і народ яднаюцца адным дарагім словам — радзіма.

Ці часта мы задумваемся: адкуль пайшоў я сам, адкуль пачалася мая дарога ў свет!

У сучасным клопаце, у штодзённых мітрэнгах і мітусні як бы і не да гэтага — ат, дзе там думаць! Носа некалі ўцерці. Так і жывём. Бяздумна.

А ўсё ж, бывае, і сам не ведаеш, чаму раптам міжволі наплыве на памяць штосьці такое тваё, уласнае, асабістае, вельмі табе дарагое, незразумела адкуль — ці то ад даўняга ўспаміну, ці то ад нечакана пачутага, даўно як бы і забытага слова, назвы, імя, і наскрозь пройме і развярэдзіць душу...

Васіль ВІТКА

Адкуль Вы, як Вас зваць?

ТАК, ДУШУ НАШУ жывяць не толькі вобразы дарагіх нам людзей, а і родныя змалку мясціны навакольнага асяроддзя, зямлі, прыроды, з якімі мы зрасліся ад нараджэння і навечна. «Вобразы мілыя роднанага краю, смутак і радасць мая!» — праз усё жыццё звяртаўся ў думках наш вялікі пясняр да сваёй калыскі, песенна-казачнага Нёмана, адкуль заструменіла жывая крыніца ўсёй яго творчасці. А назвы такія, як Мікалаеўшчына, Акінчыцы, Альбуць, Ласток, Смольня — хіба не жывуць і яны ў нашай памяці і ў памяці ўсіх, хто яшчэ са школьнай парты далучаецца да неўміручай спадчыны паэта. А назвы суседніх паселішчаў на яго радзіме: Рубяжэвічы, Новы Свержань, Вялікія Навікі, Вішнявец, Залужжа, Засулле, Заямнае, Налібокі, Рудня Налібоцкая? А іншыя назвы вёсак, урочышчаў, лясоў, лугоў, рэчак, крыніц хіба не лашчылі слых паэта, дый усіх яго землякоў, хто тут нарадзіўся або нават пабываў, увабраўшы ў сябе, у свае пачуцці і чарадзейнае хараство гэтых краявідаў і музыку гучання роднага слова?

І вось роўна паўвека, як на геаграфічнай карце ўсё гэта— Стаўбцоўскі раён. Зірнём, якімі ж тапанімічнымі набыткамі пабагацеў, папоўніўся слоўнік тубыльцаў і наша лексіка. Натуральна, з'явіліся назвы калгасаў. І вядома ж, такія, як ва ўсіх раёнах: імя Дзяржынскага, Мічурына, Суворава, 40 год Кастрычніка і як пад капірку: Чырвоны Кастрычнік, Чырвоны Сцяг, Чырвоны партызан. Праўда, кожны тубылец з гонарам зазначыць: «А ў нас два калгасы завуцца імёнамі паэтаў: у Рубяжэвічах — Янкі Купалы, а ў Кнотаўшчыне — «Радзіма Якуба Коласа», хоць не зусім зразумела, чаму радзіма Коласа не ў Акінчыцах і нават не ў Мікалаеўшчыне. Ды бог з ім, з тым, хто яе перанёс на іншае месца. У яго была рука, якая што хацела, тое і рабіла. Чаго было асабліва думаць. А імёны калгасам даваліся не то што, як зажадае нейчая правая рука, а, бывала, і левая нага. У тых, хто іх, нованароджаных, хрысціў, казённыя святцы былі карацей камарынага носа, а ўласнага запасу слоў хапала хіба што на рэпертуар папугаю. Айца і сына, імя Арджанікідзе, Будзённага, Варашылава, Дзяржынскага, Жданава, Калініна, Красіна, Куйбышава, Клары Цэткін, Розы Люксембург, Карла Маркса, Энгельса. Вось фальклор з райкомаўскіх прыёмных і сельпоўскіх калідораў: «На бюро будзем слухаць Розу Люксембург». «Калінін мяняе бычкоў на цялушак-перадоек». «Варашылаву далі страгача за тое, што патруціў рыбу ў сажалцы». «Жаночы абутак падкіньце Клары Цэткін, а пяць скрынь гарэлкі Будзённаму...»

Мудрасць вернападданых мясцовых войтаў і цівуноў, бывала, і пашырала набор штампаў. З'явіліся: Авангард, Бальшавік, Гвардзеец, Гігант, Прагрэс...

Не першы год мне карціць і муляе: што гэта за такі род, што гэта за такі від і жанр нашай міфалогіі, калі героі, імёнамі якіх мы называем гарады, вуліцы, плошчы, паркі, стадыёны, заводы, фабрыкі, калгасы, даўно ўжо не маюць рэальных аблічаў, і ад таго, што мы бясконца множым іх колькасць і чапляем, як інвентарныя біркі, да ўсяго, да чаго толькі можам прычапіць, даўно страцілі значнасць сваёй сутнасці. Дэвальвацыя кананізаваных імёнаў, як і масавы канвеерны шырспажыў рытуальных куміраў ужо выклікаюць усюды і скрозь духоўную алергію — іх ужо да адвалу, да пакатынку.

Пачаўшы з назваў калгасаў, давайце цвяроза разважым: што азначае, які сэнс мае імя, якое надаецца, прысвойваецца не канкрэтнаму геаграфічнаму паселішчу, а толькі суполцы людзей, што аб'ядналіся пад гэтаю назваю? Скажам, слуцкія Гольчыцы, уваходзячы ў калгас «Расія», лічаць сябе ўсё ж беларусамі. А мілае маё Хорашава на той жа Случчыне, застаецца ўсё тым жа Хорашавым з усімі яго харошымі людзьмі, хоць і жывуць яны ў «40 год Кастрычніка».

Добра, што ў нас яшчэ хоць цэнтры калгасаў захоўваюць свае ўласныя імёны, і хоць і гэта адзінае, што магло б быць пэўнай арыентацыяй у мясцовасці, але ж ні ў якіх афіцыйных дакументах, ні ў аператыўных зводках у раённых газетах яны ніколі не пішуцца. Уся інфармацыя падаецца толькі пад шыльдай калгаса.

«Па ўборцы бульбы «Будзённы» ў хвасце...» Дзе гэты Будзённы? — пытаюся ў аднавяскоўцаў. Ніхто не ведае — ні старыя, ні малыя. Дый вялікі ім клопат да Будзённага. Вунь так усё раскісла вакол, што і да свайго поля не падступіцца. Ліе ўвесь верасень. І наш у хвасце — «Чкалаў», той, што Паўночны полюс пераляцеў і вось у нас прапісаўся. І не толькі мы з ім у хвасце, а вунь па зводцы і «Авангард», і «Бальшавік», і «Гвардзеец», дый сам «Прагрэс»...

Назвы калгасаў я ўзяў са зводак не аднаго свайго раёна, але ўсе яны адны і тыя ж. Сапраўды, пад капірку. Імя ўсім ім, безаблічным, бяздарасным — легіён! Так і не змог адрозніць, дзе «XVI з'езд КПСС», а дзе «XXI», дзе «імя ЦК КПБ», дзе «Трэці Інтэрнацыянал», а дзе «Трэці рашаючы», дзе «1 Мая», а дзе «17 верасня». Не так лёгка сарыентавацца ў імёнах самога Леніна: «Шлях Леніна», «Іскра Леніна», «Памяць Леніна», «Ульянава», «Ільіча» — а дзе, у якіх сёлах, мястэчках і так званых «г. п.» Дакладна, мабыць, ведаюць толькі ў райкомаўскіх кабінетах і нарыхтоўчых канторах. У іх на сценах — карты, а ў паперах усё пазначана: хто наперадзе, хто адстае — па мясу, па малаку, па нарыхтоўцы кармоў і вывазу гною. Поўная галоснасць для службовага карыстання!

Не конча людзям усё знаць, нават свае ўласныя імёны. Па суседству з маёй вёскай быў арганізаваўся калгасік — маленькі, нядошлы і з самай маленькай назвай: «Дук». Усё наваколле гэтак і звала яго: Дук і Дук. Аднак доўга ён не пацягнуў. За сваю нямогласць быў скасаваны. І толькі з папер людзі даведаліся, што зваўся ён ого як магутна: «Дзень ураджаю і калектывізацыі»!

Хрысцілі нас направа і налева. Хрысцілі, як хто хацеў і як хоча. Лішне спамінаць тут благой памяці ўстановы, пасады, чыны. Усе яны і вялікія, і малыя, зверху данізу: паслухмяныя, самаадданыя казённыя таўкачы, ліха матары, калектывізатары і каланізатары, апрычнікі самаўладства і самадурства.

Гэта з-за іх ласкі ўсе мы і ў вёсках, і ў гарадах, і ў «г.п.» жывём, ходзім, ездзім па адных і тых жа вуліцах, па адных і тых жа маршрутах, пад аднымі і тымі шыльдамі. Не дасягнуўшы толькі светлага абяцанага ідэалу, а так бы ўсе спрэс хадзілі б з аднымі і тымі ж біркамі і нумарамі на шыі.

Беларускі народ дасканала валодаў роднай мовай, узбагачаў яе, утвараючы назвы, імёны ўсяму жывому і навакольным мясцінам і краявідам, дзе жыў спакон веку. Яшчэ і цяпер, на схіле год у маёй памяці гэтулькі незабыўных назваў, і толькі ў ваколіцах сваёй вёскі. Лугі зваліся: Дубраціна, Тапіла, Толева, Лявошына, Мякіш, Падлужак, Рагожына, Клінкова, Задвор'е; балоты: Белае, Пожар, Плёса, Папоў клін, Сакера; лес: Крошня. А колькі суседніх паселішчаў, аселіц, хутароў, сенніц, кашарак, дарог, скрыжаванняў, рэчак, брадоў, грэбляў, выганаў, сцежак, крыніц! Імёны, імёны, назвы, назвы, ды якія каларытныя, сакаўныя, а ўсё разам — мова, родная, матчына, бацькава, сваяцтва — дальняга і блізкага. Неацэнныя жывыя скарбы. І ўсё гэта берагла зямля. Без памяці зямлі не можа быць ні памяці народа, ні яго гісторыі.

Чалавек жыве поўным духоўным жыццём у трох вымярэннях: сучасным, мінулым і будучым. Ці не таму так завіхаліся сталінскія янычары і каланізатары разам з мовай нявечыць і самую нашу памяць. Без разбору мяняючы старажытныя назвы нашых паселішчаў і мясцовасцей, яны не вельмі ўдаваліся ў сэнс новых і нават іх звычайную пісьменнасць. Колькі іх з'явілася на карце рэспублікі, што на Белай, Белай нашай Русі аж мільгаціць уваччу ад суцэльнай чырвані: Красны Акцябр, Краснае Знамя, Знамя, Знаменка, Знаменскае, Акцябрскае, Акцяброва, Акцябрына. А яшчэ не меншыя прыгоствы: Атраднае, Сірэнеўка, Лазурнае, Лучазарнае, Жамчужнае, Красіеўка! Міжволі ўспомніш, чым горшыя былі на маёй Случчыне скасаваныя Жываглодавічы і Старцавічы, а на Уздзеншчыне — Магільна? За імі ж гісторыя, лёс цэлых пакаленняў і памятных гераічных падзей. Хто ж іх закрэсліў адным росчыркам пяра, які самаўпраўны таўкач? Якому, пэўна ж, само слова не лашчыла слых. Дарэчы ўспомніць, як на нашай памяці рабіўся не меншы гвалтоўны замах і на назву горада Магілёва. У 1937 г. даследчык Арктыкі, ураджэнец Магілёва, Ота Шміт кіраваў экспедыцыяй «Чэлюскіна», ратаваў зімоўшчыкаў ст. «Паўночны Полюс». Гонар яму і слава. Але беларускія кіраўнікі настолькі расшчодрыліся, што гатовы былі ахвяраваць герою ўжо не Магілёў, а Шміт. Якраз жа ў гэты час наспявала ідэя і самую сталіцу перанесці з Мінска сюды. Спешна пабудавалі копію сталічнага Дома ўрада. Так што, каб такое здарылася, дык многія б з нас, пэўна, былі б і не мінчукі, і не магілёўцы, а шмітаўцы, а, магчыма, і шмітчукі!

Вось так лёс мог распарадзіцца не толькі намі, а і гарадам нашай маладосці. У дадатак да ўсіх драм і трагедый нашага часу і да пасляваенных год ужо некалькі пакаленняў людзей перажылі не меншае выпрабаванне на сацыяльна-псіхалагічны злом душы. Адарваныя ад зямлі, мы не сталі гараджанамі. Мінск майго юнацтва жыў яшчэ паветрам, якім дыхала вёска. На сваіх украінах і прадмесцях ён таксама быў вёскай. Дзяўчаты з Пярэспы, ідучы на вячэрні шпацыр у цэнтр, неслі лакіраваныя лодачкі ў руках і абувалі іх, мінуўшы мост цераз Свіслач. Усе ведаюць Камароўку з-за яе славутага рынку, і мала хто ведае цяпер Старажоўку, Ляхаўку, Грушаўку, Кальварыю, Козырава, Людамант, Доўгі Брод, Татарскі канец, Чырвонае Урочышча — чысты, сонечны бор, які дарэшты зжэрлі два нашы ненаедныя волаты — Аўтамабільны і Трактарны, а цяпер штовосень і штовясну на вулічных абочынах забіваюць у зямлю тапаліныя калы—азеляняюць заводскія пасёлкі.

У біяграфіі горада былі свае гістарычныя арыенціры. Мова гучала ў яго назвах. Мова гучала ў дзяржаўных установах, ва ўсіх канцылярыях, не гаворачы ўжо аб школах. Цяпер пра тыя гады нярэдка можна пачуць як бы з асуджэннем: беларусізацыя. І з папрокам, нібыта праводзілася яна ледзь не прымусова. Дазволю спытацца: дзеля каго? Дзеля таго ж мяне? Дзеля дзесяткаў і сотняў тысяч такіх жа юнакоў і дзяўчат, што пацягнуліся ў горад вучыцца?

Уявіце сабе, што цяпер у нашых ПТВ і тэхнікумах дзеці вучацца па-беларуску. Кожны скажа: быць такога не можа. А мы ўсе — і вясковыя, і гарадскія вучылі на адной мове і фізіку, і хімію, і гісторыю, і геаграфію, і тэхналогію металаў. Выдатны матэматык у Слуцкай прафтэхшколе немец Ватэль і той дасканала вывучыў свой прадмет па-беларуску, спадзеючыся, што і мы гэтак жа палюбім матэматыку, як і ён сам.

У Мінску на адным са сходаў бацькоў, дзеці якіх вучыліся ў розных школах — хто ў рускай, хто ў польскай, хто ў яўрэйскай, разгарэўся сыр-бор... з-за чаго б вы думалі? Цяпер бы сказалі, з-за нацыянальнага канфлікту. Прасцейшы, рабочы люд — шаўцы, шкляры, муляры, печнікі, грузчыкі, рамізнікі — траха не з кулакамі абрынуліся на Шапіру толькі за тое, што яго дзеці, нябось, вучацца ў беларускай школе, а іншым, хто і хацеў бы, адмаўляюць: усе класы перапоўнены. На той час прафесар Шапіра, вядомы ў Мінску хірург, проста жыў па суседстве з гэтай школай. Да таго ж быў задаволены, што ў беларускай было не толькі прэстыжна вучыцца, а і мелася добрая надзея на перспектыву. У маладой рэспублікі быў востры дэфіцыт на кадры па ўсіх спецыяльнасцях.

Беларускія школы, тэхнікумы, інстытуты ўсе былі ў цэнтры горада. Гэта я ўспамінаю па аналогіі, для параўнання, як дзесяць гадоў таму назад пад націскам і каб адбіцца ад назолаў-пісьменнікаў, якія спакою не давалі Міністэрству асветы, якое дажылося да таго, што нават у сталіцы не мела ніводнай беларускай школы, нарэшце, здзейснілася вялікая падзея! Па згодзе і з дазволу высокаідэйнага дому такая школа, годная ўвагі, была знойдзена. Не ў цэнтры, вядома, дзе спакон веку і прафесура, і ўся інтэлектуальная эліта, і цвет мудрэйшага абранніцтва нацыі, а неспадзеўкі там, дзе толькі і мог дадумацца наймудрэйшы з абраннікаў,—уявіце сабе, на той украіне, дзе нават і Макар цялят не пасе, затое цыганы пасуць коней, даўно аблюбаваўшы гэтае глухое прадмесце. Беларускія цыганы і асабліва іх дзеці — народ дапытлівы і старанны. Ахвотна згуртаваліся з самага першага класа, дайшоўшы ўжо недзе да 7—8, хутка і школу закончаць, праўда, у адным, так сказаць, класным камплекце. І то хлеб, і то гонар. Малайцы! Не пасаромілі беларускай сталіцы, хоць і тут, у цэнтры, у нас ёсць ажно дзве школы з шыльдамі — імя Янкі Купалы і Якуба Коласа, а сёлета дадалася яшчэ і гімназія з шыльдай імя Скарыны.

О, шыльды, шыльды... Вы — наша ўкраса і гонар!

Хто мы — насельніцтва ці проста зборышча, натоўп?

СТРАЦІЎШЫ ПАМЯЦЬ, мы змізарнелі душамі. Выпрабаванне натоўпам у сціску, у вечнай цясноце, дзе локаць патрэбны не для падтрымкі бліжняга, а хутчэй для таго, каб адапхнуць, а то і даць грымака—не лепшы спосаб выхавання духоўнасці. Грубым, эгаістычным і ўрэшце агрэсіўным імпульсам і інстынктам, якія авалодалі намі, цяпер ужо мала хто здольны процістаяць. Пачуццё годнасці даўно не імунітэт засцярогі чалавека, а як непатрэбны апендыкс для яго сумлення. Бяспраўныя, застрашаныя, час ад часу ўспамінаючы сваіх абяздоленых прарокаў, што асмеліліся сказаць перад светам, што і мы хочам людзьмі звацца, самі ж і дагэтуль усё яшчэ не можам вызначыць не такога і далёкага па часе свайго ні этнічнага, ні духоўнага радаслоўя. Якіх-небудзь блізка тысячы год роду, а мы ніяк не дойдзем да яснасці — хто і адкуль жа мы? У апошні час на старонках газет «Звязда», «ЛіМ» і іншых выданняў раптам разгарэліся азарт і запал па высвятленні ролі і

(Працяг на стар. 6).

Вайна была адна...

З падручнікаў гісторыі мы ведаем, які вялікі ўклад унёс савецкі народ у разгром нямецкага фашызму, якой вялікай цаной заплаціў за Перамогу. З тых самых падручнікаў вядома нам і іншае: саюзнікі запазніліся з адкрыццём другога фронту, дапамога іх была меншай, чым магла быць. Але ці так усё гэта на самай справе? Ці не прыўзнімаецца ў дадзеным выпадку роля СССР і ці не прыменшваецца ўклад іншых краін, у прыватнасці, Злучаных Штатаў Амерыкі?

Яшчэ колькі гадоў назад выказаць падобныя сумненні было небяспечна. А цяпер... Выстаўка кніг і экспанатаў інфармацыйнага Агенцтва ЗША пад назвай «Змаганне за свабоду. Злучаныя Штаты ў другой сусветнай вайне», пазнаёміцца з якой выпала магчымасць жыхарам і гасцям горада над Бугам, у многім дае адказ на гэтыя і іншыя пытанні. І зусім невыпадкова, што экспазіцыя была прывезена ў Брэст,— горад, ля сцен якога гітлераўскія захопнікі атрымалі першы значны адпор на савецкай зямлі.

Да выстаўкі яе арганізатары падрыхтавалі не толькі цікавыя, у большасці сваёй унікальныя экспанаты, але і яе праспект. Цудоўна выдадзены, змястоўны, на якаснай паперы — рыхтык невялікі альбом, толькі ў мяккай вокладцы. Да ўсяго — тэкст на беларускай мове. Падрабязна расказваецца пра ўсё тое, што можна ўбачыць на шматлікіх стэндах.

Прыводзяцца і лічбы, якія ў нас не часта сустрэнеш. Аказваецца, «частковы спіс тавараў, завезеных Савецкаму Саюзу ў перыяд паміж 7 лістапада 1941 г. і 20 верасня 1945 г., уключаў у сябе наступнае: 4 062 000 метрычных тон харчоў, 14 795 самалётаў, 7 056 танкаў, 51 503 джыпы, 375 883 грузавікі, 8 071 трактар, 8 218 зенітак, 131 633 аўтаматы, 313 650 метрычных тон узрыўчаткі, 1 981 лакаматыў, 11 155 таварных вагонаў, 90 транспартных караблёў, 105 знішчальных падводных лодак, 197 тарпедных лодак, 2 540 000 метрычных тон сталі, 2 422 000 метрычных тон нафты, 764 000 метрычных тон хімікаліяў, 3 786 000 шын і 15 417 000 пар армейскіх чаравікаў».

Вайна была ў нас адна. Супраць чалавеканенавісніцтва, супраць фашызму. Перамога была заваявана і дасягнута агульнымі намаганнямі. Справа не ў тым, чый уклад у яе большы, а чый меншы. Галоўнае ў іншым: ёсць вопыт плённага міжнароднага супрацоўніцтва. Выкарыстаем жа яго сёння, калі ва ўзаемаадносінах паміж двума вялікімі народамі — амерыканскім і савецкім — нарэшце, пацяплела.

НАШ КАР.

СВЯТЛО ДАРОГІ

Колькі разоў сцвярджалася: паэзія — пульс часу. Але цяперашні час такі, што і паэзія за ім угнацца не можа. Тое, што ўчора ўспрымалася як адкрыццё, сёння паблякла, выветрылася. Асабліва гэта адчуваецца, калі верш прывязаны да канкрэтнай падзеі з нашага недалёкага мінулага. Можна спрачацца, што і ў канкрэтыцы сапраўдны талент праявіцца. Яно так. Але...

Успомнім, хто з паэтаў і празаікаў не ўслаўляў вялікую дружбу савецкіх народаў. І гэта лічылася амаль што будзённай, але неабходнай з'явай, каб кніжка «пайшла лепш». У ёй абавязкова павінна было прысутнічаць некалькі такіх «ударных» твораў. А цяпер?

Я наўмысна засяродзіў на гэтым увагу. Не ў папрок паэзіі і паэтам. Бо ўсё яшчэ выходзяць зборнікі з такімі «неабходнымі» вершамі. А пісаліся яны, відаць, у слаўныя часы.

Думаю, не адна Ніна Загорская напісала такія радкі:

Наша дружба знітавана
Ленінскімі дэкрэтамі,

Саюзам Сярпа і Молата,
Крыламі алых сцягоў,

Крывёю латышскіх стралкоў,
Непахіснасцю бакінскіх
камісараў.

І гэтак далей. А ў канцы верша паэтка робіць адпаведную выснову: «вось чаму непарушная наша Дружба».

Хай не пакрыўдзіцца на мяне аўтарка. Скажу, што гэта літаральна адзіны такі верш у кнізе паэзіі Ніны Загорскай «Мне добра з вамі». Так і карціць дадаць у назву яшчэ адно слова — людзі.

Мне добра з вамі, людзі... Гэта ў натуры яе паэзіі — простай, шчырай, адкрытай. З людзьмі інакш нельга гаварыць, бо «жыццёвая рунь» спавіла зямлю, якую паэтка слухае з болем у сэрцы і разумее. Матывы гэтага разумення разам з ёй успрымаем і мы.

Хочацца верыць — дабрыня не састарэе, не стане чарговым нашым дэфіцытам. Асабліва цяпер, калі само дабро і элементарная прыстойнасць падмяняюцца, а чалавек пачынае прагматычна жыць двайным жыццём, дзе самае страшнае праклянцце: «Каб ты жыў толькі на адну зарплату!». Вось тут акурат і патрэбна мужнасць, каб назваць чорнае чорным, а белае белым.

Замнога тых,
Хто робіць напаўсілы.
Замнога рабавання і маны...
Анёлавыя вочы у віны,
Калі шуфлюе лепшых у
магілы;

Калі маўчаць,
Дзе трэба закрычаць,
Калі не бачаць —
Самыя відушчыя!
Як страшна мне:

Вісіць сляпы туман,
Нібы падман,
Па-над жыццём, як пушчаю.

Многа нам пускалі ў вочы гэтага туману — нават цяпер нялёгка ад яго вызваляцца. І чалавеку, і вершу. Менавіта і ў Загорскай можна назіраць гэтыя супярэчнасці пераадолення. І часу, і самой сябе — «ёсць доля у Паэта — як ніва ў Мужыка». Нялёгкая доля ў абодвух. Аднаму сеяць зярняты прыязнасці, а другому — жыццядайнай сілы, каб «нават на скалах, на камянях выраслі дрэвы яднання». Адзін да аднаго прабіваюцца людзі, як птушкі ў блакіт нябесны.

Тут гром і гнеў мірыліся не
раз,
Тут нараджаліся Паэты і
Паўстанцы.
Таму вядомы сэрцу без
прыкрас
І чорны хлеб, і чарнавая праца.

Зямля бацькоў, дзядоў, нашых продкаў, род беларусаў... Славіўся ты сваімі кавалямі, лірнікамі і кніжнікамі. Таму паэтка лічыць дзедаву скрыпку — «мастом пакаленняў». А «мама жала дзве капы за дзень...» і там жа нарадзіла доню, таму самы светлы дзень на зямлі — дзень нараджэння мамы.

Поўдзень. Высокі поўдзень.
Знік пад нагамі цень.
Мама,
Мая перапёлка,
Сёння твой светлы дзень.

Корань роду... Менавіта ён мацуе паэзію Ніны Загорскай. Зрэшты — і ўсю беларускую. Толькі ў паэтцы і гэта тэма высвечана асаблівым пяшчотным цяплом і чалавечнасцю. Звяртаючыся да сваіх сыноў, яна безумоўна бачыла ўсіх сыноў роднай Беларусі.

Перайміце
Працавітасць дзедаву,
Сілу прадзеда,
Умельства прадзеда,
Мудрасць і Паэзію бабулі
І яе святую Дабрыню.
Бацькаву ашчаднасць
І пяшчоту...
Родныя,
аддана беражыце
Край—жыццё і вернасці
аснову,
Беражыце мову.

Не абышла ў творчасці Загорская і «дарогу светлай Памяці». Па гэтай дарозе ў апошні шлях пайшлі нашы дзяды і бацькі. Пойдзем і мы. У адным з вершаў яна прызналася, што «рэдка ходзім мы з світальнаю расой па родным мурагу, па поплаве, па пашы...», ды гэта шкадаванне прыходзіць да нас ці не запозна. Сірацеюць родныя хаты, якія ні перад кім не вінаватыя. Загорская стварае Паэму ўспамінаў — пра бацьку і Паэму ў вершах — пра маці. Не новая тэма ў беларускай паэзіі. Толькі ў кожнага чалавека гора сваё і сваё перажыванне, а ў паэткі праз гэта і новае бачанне існага свету.

«Бярэмя бялізны з марозу пахне мамінымі рукамі...» Які яркі вобраз, кранальны і запамінальны малюнак!

Нідзе няма такіх бяроз,
як на маёй Радзіме.
Такіх русявых доўгіх кос,
такіх азімін.
Такіх бароў і курганоў
і калыханак...
Іду дамоў, лячу дамоў
на мілы ганак.
Аер і поплава, садок,
І ў мяце сенцы,
І той над Мамаю, грудок, —
навек у сэрцы!

Светлы свет паэзіі Ніны Загорскай у нашым не дужа светлым і суровым жыцці. Не рэзкае і кідкае святло, а павясковаму мяккае і цёплае, як у бабіна лета, праменіцца з вершаў. Як часта яго нам не стае...

Іван РУБІН.

Н. Загорская. «Мне добра з вамі». Вершы і паэмы. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1989.

У доме літаратара панавала паэзія і музыка. Святочны настрой агортваў удзельнікаў паэтычнага вечара Ніны Загорскай, якім Дом літаратара адкрыў чарговы творчы сезон, ужо ў фае, дзе гучала народная музыка ў выкананні фальклорнага аркестра Мінскага інстытута культуры і творы са зборнікаў, падрыхтаваных Рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіяй па народнай творчасці Міністэрства культуры БССР, галоўным рэдактарам якой нямала ўжо год працуе пісьменніца.

На сцэну выйшаў У. Пузыня. Палілася чароўная мелодыя. Пад яе гукі народная артыстка рэспублікі Л. Давідовіч, вядучая вечара, прачытала верш-прысягу Н. Загорскай «Нідзе няма такіх бяроз...» Пасля слова ўзяў намеснік старшыні рады СП Беларусі У. Паўлаў. Яго шчырае слова пра Н. Загорскую прадоўжылі К. Камейша і Г. Марчук. Народная артыстка СССР А. Клімава прачытала вершы паэтэсы ў перакладзе на рускую мову.

Паэтычныя творы, складзеныя ў кампазіцыю «Мамін ручнік», прывёз з радзімы А. Пысіна літаратурны тэатр «Ранак» Краснапольскага РДК. Выступіў тэатр-студыя «Летуценнік» філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Рамансы М. Наско пад яго акампанемент на вершы Н. Загорскай выканала салістка ДАВТа БССР Л. Крывёнак. Песню «Бацькоўская зямля» на аднайменны верш паэткі праспяваў аўтар — кампазітар А. Чыркун.

Выступілі таксама дзіцячы фальклорны калектыў з Міханавіч «Жаваронкі» і дзяржаўны фальклорны гурт «Купалінка».

А пасля рэй вяла сама Н. Загорская: чытала вершы, адказвала на пытанні прысутных.

Тэкст і фота Ул. КРУКА.

АДКУЛЬ ВЫ, ЯК ВАС ЗВАЦЬ?

(Пачатак на стар. 5).

значэння рыма-каталіцкай царквы і асабліва прагрэсіўнасці уніяцтва на Беларусі. Чым гэта выклікаецца, асабліва тлумачыць не варта. Афіцыйная манапольная ідэалогія, пацярпеўшы агульнапрызнанае паражэнне, сама гатова пайсці на любую унію. Цяпер па сваім уплыве яны ўжо далёка не роўныя. Магчыма, і не варта аддаваць перавагу адной перад другой. Увагі даследчыка можа заслугоўваць хіба што рэальная падзея або канкрэтны факт. Сам я, напрыклад, ніяк не магу пагадзіцца з яўнай дэфармацыяй першароднай існасці Полацкага Сафійскага сабора і з той, па меншай меры, легкадумнасцю, з якой рашаўся лёс рэстаўрацыі шматпакутнага храма. Пагалоўная мода на ўстаноўку арганаў у праваслаўных цэрквах па ўсёй краіне не абмінула і яго. І тут устанавілі арган. Ды яшчэ з якой урачыстай помпай і пахвальбой. Чаго калісьці не дамагліся ні езуіты, ні уніяты, выстараліся ўласныя данайцы, што не маглі не прадбачыць, якога траянскага каня цягнуць у нашу старажытную духоўную цытадэль для новай каталіцкай экспансіі на Беларусі. Пра гэта я пісаў у «Правде» яшчэ ў 1982 г. Цяжка сабе ўявіць, што раптам загучалі б арганы ў Кіеўскай, Ноўгарадскай Сафіях... У Полацкай гэта, аказваецца, магчыма. Сам князь Усяслаў вунь ажно з Кіева слухаў ранні звон са сваёй Полацкай Сафіі і цешыўся яго слаўным хараством. Мы ж, няўдзячныя нашчадкі, даведваемся пра гэта толькі са «Слова аб палку Ігаравым».

Не толькі бяздумна, а і злачынна распарадзіліся гаспадары пасляваеннага Мінска, без жалю і літасці вынішчыўшы карані, якія звязвалі і Мінск з геніяльным «Словам» — найвялікшым духоўным помнікам трох братніх славянскіх народаў. Ад гістарычнага квартала пад назвай Няміга не засталося і следу.

Дэкаратыўна абнавіўшы Траецкае прадмесце, адбудоўшчыкі першым чынам паклапаціліся абсталяваць у ім карчму, пабудаваць ЗАГС, у дадатак засведчыўшы сваю непісьменнасць у перакладзе на беларускую: «Запіс актаў грамадскага стану». Замест: грамадзянскага—грамадскага. Такім дробязям у нас не надаецца ніякай увагі. Усё непісьменнае ўспрымаецца як беларускае. «Аб'яднанне калгасных кірмашоў г. Мінска»—выбіта жалезнымі літарамі на чыгуннай шыльдзе Камароўскага рынку. Дзеля чаго аб'ядноўваюць кірмашы? Хай сабе яны адбываюцца, дзе катораму ёсць патрэба. Славутая казка Андэрсена «Новое платье короля» была абвешчана па беларускім радыё—«Новая сукенка караля». Госпадзі, колькі ўсяго падобнага можна пачуць, прачытаць за адзін толькі дзень—ачмурэеш, адурэеш!

Яшчэ ў слоўніку Даля «халтура» пазначана як мясцовае слова. У наш час яно пагалоўна вядома скрозь і ўсюды — ад прафесара да слесара-вадаправодчыка. У нас, у беларусаў, блізкае па гучанні, яно яшчэ мае і іншы сэнс — хаўтуры. Пра нядобрасумленную ж работу у нас гаварылася — тандэтная, зробленая на тандэт, або, як і цяпер кажуць мае землякі, — на шармака.

На тандэт, на шармака, напаканец рук робіць усё, за што ні возьмецца, адбываючы павіннасць, навалач без памяці, роду і племені.

Халтура, узведзеная ў галоўны паказчык нашых поспехаў і дасягненняў, нарэшце, так і завяршылася хаўтурамі і самому парадку, і яго энтузіястам, і натхніцелям.

Нямала пастараліся халтуршчыкі з той жа бязроднай і бяспамятнай навалачы і ў галіне культуры. Усё прычасалі пад агульны тандэт, нават тое, што ўцалела ў Мінску пасля вайны, на яго руінах. Якая, скажам, была неабходнасць пазбаўляць горад яго гістарычнага асяродку, яго самай традыцыйнай прыкметы — гарадской ратушы, вежавага гадзінніка на ёй, па якім мінчане звяралі час, а маладыя пары прызначалі спатканні — многія пакаленні мінчан. Уцалелую ратушу прыстасавалі пад так званы Дом фізкультуры, які цяпер побач з Палацам спорту нікому непатрэбны! Гэтак жа па-заліхвацку абышліся рэканструктары з тэатрам Янкі Купалы, мадэрнізаваўшы яго так, што той цалкам страціў падабенства з будынкам, у якім засноўваўся і сам тэатр і ў якім адбываліся многія іншыя памятныя падзеі ў гісторыі рэспублікі.

Што ж, дзеля прыхамаці, дзеля мадэрнісцкага свербу кожнага новага ідэйнага лідэра або граданачальніка паступішся не толькі радаслоўем горада, а праўдай самой гісторыі. Той самай, з якой нашы прашчуры і продкі, нашы дзяды і бацькі пытаюцца нас, сваіх нашчадкаў:

— Адкуль жа вы, як вас зваць?

(Працяг у наступным нумары «ЛіМа»).

На скрыжаванні думак

12 кастрычніка г. г. «ЛіМ» надрукаваў допіс кандыдата тэхнічных навук П. Біча «Каб запрацаваў закон». Публікацыя, у прыватнасці, канкрэтныя прапановы аўтара па ажыццяўленні моўнага заканадаўства выклікалі ажыўлены розгалас. Прычым, думкі нашых чытачоў падзяліліся, пра што і сведчаць лісты, якія мы сёння змяшчаем.

НЕ ПАЛЯПШАЕЦЦА— ПАГАРШАЕЦЦА

Нельга не пагадзіцца з паважаным П. Бічом, якога непакоіць лёс беларускай мовы ў рэспубліцы. Ужо не першы год гаворыцца пра жахлівае становішча роднай мовы ў беларускім кіно, оперы, на радыё, тэлебачанні, у друку. Што тычыцца апошняга, дык пасля ўвядзення ў дзеянне Закона аб мовах становішча, здаецца, не паляпшаецца, а пагаршаецца.

Але дазволю сабе не пагадзіцца з прапановамі, якія, як лічыць П. Біч, спрыялі б ажыццяўленню палажэнняў згаданага закона. У большай частцы яны адарваныя ад нашага цяперашняга жыцця. Хіба толькі цяжка спрачацца з прапановай аб скарачэнні патоку інфармацыі на рускай мове. Але як жа гэта робіцца? Чыста беларускіх праграм па радыё няма і невядома, калі з'явяцца. Беларуская праграма тэлебачання існуе, але падлічыце, колькі часу ў яе перадачах займае родная мова? Новыя газеты пачынаюць выдавацца чамусьці на беларускай і рускай мовах у адным выданні (нават газета Вярхоўнага Савета БССР!). А што гэта такое: «на беларускай і рускай»? Фактычна, як гэта ёсць на сённяшні дзень, недзе 30 працэнтаў друкаваных матэрыялаў на беларускай мове і 70 — на рускай. А то можа яшчэ быць, як у выданні «Паляўнічы і рыбалоў Беларусі», дзе беларускія — толькі назва і калонка рэдактара. Таму праз газету «ЛіМ» хачу звярнуцца да тых народных дэпутатаў, якія яшчэ размаўляюць па-руску: вучыце родную мову! Мне здаецца, для большасці з вас гэта не будзе складаць вялікай цяжкасці. Тады, можа, і «Народная газеце» не спатрэбіцца «два языкі ў роце»? Можна было б па Беларускім тэлебачанні паўтарыць цыкл урокаў роднай мовы. (Такая практыка, дарэчы, ёсць у Літве). Практычны матэрыял да гэтых урокаў мог бы публікаваць штотыднёвік «Беларускае тэлебачанне і радыё». Ды, можа, і шаноўная рэдакцыя «ЛіМа» ад гэтага не адмовілася б...

І яшчэ. З вялікім задавальненнем даведаўся аб выхадзе ў свет «Беларускага календара». Канечне, яшчэ ў руках яго не трымаў, але за сам факт выхаду календара трэба сардэчна падзякаваць усім, хто да гэтай справы спрычыніўся.

Разам з тым хацелася б выказаць і невялікую заўвагу з гэтай нагоды. У інтэрв'ю паважаны А. Петрашкевіч адзначыў, што ў гэтым выданні будуць падавацца дні імянін, рэлігійных і народных свят. Але, як я зразумеў, гэта будзе тычыцца тых, хто прытрымліваецца праваслаўнай традыцыі. А як быць беларусам-каталікам? Варта ўлічыць такое пажаданне на будучае.

М. НЯБЕСКІ.

«ГЛУПСТВА, ПАНЕ ДАБРАДЗЕЮ!»

Неяк у рэдакцыі аднаго маскоўскага часопіса я пачаў расказваць пра цяжкое становішча, у якім апынулася беларуская мова. Маладая рэдактарка заўважыла: «Извините, но я вас не понимаю. Ведь белорусский язык почти не отличается от русского! Стоит ли за него цепляться ради нескольких своеобычных слов и латинского «і»?» Я не стаў спрачацца, проста адказаў ёй па-беларуску: «Вы памыляецеся, і зараз я вас у гэтым пераканаю. Калі ласка, адхініце фіранку, бо ў памяшканні змрочна, шыбкі маленечкія, а столь, як у лёху». Дзяўчына спачатку зрабіла вялікія вочы: «Разве это белорусский язык? Вы меня разыгрываете!» Потым пачырванела і прызналася, што зразумела толькі «калі ласка». І дужа здзіўлялася, што «занавеска»—гэта «фіранка», «подземелье» — «лёх», а «потолок» — «столь». І што «ошибаться» па-беларуску значыць «памылятца»...

Даўно было, а прыгадалася зноў, калі прачытаў ліст П. Біча «Каб запрацаваў закон» («ЛіМ», 17 кастрычніка 1990 г.). Парадокс, але П. Біч, які палымяна выступае за адраджэнне роднай мовы, за яе годнасць, паставіўся да яе гэтак жа, як тая маскоўская рэдактарка, калі напісаў: «Пратэсты чытачоў, якія быццам не могуць чытаць па-беларуску, **кваліфікаваць як правакацыю** (падкрэслена П. Бічом.—**В. Т.**), паколькі для авалодвання чытаннем друку на беларускай мове **дастаткова некалькі тыдняў»** (падкрэслена мною.—**В. Т.**). З гэтага пасажа атрымліваецца, што беларуская мова і сапраўды амаль нічым не адрозніваецца ад рускай, хіба што над нягеглым сказам «авалодванне чытаннем друку» чытачам давядзецца крыху паламаць галаву. Як сказаў бы купалаўскі Пранцысь Пустарэвіч з «Паўлінкі»: «Глупства, пане дабрадзею!».

Падобных пасажаў у разважаннях П. Біча нямала, на іх можна было б не звяртаць увагі, калі б яго ліст не ўяўляў сабою канцэнтрацыю памылковых думак, а хутчэй — эмоцый, якія ўсё больш авалодваюць грамадствам. Эмоцыі гэтыя — запальчывая нецярплівасць, жаданне за «некалькі тыдняў» вырашыць праблемы, якія нагрувашчваліся на працягу сямі з гакам дзесяцігоддзяў. Проста няёмка робіцца, а прасцей кажучы — страшна, калі чытаеш такое: «Філосафы кажуць, што паміж пагардай і павагай не можа не ляжаць паласа змагання і нянавісці. Да гэтага часу беларускай мовай пагарджалі ўсе, у тым ліку і самі беларусы. Зараз, калі мы хочам, каб яе паважалі, трэба набрацца смеласці і не ўхіляцца ад змагання, адкінуўшы прынцып добраахвотнасці як фальшывы».

Напэўна, П. Біч абурыцца, калі сказаць яму, што ад гэткіх сцвярджэнняў патыхае... сталінізмам, прычым з тым жа яго першародным знакам — знакам нянавісці. Аднак жа...

Спытаем у П. Біча і ў яго аднадумцаў, чаго яны хочуць? Хочуць каб тыя рускія людзі, якія жывуць на Беларусі, ды і тыя беларусы, якія адцураліся роднай мовы, ад якой іх адвучылі, гэту мову ў рэшце рэшт палюбілі? Ці хочуць, каб зненавідзелі? Бо нават малое, якое не хоча есці манную кашу, калі прымушаць яе есці, зненавідзіць гэтую кашу на ўсё жыццё.

Шлях адзін: аднаўляць, адраджаць мову крок за крокам, цярпліва, сцяўшы зубы, разумеючы, што гэта работа на многія гады, а ніяк не на тыдні, работа катаржная, да сёмага поту, як на сяўбе, на жніве, на ворыве. Трэба зразумець, што сёння мы толькі ўзворваем дзірван, пакінуты нам «пралетарскімі інтэрнацыяналістамі», якія знішчылі амаль усё нацыянальнае, ды і сам інтэрнацыяналізм — ідэю ўсёчалавечага братэрства — ператварылі ў пачвару з дубінай класавай нянавісці ў руках, — толькі ўзворваем дзірван абыякавасці, нацыянальнага нігілізму, толькі пачалі пасяўную. І патрабаваць ад гэтага яшчэ «дзікага поля», каб яно адразу дало ўраджай, — глупства, пане дабрадзею!

Аднак нецярплівасць можна і зразумець. Не апраўдаць (асабліва тады, калі яна становіцца агрэсіўнай, калі яна заклікае да гвалту ў святой справе нацыянальнага адраджэння), а іменна зразумець. Асабліва, калі бачыш, што яе падсілкоўвае. Вось перада мною нумар «Народнай газеты», новага выдання, органа Вярхоўнага Савета БССР. Дэвізу «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» на першай яе старонцы няма, дэвізам зроблены радкі М. А. Някрасава: «Кто живет без печали и гнева, тот не любит Отчизны своей». Вядома, Някрасаў — вялікі рускі паэт, і радкі выдатныя, хрэстаматыйныя, ніхто не можа паставіць іх пад сумненне. Але ж газета—беларуская, хай сабе і двухмоўная, не ў Разані ж яна выходзіць! Не ў Маскве! Дык няўжо ва ўсёй паэтычнай спадчыне ці Янкі Купалы, ці Якуба Коласа, ці Максіма Багдановіча не знайшлося некалькіх радкоў, якія маглі б стаць пастаянным дэвізам «Народнай газеты» Беларусі? Глупства, пане дабрадзею, ды яшчэ якое!

Такія вось думкі нарадзіліся ў мяне пасля прачытання ліста П. Біча.

Валянцін ТАРАС.

СЛОВА— ЗА ЎРАДАМ РЭСПУБЛІКІ

Цалкам падтрымліваю кандыдата тэхнічных навук П. Біча, усё тое, што ён выказаў у сваім лісце. Больш двухсот год гвалтам ажыццяўлялася русіфікацыя беларускага народа. Планамерна нішчылася ўсё беларускае: школы, цэрквы, культура, нацыянальная самасвядомасць. За стагоддзі і асабліва за апошнія дзесяцігоддзі выраслі легіёны «Иванов, не ведающих родства». Яны ў гэтым, праўда, не вінаватыя... Прывяду такі прыклад. Як і ўсе мінчукі, мая дачка і зяць выхоўваліся ў рускамоўным асяроддзі горада. Што было беларускага, дык гэта ўрокі беларускай мовы ў школе. Але ўсім вядома, які быў плён ад такога навучання, толькі і чуў бясконца: «Папа, скажи, как это будет по-белорусски?» І вось мая дачка жыве зараз з сям'ёй пад Масквой, дзе служыць зяць. Мы дамовіліся, што перапісвацца будзем толькі па-беларуску, каб яны не забывалі Бацькаўшчыну і мову. І вось трымаю першы іхні ліст: добрая беларуская мова, амаль без памылак!

Калі наша кіраўніцтва, наша наменклатура загаворыць па-беларуску і па-сапраўднаму возьмецца за адраджэнне ўсяго беларускага на падмурку «Дэкларацыі аб суверэнітэце», тады і будзе плён. Цяпер жа большасць яе працята духам нацыянальнага нігілізму, кіраўнікі рэспублікі адчуваюць сябе не болей, як намеснікі «Цэнтра» на Беларусі. Ці не адсюль і прыходзіць у заняпад усё беларускае (душа скаланулася, калі прачытаў у «ЛіМе» і «Звяздзе» зварот да другой сесіі Вярхоўнага Савета БССР галоўных рэдактараў часопісаў «Полымя», «Нёман» і «Беларусь»).

А выхаванне нацыянальнага патрыятызму, таго, што ёсць у кожнага народа, але няма ў беларусаў? Колькі дзён таму бачыў аўтамашыну з гродзенскім нумарам. Ззаду на шкле—вялізны плакат з польскім гербам. Хто гэты вадзіцель — сапраўдны паляк ці хутчэй за ўсё апалячаны касцёлам беларус?.. Але справа зараз не ў гэтым. Уявіце сабе беларуса, у якога на шкле аўтамашыны будзе дзяржаўны герб БССР, або які з патрыятычных памкненняў вывесіў дзе-небудзь чырвона-зялёны сцяг. Такога не сустрэнеце, бо гэтая сімволіка—штучная. Усе гербы саюзных рэспублік зроблены на адзін капыл і толькі падкрэсліваюць: маўляў, гісторыя народаў гэтых рэспублік пачалася з 1917 года. (Дарэчы, сцяг свой беларусы атрымалі, здаецца, у 1953 годзе). Адсюль адзінае выйсце — вярнуць гістарычнае, якое ідзе з глыбінь стагоддзяў. Але пакуль што цяжка ўявіць сабе дзяржаўнымі «Пагоню» ды бел-чырвона-белы сцяг: нацыянальны нігілізм у большай частцы беларускага народа набыў ужо зусім небяспечныя маштабы і цяжка разлічваць, што народ запатрабуе вяртання і мовы, і дзяржаўных сімвалаў, і шмат чаго іншага. З другога боку, павялічваецца, як правільна адзначае П. Біч, уціск не толькі русіфікацыі, але і паланізацыі. Змяніць становішча можа толькі Вярхоўны Савет БССР, урад рэспублікі.

А. КАЎЦЭВІЧ,
кандыдат тэхнічных навук.

г. Мінск.

НЕ ГВАЛТАМ, А НЕАБХОДНАСЦЮ

Аўтар ліста П. Біч у большасці сваіх меркаванняў мае рацыю. Беларуская мова не цікавіць нашыя дзяржаўныя ўстановы. Закон аб мовах у БССР там лічыцца ўсяго толькі аркушам паперы.

Але ж ці можна такія святыя ідэі, аб якіх з вялікай занепакоенасцю гаворыць аўтар, правесці ў жыццё гвалтоўным шляхам? Чалавека, само жыццё прымусіць перайсці на беларускую мову. Калі беларуская мова будзе патрэбнай у жыцці, то нікога не прыйдзецца прымушаць пасылаць сваіх дзетак у беларускія школкі.

З прапанаваных аўтарам мераў нельга згадзіцца хіба толькі з тым, што трэба спыніць завоз на Беларусь рускай класікі. Навошта ж так абмяжоўваць саміх сябе? Іншая справа, што ці павінна руская літаратура стаяць на першым месцы сярод твораў іншых народаў?

А. АДАМЧЫК,
студэнт хімфака БДУ імя Леніна.

Кніганіс

В. АДАМЧЫК. Раяль з адламаным вечкам. Апавяданні. Мінск, «Юнацтва», 1990.

«Дзікі голуб», «Млечны Шлях», «Кароль Нябожа»— гэтыя і іншыя апавяданні Вячаслава Адамчыка смела можна аднесці да залатога фонду беларускай навелістыкі. Яны і склалі змест кнігі празаіка, што папоўніла серыю «Бібліятэка юнацтва».

Л. АРАБЕЙ. Стану песняй... Жыццё і творчасць Цёткі. Дакументальная аповесць. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

Другім, дапоўненым і дапрацаваным выданнем (першае выйшла яшчэ ў 1977 годзе) пабачыла свет дакументальная аповесць Лідзіі Арабей «Стану песняй...». На багатым фактычным матэрыяле, што з'явіўся ў выніку карпатлівых, па-сапраўднаму даследчыцкіх пошукаў, пісьменніца раскрывае воблік Цёткі — паэтэсы, грамадскага дзеяча, рэвалюцыянеркі, шчырага барацьбіта на ніве нацыянальнага Адраджэння.

Г. ДАЛІДОВІЧ. Дзесяты клас. На рускай мове. Для старэйшага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1990.

«Дзесяты клас» — гэта жаданне аўтара пагаварыць з тымі, хто знаходзіцца перад выбарам самастойнай жыццёвай дарогі, аб маральных каштоўнасцях, задумацца над вытокамі, пераступіць парог апошняга класа. У зборнік увайшлі найбольш папулярныя апавяданні пісьменніка, а таксама дзве аповесці (пераклад А. Часнаковай і М. Нямкевіча).

А. КРАЧКОЎСКІ. Край наш Наддзвінскі. Мінск, «Полымя», 1990.

Працяг папулярнай серыі «Па родным краі». Аўтар расказвае пра ўчарашні і сённяшні дзень бешанковіцкай зямлі, памятныя падзеі, што адбываліся ў тутэйшых мясцінах. Чытач пазнаёміцца таксама з людзьмі, якія нарадзіліся на тэрыторыі цяперашняга Бешанковіцкага раёна.

БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ.

Да 60-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

Ён ачышчае нашы душы

Недзе разам з вершамі Уладзімір Караткевіч пачаў пісаць і прозу, і ўжо ў 1961 годзе выйшаў яго першы празаічны зборнік «Блакіт і золата дня». У той час я працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» (тады яно называлася больш афіцыйна — Дзяржаўнае выдавецтва БССР), і мне выпала быць рэдактарам гэтай першай кніжкі прозы Уладзіміра Караткевіча. Я ўжо ведаў яго як чалавека, як асобу і як паэта. Ужо чытаў яго вершы, якія мяне хвалявалі і кранералі да слёз. Верш, прысвечаны паэту Паўлюку Багрыму з Крошына, з-пад Баранавіч, — гэта цэлая паэма лёсу нашага беларускага народа і нашага краю, гісторыя таленту на нашай забранай зямлі, якому не суджана было сказаць сваё важкае слова, бо жыццё не спрыяла яму: «бацька кіямі забіты», а яго самога, падлетка Паўлюка, забіраюць у рэкруты, адтуль ён вяртаецца ўжо старым змучаным чалавекам, які можа хіба што каваць жалеза, а не пісаць вершы. Прачытаўшы верш пра Паўлюка Багрыма, я падумаў, што гісторыя вяртае нам доўг: Уладзімір Караткевіч скажа для нас і пра нас тое, чаго не змог, не здолеў ці не паспеў сказаць Паўлюк Багрым. Хоць будзе гэта на новым этапе, на новым вітку.

І з тым большай радасцю і хваляваннем узяўся я рэдагаваць прозу маладога паэта. Скажу, што ў нас не было асаблівых спрэчак ці канфліктаў, мы з ім вельмі хутка знайшлі агульную мову. Памагла нам добрая станоўчая рэцэнзія на гэты зборнік нашага ўжо і тады прызнанага празаіка Янкі Брыля, якая надавала смеласці і маладому рэдактару.

І калі тагачасны галоўны рэдактар выдавецтва Іван Казека выклікаў мяне і Лідзію Арабей, якой ён даручыў чытаць рукапіс пасля майго рэдагавання, то я пачуваў сябе даволі ўпэўнена — у Арабей была таксама спрыяльная пазіцыя да рукапісу Уладзіміра Караткевіча. Мяне, як рэдактара, галоўны паўшчуваў за тое, што ў Караткевіча шмат засталося іншамоўных слоў, што яго літаральна трэба чытаць са слоўнікам. Ну што гэта такое: курульнае крэсла? А фаскі? А ліхтары? Адкуль чытачу ведаць усе гэтыя лацінскія словы? І чаму мы павінны маліцца на іх, кажучы: ах, які ты мудры, Караткевіч, які ты эрудыт, які ты вундэркінд!

Можна было спрачацца, можна было не згаджацца, але гэтым можна было яшчэ больш нашкодзіць маладому аўтару: начальства вельмі не любіць, калі рэдактар заступаецца за аўтара ды яшчэ аспрэчвае яго, начальства, думку. Мы з Лідзіяй Арабей ківалі толькі галовамі: згодны з вашай крытыкай, шаноўны галоўны рэдактар, улічым на другі раз... Толькі ў адным апавяданні была ўсечана канцоўка — надта натуралістычная, як сказаў галоўны, а астатняе ўсё праходзіла. Асабліва я баяўся за аповесць «Цыганскі кароль», у якім было шмат падтэкстаў.

Мы выйшлі ад галоўнага і з палёгкай уздыхнулі — Уладзімір Караткевіч, празаік, быў на прамой дарозе да чытача.

Больш мне ў той час рэдагаваць прозу Караткевіча не давялося: ён рабіўся вядомы, яго ўсе хацелі рэдагаваць.

Праз шмат год, калі я працаваў ужо ў часопісе «Маладосць», мне давялося зноў рэдагаваць прозу Уладзіміра Караткевіча. У «Маладосці» друкавалася яго аповесць «Лісце каштанаў», «Зброя» (фактычна вялікі раздзел да эпапеі «Каласы пад сярпом тваім»), а пасля раман-дэтэктыў «Чорны замак Альшанскі».

Уладзімір Караткевіч стаў ужо на гэты час знакамітым пісьменнікам, шмат выдаваўся, стаў папулярны дома і за мяжой. Але як чалавек, як асоба ён мала ў чым змяніўся — быў гэткі самы шчыры, адкрыты, часам рэзкі, калючы, смелы, які і быў у маладосці. Мо толькі пабольшала ў ім іроніі і самаіроніі. Ды мо менш ён стаў паказваць сваю эрудыцыю, чым у маладыя гады, — няйначай, каб не пакрыўдзіць прысутных, ён звычайна гаварыў прыблізна так: «Як вам вядома, на гэты конт Васіль Осіпавіч Ключэўскі ў другім томе свайго «Курса русской истории» пісаў...» — і мог цытаваць добры кавалак тэксту на рускай мове, а мог экспромтам і перакладаць.

Яго дасведчанасці і эрудыцыі можна было пазайздросціць, але зраўняцца з ім, відаць, зусім нерэальна.

Калі мы ў «Маладосці» прачыталі яго аповесць «Зброя» і зрабілі яму заўвагі на палях рукапісу, праз некалькі дзён ён прынёс нам яго назад — і на кожную нашу заўвагу ён выстаўляў па некалькі пераканаўчых аргументаў, спасылаючыся на самыя аўтарытэтныя крыніцы. Гэтак было прыблізна і з раманам «Чорны замак Альшанскі». І шмат якія нашы заўвагі давялося здымаць.

А ўся «палеміка» на палях, калі б яе спісаць, мела б вельмі вялікую цікавасць для кожнага, хто любіць Караткевіча і цікавіцца яго творчасцю і жыццём. Здаецца нават, што Яўген Міклашэўскі, які тады працаваў са мной у аддзеле прозы, сёе-тое сабе занатаваў з той «палемікі» на палях рукапісу.

І апошні візіт у «Маладосць» Уладзімір Караткевіч зрабіў, калі прынёс нам п'есу «Маці ўрагану». Перад гэтым ён доўга хварэў, быў нават у рэанімацыі, аднак адолеў хваробу, хоць адчуваў сябе не надта добра. Быў ён і з выгляду і настроем не такі, як раней: з жартам, з досціпам, часам з анекдотам ці якой смешнай гісторыяй, якая часцей за ўсё здаралася з ім самім.

Ён аддаў нам п'есу, трохі пракаменціраваў яе, потым распытаў, што новага ў рэдакцыі, каго друкуем з цікавых маладых аўтараў, нядоўга пасядзеў і пайшоў.

Хто мог падумаць тады, што гэты яго візіт будзе апошні? 25 жніўня таго ж 1984 года Уладзіміра Караткевіча не стала.

Ён ужо не ўбачыў сваёй п'есы ў друку, не патрымаў у руках 12-ы нумар «Маладосці». П'еса «Маці ўрагану» — мо самая моцная з яго п'ес. Тут, здаецца, ён пісаў нешта вельмі блізкае для сябе. Я бачу тут нешта нават біяграфічнае: інтэлігент і народ, паэт і народ, герой і народ. Як адно дапаўняе другое, адно без другога— амаль што нічога не значаць. Народ — гэта сіла, інтэлігент, герой — галава, розум. А калі розум аб'яднаецца з сілай, гэта ўжо будзе разумная, відушчая сіла, супроць якой ніхто не ўстаіць.

У мяне было яшчэ некалькі сустрэч з Уладзімірам Караткевічам у тое жалобнае лета. Мы сустракаліся ў скверыку ля тэатра Янкі Купалы. Аднойчы мы прайшлі з ім на вуліцу Леніна, пасядзелі на лаўцы. Грэла сонца, было цёпла, ён збіраўся яшчэ схадзіць на галоўпаштамт, нешта некаму выслаць. Я ўручыў яму паперу, якую выпісаў са свае запісное кніжкі — пра яго, Уладзіміра Караткевіча. Ён тады прачытаў яе, глянуў на мяне, скупа ўсміхнуўся і сказаў: «Ці не гіпербалізуеш ты, дзед?».

Там была мая ацэнка яго творчасці, яго працы. Мо я памыляюся, аднак лічу і буду даказваць, што Уладзімір Караткевіч быў геніяльным чалавекам, геніяльным пісьменнікам. Такія людзі, як ён, нараджаюцца рэдка, да таго ж мала жывуць, не ўсё паспяваюць зрабіць, што маглі і што думалі.

За што наш чытач любіць Караткевіча? Што добра, цікава піша? Гэта так. Але і пра што піша — таксама. І мо самае важнае — піша пра тое, пра што ўсе астатнія неяк сарамліва маўчаць: пра любоў да свайго краю, да вытокаў, да каранёў, да таго месца, дзе нарадзіўся і рос чалавек беларускі—да Беларусі. Ён, Караткевіч, іграе тую мелодыю, якую нам спявала родная маці над калыскай і якую мы паступова пачалі забываць, якую ўжо не заўсёды можам перадаць сваім дзецям. А Караткевіч вядзе менавіта гэтую родную нам мелодыю, якая шмат у каго яшчэ выціскае з вока слязу.

Уладзімір Караткевіч, калі гаварыць высокім стылем, уваскрашае нас ад доўгага летаргічнага сну, якім мы доўга спалі. Ён ачышчае нашы душы ад наноснага бруду, прасвятляе нам розум, вяртае нам тое, што мы страцілі па злой волі чужых нам людзей, якія доўгі час мелі дачыненне да нашага жыцця. Аднак жа гісторыя не заўсёды скупая: яна дала нам Уладзіміра Караткевіча, які мо цяпер робіць тое, што рабілі Янка Купала і Якуб Колас напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Бо званіць у званы памяці людской трэба заўсёды, толькі часам гэтага няма каму рабіць — няма смелага, магутнага генія. Ён з кагорты такіх, як Скарына, Гусоўскі, Багдановіч, Купала, Колас, Мележ. Ён рабіў і робіць сваімі творамі каласальную, тытанічную працу, якую можа рабіць не кожны, а толькі гігант.

Нават з адлегласці некалькіх гадоў, калі Уладзімір Караткевіч заўчасна пайшоў ад нас, яго постаць вымалёўваецца больш контурна і ярка.

Ніяк нельга змірыцца з думкаю, што Уладзіміра Караткевіча няма сярод нас, што ён не можа разам з намі парадавацца сёння тым пераменам, калі ломяцца ўшчэнт старыя падгнілыя запруды бюракратызму, дэмагогіі, бяздушша і кар'ерызму. Ён быў бы шчаслівы бачыць і разумець, што ўсім сваім жыццём і ўсёй сваёй творчасцю менавіта ён сам разбураў гэтую плаціну застою і коснасці, якая сёння рухнула назаўсёды.

І яшчэ ўяўляю, як глыбока раніла б яго чулую душу падзея зусім іншага вымярэння— чарнобыльская катастрофа. Упэўнены, што Уладзімір Караткевіч, які не любіў заседжвацца дома надоўга, адным з першых кінуўся б на месца здарэння — высвятляць, вывучаць, браць інтэрв'ю ў відавочцаў, каб дакапацца да прычын, чаму магла здарыцца такая бяда і хто ў ёй вінаваты. І што трэба рабіць, каб такое не магло паўтарыцца — ніколі на нашай зямлі.

...Апошні свой паэтычны зборнік Уладзімір Караткевіч назваў сімвалічна — «Быў. Ёсць. Буду». У гэта нельга не паверыць. Ён быў, ёсць і будзе заўсёды сярод жывых.

Уладзімір ДАМАШЭВІЧ.

Вальдэмар КАЛІНІН

Цыганскі дзякуй Караткевічу

Аршыца там усё цячэ
І ветрык кволіцца яшчэ,
Адтуль свой не спыняе рух
Ягонай сілы вечны дух.

Паветра перакажа зноў,
Як неслі коні цыганоў.
Імпэт цыганскі сцішыць мог
Адно што сам Вялікі Бог.

Абсягі віцебскай зямлі,
Шагалу пэндзаль вы далі
І Караткевіча радкі
Багаславілі на вякі.

Усе спяшайцеся сюды!
Пакайцеся за ўсе гады,
Што вы не шанавалі спраў
Таго, каго вам Бог паслаў.

З цыганскай
Пераклаў Рыгор Барадулін.

«ЯК АДЗІН З ЛЕПШЫХ УСПАМІНАЎ...»

Вясной 1958 года мяне выклікалі на абласную нараду настаўнікаў у Віцебск.

Там мы ўпершыню ўбачыліся з Уладзімірам Караткевічам. І, пазнаёміўшыся, не маглі спыніцца, вялі бясконцыя размовы пра жыццё, гісторыю, літаратуру. А колькі вершаў прачыталі адзін аднаму тады два настаўнікі — крынкаўскі сельскі я і гарадскі аршанскі ён.

Помню, што абедалі ў старым яшчэ рэстаране «Аўрора», шмат жартавалі, смяяліся. А потым пайшлі на спатканне да маёй будучай жонкі, разам чакалі яе, і ўтраіх хадзілі па Віцебску.

Быў цёплы майскі вечар. І на душы было таксама цёпла ад сустрэчы, размоў і чакання нечага вялікага і светлага, што чакала — не магло не чакаць! — кожнага з нас.

Сустрэчныя гараджане звярталі ўвагу на субяседнікаў, якія гучна гаварылі і размахвалі рукамі, на рытмічныя рыфмоўкі іх размовы. А мы не заўважалі нічога. Толькі спадарожніца наша часам упрошвала: «Цішэй, хлопцы, мы не адны на вуліцы...»

Уладзімір чытаў сваіх «Калумбаў», я — «Левітана». Потым іншыя вершы — свае і чужыя.

Апрануты мы былі проста. А яму асаблівы каларыт надавала тое, што шыя была абкручана беласнежным бінтам, не помню ўжо чаму.

Позна ўвечары мы прыйшлі на вакзал да цягніка на Оршу. Развіталіся, дамовіліся пісаць адзін аднаму, а для пачатку перапісаць і даслаць яшчэ не апублікаваныя свае вершы.

Ён хутка даслаў мне сваіх «Калумбаў» разам з лістом, на якім вельмі разборлівым почыркам старанна былі выведзены радкі. Вось яны без усялякіх скарачэнняў.

«Шаноўны знішчальнік літаратурных Галіяфаў!

Лайдак ты, браце, вось што! Чакай, я яшчэ дабяруся неяк да цябе, калі прыеду ў Віцебск, будзеш ты глядзець на свет праз уласныя рэбры. Адзіным суцяшэннем для мяне з'яўляецца тое, што я і сам такі самы лайдак, калі яшчэ не горшы. З вершамі затрымаўся, нікому не пішу, нічога не пішу—бяда ды й толькі. Праўда, у школе маёй ідуць экзамены, і я сяджу там, як ёлуп, на розных там геаметрыях. Памятаеш, як у пятроўскія часы казалі: «Богомерзостен пред господом богом всяк, любяй геометриу».

Вядома, значна лепей было б зараз шпацыраваць па бульвару з асобай, пра якую зноў-такі продкі казалі: «Нагами намизающа, вачыма играюща. Завесила вушы камением другим и не слухае слова божага».

Але гэта ўсё пакуль што толькі мара. Пакуль што існуюць лаянкі, спрэчкі і іншыя пастылыя эксэсуары настаўніцкай нівы і фразы з твораў накшталт: «Пьера женили на Элен, но он сам не понимал: зачем это». Або: «Плюшкин был прорехой в теле человечества, опустился до такой степени низости, что нельзя было различить, мужчина он или женщина».

Дасылаю табе сваіх «Калумбаў» а ты мне дашлі свайго «Левітана», рэч патрасаючую. Не бойся, Інстытут Прыстойных Людзей імя Берыя нядаўна зачынілі, «перепроизводство», а то былі б мы там кандыдатамі з табою.

Я, браце, таксама часта прыпамінаю нашу кароткую і такую добрую сустрэчу. Застаецца яна мне як адзін з лепшых успамінаў. І думаю, што гэта не апошняя сустрэча. Прывітанне тваёй сімпатычнай сяброўцы ад аршанскага барсука. Хай не думае, што я такі непрыгожы. Шыя мая прайшла, і я зараз гожы, тоўсты парніша.

Ну, паціскаю лапу. Дасылай верш. Твой Уладзімір».

Канверт не захаваўся. На лісце даты няма. Думаю, што гэта чэрвеньскае пісьмо, магчыма, напісанае ў часы сядзення на школьным экзамене.

Як бы там ні было, але ўжо праз некалькі дзён я чытаў напамяць сваім знаёмым яго верш, у якім было сто восем радкоў.

Толькі зусім нядаўна верш побач з іншымі з рукапісаў, якія захоўваліся ў сястры пісьменніка Наталлі Сямёнаўны Кучкоўскай, у сяброў і знаёмых, быў апублікаваны ў «ЛіМе». На маім лістку-арыгінале ёсць строфы, якія ў друк тады не трапілі. Гэта шаснаццаць радкоў пачатковых (праўда, пасля іх рукой аўтара пазначана: «Верш пачынаецца адсюль») і яшчэ дванаццаць радкоў перад апошняй страфой, якія потым увайшлі ў Збор твораў У. Караткевіча. Вось яны:

Мядзведзі лечацца травамі горкімі,
Шукаючы дзікі часнок на лузе,
Павук-серабранка ў гняздо пад чаротамі
Носіць паветра дзецям пад пузам.

А вы льецё па чужому слёзы,
Забыўшы радзімы простыя кветкі,
І любіце вершы ёлупаў розных.

Вядома, свінню прыцягвае сметнік.
Маю радзіму, маю зялёную,
Забыць і ў разрад нецікавых сунуць?
Мала вам плюнуць у твары сонныя.
Чакайце! Яшчэ калі-небудзь плюнуць!..

І пасля гэтага ўжо вядомая, апублікаваная страфа-канцоўка:

А я ў народ мой заўсёды веру,
І для яго, як вопытны кормшчык,
Адкрыю найлепшую ў свеце Амерыку
(Вёску Амерыку, што пад Оршай).

Праз год, калі выйшаў першы зборнік вершаў Уладзіміра, я паслаў яму тэлеграму: «Нават сто паэтаў ускладчыну не напішуць «Душу матчыну».

Мінулі гады. Напярэдадні святкавання тысячагоддзя Віцебска ў аўтобусе, які вазіў па горадзе пісьменніцкую групу, ён раптам спытаў: «А ты помніш тую тэлеграму?»

Вядома, я помніў і тэлеграму, і нашу першую сустрэчу, якая назаўсёды засталася ў сэрцы.

Давід СІМАНОВІЧ.
г. Віцебск.

«ЛЮБІЦЕ ЯГО!..»

У 1984 годзе, у апошні дзень сакавіка, я наведаў у бальніцы свайго сябра-журналіста, які пад той час хварэў.

Мы пасядзелі ў вестыбюлі, пагаварылі, абмяняліся навінамі, а тады сябар і кажа:

— Ведаеш, тут жа, у суседняй палаце — Уладзімір Караткевіч. Вельмі хворы, але бывае яму часам і лепш...

— То, можа, зойдзем да яго?..

— Пачакай, я схаджу, пацікаўлюся, як ён пачувае сябе...

І не паспеў ён заглянуць у палату, як адтуль пачулася зычлівае:

— Хлопцы, заходзьце!..

Уладзімір Караткевіч падняўся з ложка, павітаўся і прапанаваў сесці. У палаце было два ложкі, але другі быў не заняты, і два табурэты. У кутку — завялы букет нейкіх кветак.

Мы прыселі, і Уладзімір Сямёнавіч апярэдзіў маё пытанне наконт лячэння, распавядаў:

— Заўтра, у аўторак, выпісваюся. Надакучылі ўсе гэтыя таблеткі, аналізы і працэдуры...

Выглядаў ён блага, твар бледны, пад вачамі мяшкі і цёмныя кругі, але на хваробу не жаліўся, стараўся трымацца, нават жартаваў.

Зайшла гаворка пра першакрасавіцкія жарты, розыгрышы-падманы. Я заўважыў, што неяк звяртаўся да знаёмых (да настаўніка, журналіста, пісьменніка), але так толкам і не даведаўся, адкуль пайшла гэтая завядзёнка.

— Можа ты, Валодзя, ведаеш?..

Ён адмахнуўся:

— Я таксама любіў гэтыя жарты-жарцікі. Адкуль жа пайшло тое, чорт яго ведае...

Размова зайшла пра жыццё, пра моладзь, якая ўступае на самастойную дарогу жыцця, але ёй бракуе самастойнасці, асабістай адказнасці за справу, якую маладыя сабе выбіраюць.

— Многа развялося такіх «дзеячаў» і ў літаратуры, — дзеліцца сваімі развагамі Караткевіч. — Ёсць яны і ў рэдакцыях, у выдавецтвах — людзі, якія не маюць на гэта здольнасці, толькі гробяць добрыя намеры іншых, здольных і таленавітых. Гэтыя «лычнасці» бяруцца за ўсё, што ім прапануюць, а тады з лёгкасцю неймавернай справу заваляць. Вось, скажам, пастаўце мяне на пасаду старшыні райвыканкома, я не пайду, бо ведаю, што не па мне воз. Я раблю сваё, тое, што ўмею; як там ужо раблю, добра ці дрэнна, ці пасрэдна, але я лічу, што гэта мая, богам наканаваная справа. Я раблю яе чэсна і бачу аддачу. Майстэрства перш за ўсё, што робіш, за што бярэшся...

Мне хочацца быць першым, няхай працаваў бы ў вёсцы ці яшчэ дзе, але першым. Другарадная роля і становішча другой ролі мяне не задавальняюць. Я хачу быць майстрам, і гэтага дабіваюся ў сваёй рабоце...

...У палаце пасядзелі мы хвілін дваццаць, а можа, больш, з паўгадзіны. Уладзімір Караткевіч усё гаварыў, прыгадаў свае паездкі па Прыпяці, вандроўкі на Палессе. Адчувалася, што яму цяжка змагацца з хваробай, якая адбірала бязлітасна сілы, але ён трымаўся, стараўся быць на ўзроўні.

Мабыць, яны— суседзі па палаце, сустракаліся, часта гаварылі. Мой таварыш нагадаў цяпер пра аўтограф на кніжцы, якую прынёс. Караткевіч іранічна ўсміхнуўся і ў жартоўным тоне сказаў:

— Дзівак ты, Дзянісавіч, навошта так мой аўтограф табе?.. Зусім гэта непатрэбная рэч, лухта. Непатрэбшчына!..

Уладзімір Караткевіч цёпла з намі развітаўся, падзякаваў шчыра, што наведалі, і напаследак сказаў: «Рад бачыць вас, хлопцы, у добрым здароўі...»

Развітваючыся, я глянуў яму ў твар і ўбачыў — у яго сумных вачах неадступна стаяў вялікі боль.

Пасля я неяк спытаў у Дзянісавіча пра той аўтограф, і ён мне адказаў:

— Так, аўтограф ад Уладзіміра Караткевіча я маю на яго кніжцы «Нельга забыць» і берагу яе як памятку пра выдатнага нашага беларускага пісьменніка і цудоўнай душы чалавека!..

У тым жа 1984 годзе, менш як праз чатыры месяцы, на пяцьдзесят чацвёртым годзе жыцця, 25-га ліпеня, Уладзімір Караткевіч памёр. На жалобнай паніхідзе-развітанні выступілі: Янка Брыль, Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч. Яны вельмі прачула і з душэўнасцю гаварылі пра Уладзіміра Караткевіча —выдатнага пісьменніка і мужнага грамадзяніна сваёй бацькаўшчыны — Беларусі.

Васіль Быкаў нагадаў, што ўсе мы, яго таварышы, нясём віну перад гэтым слынным і мужным сынам беларускага народа. Бо мы не ўмелі ці не хацелі ацаніць яго пры жыцці. І закончыў сваё жалобнае слова запаветам «Любіце яго!..»

...Я пішу гэты расповяд-успамін і як наяве бачу жывога Валодзю Караткевіча — рослага блакітнавокага прыгажуна з русявай непакорлівай чупрынай. Яна ўвесь час спадае яму на чысты пакаты лоб, калі Валодзя расказвае нешта смешнае ці чытае свае новыя вершы ў рэдакцыі часопіса «Маладосць». Тут яго я ўбачыў першы раз, калі ён адразу пасля прыёму ў 1957 годзе ў члены Саюза пісьменнікаў, здаецца, з Міколам Аўрамчыкам, завітаў у рэдакцыю.

Сцяпан КУХАРАЎ.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Сын сініх рэк— Дняпра і Палаты

Фрагменты з паэмы

Ты ад Хрыста святога,
Што ў Гародні
Быў прызямліўся,
Ад Машэкі ты.
З душой ерэтыка
высакароднай
Сын сініх рэк —
Дняпра і Палаты.

Вятры ішлі
Не на лясы сухія,
Выпальвалі жыты
Наўсцяж сабой.
А над табой
Схілялася Сафія —
Вякоў абраннік —
Полацкі сабор.

Мінулага
Віднеліся абрысы,
Калі ганяў
Даўжэзныя плыты,
Што, як і камень
Княжыча Барыса,
Упарта вытыркалі
З Палаты.

І там,
Куды нясуць даніну рэкі,
Ты адчуваў
На маладых вірах —
Праз сэрца шлях ішоў
З вараг у грэкі,
І з грэкаў зноў вяртаўся
Да вараг.

Ты сын свайго стагоддзя
І Радзімы,
Хоць жыў нібыта
Ў іншыя часы.
Ды не кажу я —
Кіеўскі Уладзімір.
А ты — Уладзімір
Белае Русі.

Рабіў ты справу
З волатным размахам.
Яе іржа і сёння не бярэ.
Цяжэй, відаць,
Ад шапкі Манамаха
Быў твой прасцецкі
Выцвілы берэт.

Ты не баяўся
Ні крыві, ні бруду.
І там, дзе легла
Споведзі вярста,
Ішоў ты смела
Ад Хрыста да Брута,
Ад Брута зноў вяртаўся
Да Хрыста.

Сягаючы
Аж да цара Гароха,
Піў водар дапрыгоннай
даўніны.

А ў снах трывожных
Бачыў катастрофу,
Агонь і попел
Ядзернай вайны.

Бяздоннем час
Нікольні не палохаў,
Святло загадкі дзіўнай
Не гасіў.
Сабраўшы ў душы
Усе эпохі,
Іх боль пякельны,
Нібы свой, насіў...

Славянства!
Хіба гэта клан ці каста?
Праз часу і праз далечы
смугу
Душою ты ірваўся да
славянства.
Славянства — да цябе
У сваю чаргу.

У зрэнках
Гневу тоячы іскрыну
І ненавідзячы нягод уціск,
З табою поплеч
Уставаў Скарына,
Па радаслоўнай —
Прадзед твой Францыск.

І генерал
Парыжскае камуны
Дамброўскі
У эпох на скразняку
Табе з усмешкай
Маладой і юнай
Як аднаверцу
Падаваў руку.

Не мог ты перад хіжымі
Згінацца,
Замоўкнуць у тузе
Ды у нудзе.
Барацьбіты,
Асветнікі,
Змаганцы
Цябе не пакідалі
Анідзе.

Вачэй святлістых
Маладымі шыбамі
Пасля, нібыта ў сне,
І — неўспадзеў,
Здаецца, з-пад ачэсанае
Шыбельні
Ты з Каліноўскім
У вякі глядзеў.

І адчуваў,
З якой нястрымнай сілай
Вакол цябе
З усіх, як ёсць, бакоў
Кружыліся ў сузор'ях
Небасхілы
Славянства і пабуджаных
Вякоў.

Ці ёсць выйсце з лабірынта?

Праблемам музычнага выхавання і асветніцтва, адраджэння духоўнай культуры ў грамадстве «ЛіМ» аддае нямала ўвагі. Напрыклад, на публікацыю ліста чытачкі І. Пракапенкі «Збеднена ўсё наша грамадства...» [гл. нумар за 27.04.90 г.] адгукнуўся старшы выкладчык БДК А. Селачнік [«Што ж здарылася з музычнай культурай!», 3.08.90 г.]. Затым свае нататкі ў «ЛіМ» даслаў гродзенскі музыкант У. Лябецкі [«Чаго мы вартыя— без культуры!», 17.08.90 г.]. Сёння да размовы далучаецца музычны каментатар Беларускага радыё, вядучая папулярнай праграмы «Моладзі пра музычнае мастацтва» І. Мільто.

«У перыяд крызісаў уяўленне важнейшае за веды».

А. ЭЙНШТЭЙН.

ВЫНІКІ мы ўжо маем. Сумныя вынікі. Тое, наколькі нізкі сёння культурны і духоўны ўзровень нашага грамадства, думаю, тлумачыць няма патрэбы. Аднак мінулы час не вярнуць, духоўна страчаныя пакаленні на сумленні тых, хто доўгія гады вёў нас у «светлае заўтра». А трэба жыць далей. Якія ж у нас сёння арыенціры?

...Грымнула перабудова. Калі яна — не чарговая часовая кампанія, дык якая з неадкладных задач павінна была прыцягнуць увагу ўрада ледзь не ў першую чаргу? Здавалася, тут і пытанняў няма: вядома, рэвалюцыя ў школе, у выхаванні моладзі, калі думаць пра будучыню! Бо ніякія палітычныя і эканамічныя рэформы не запрацуюць, калі тыя, хто павінен іх ажыццяўляць, маюць нізкі культурны, духоўны, маральны ўзровень, не здольныя працаваць сумленна і творча.

Відаць, памылкова лічыцца, што спярша чалавека трэба накарміць, а потым ужо гаварыць і пра нешта больш высокае. Аднак і цяпер у нас ёсць «групы насельніцтва», якія і каўбасу заўсёды маюць, і апранаюцца ў імпарт, і відэатэхніку прыдбалі, ды нешта не прыбаўляе ім гэта ўсё ні сумлення, ні духоўнасці, ні творчага натхнення ў справах на карысць радзіме. Значыць, прыярытэт (матэрыяльнае) абраны не той, значыць, справа не толькі ў сытасці. Клапаціцца трэба пра гарманічнае развіццё чалавека, які, паеўшы, яшчэ і задумаецца, як удасканаліць сябе і навакольнае жыццё, каб не толькі самому лепш было. І без эстэтычнага выхавання нам не абысціся, калі мы хочам развівацца далей як цывілізаванае грамадства, а не скаціцца да ўзроўню варварскага.

Дык што рабіць, з чаго пачынаць?

Спярша мой погляд на праблему эстэтычнага выхавання моладзі быў даволі ідэалістычны. Думалася: усім ясна, што айчына ў небяспецы. А пакуль спадзявання на змены ў нашай школе няма (бо яе рэформа аказалася чарговай фікцыяй), дастаткова актывізавацца творчай інтэлігенцыі, пайсці ёй у народ, у школы, дзіцячыя дамы, інтэрнаты, змяніць формы работы з дзецьмі ў нашых музычных асяродках — філармоніі, оперным тэатры, — і штосьці, маўляў, ужо зараз можна палепшыць. Аднак калі я сутыкнулася з практыкамі, людзьмі, якія працавалі з дзіцячай аўдыторыяй і добра ведаюць яе, пачала раіцца з імі, дык спадзяванне на хуткае вырашэнне праблемы аддалілася, бы лінія гарызонта. І справа не ў тым, што ў нас абыякавая творчая інтэлігенцыя, не. Ёсць нямала энтузіястаў, светлых асоб, якія бескарысліва згодныя займацца з дзецьмі, спрабаваць адкрыць ім свет мастацтва. Але чым гэта заканчваецца ў рэальнасці?

Добра, калі сустракаецца такі дырэктар школы або дзіцячага дома, які разумее важнасць эстэтычнага выхавання, удзячны энтузіястам, стварае ўмовы для іхняй працы (як гэта, напрыклад, сталася ў музыказнаўцы В. Сізко, якая 13 гадоў таму наладзіла музычны лекторый у Навадворскай вясковай школе з політэхнічным ухілам). А калі здарыцца так, як у кампазітараў Э. Тырманд і Г. Гарэлавай, якія ад душы імкнуліся дапамагчы дзіцячаму дому, хадзілі да дзяцей штомесяц, гутарылі з імі пра музычнае мастацтва, ладзілі канцэрты з вядомымі беларускімі выканаўцамі, і дзеці добра прымалі іх. А потым змяніўся дырэктар дома—і іх энтузіязм стаў непатрэбны. Або згадваю свайго брата, таксама музыканта, што некалькі гадоў запар спрабаваў наладзіць гутаркі пра мастацтва ў школе, дзе вучылася ягоная дачка,— і ні дырэктар, ні настаўнікі не маглі зразумець: навошта гэта, ды яшчэ чамусьці бясплатна...

Значыць, вырашэнне праблемы — не ў асобных акцыях энтузіязму...

Можа, адпаведныя асяродкі — музычныя тэатры, філармонія з іх моцным комплексным эмацыянальным уздзеяннем на юнага слухача-гледача здатныя вырашыць праблему?

Я гутарыла з тымі творчымі супрацоўнікамі гэтых устаноў, якія маюць практыку работы з дзіцячай аўдыторыяй.

Якія ж высновы зрабіла я, напрыклад, пасля сваіх сустрэч у закуліссі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета?

Казаць, што тут нічога не робіцца ў выхаваўча-асветніцкім кірунку, нельга. Ёсць, хоць і небагата, дзіцячыя спектаклі, тэатр праводзіў цыкл «Опера — дзецям», які ўключаў розныя формы працы: наведванне школ з паказам урыўкаў з опер і расказам пра іх, знаёмства дзяцей з рэпетыцыйным працэсам, дзе перад імі выступалі рэжысёры і артысты. І што ў выніку? Каэфіцыент карыснага дзеяння гэткіх акцый вельмі малы. Дзецям цяжка ўспрымаць паказ опер фрагментамі, бо гэта вымагае абстрактнага мыслення, звычкі да якога ў іх няма. Настаўнікі ж, калі іх запрашалі з дзецьмі на рэпетыцыі (бо тэатру здавалася, што рэпетыцыйны працэс цікавы для чалавека недасведчанага), абураліся: як гэта — ім паказваюць спектакль не ў касцюмах і без дэкарацый!

І тут высвечваецца адна з важных праблем: адсутнасць культуры ў асяроддзі пасрэднікаў паміж тэатрам і дзецьмі. Паглядзіце, што робіцца на дзіцячых спектаклях! Як паводзяць сябе школьнікі! Настаўнікі павінны ў школе рыхтаваць дзяцей да наведвання спектакля, а яны самі часта не любяць і не ведаюць музычнага тэатра. Дый сустракаюцца нават і такія, што... не ўмеюць сябе паводзіць у зале, у фае, у гардэробе. Тое самае, за рэдкім выключэннем, датычыць бацькоў. Прапагандысты-лектары, якія перад спектаклем павінны эмацыянальна падрыхтаваць дзяцей, абудзіць іх фантазію, захапіць моладзь, не заўсёды здольныя цікава зрабіць гэта. Фармальныя ж захады ў такой справе толькі шкодныя, амаральныя.

І яшчэ: хто сочыць за тым, колькі разоў адны і тыя ж школьнікі наведваюць тэатр, ці пастаянная гэта аўдыторыя, ці выпадковая? Статыстыка неабходная, каб ведаць вынік працы тэатра.

У працы з дзецьмі вельмі патрэбная сістэма, бо аднаразовасць, выпадковасць далучэння да мастацтва нічога не даюць. Нават калі зерне кінута ў глебу, але яго не паліваць, не пеставаць, зерне не прарасце. Тое ж — і ў працы тэатра з дзецьмі.

Увогуле, усе быццам ведаюць, што для дзяцей усё мае быць самае яркае, шчырае. А што на справе? Школьнікам часта даюць білеты на дрэнныя спектаклі, такім чынам адштурхоўваюць іх ад тэатра. У сваю чаргу і тэатр павінен ладзіць усе спектаклі на высокім якасным узроўні, бо без адпаведнай якасці немажліва весці прапаганду мастацтва сярод моладзі.

А зрэшты (пачула я і такое меркаванне), эстэтычнае выхаванне школьнікаў не самая галоўная задача Вялікага тэатра оперы і балета. Такому гораду, як Мінск, патрэбны паўнацэнны дзіцячы музычны тэатр са сваёй прадуманай праграмай па эстэтычным выхаванні на некалькі гадоў, са сваім арыгінальным рэпертуарам — абавязкова творамі найвышэйшай якасці з вельмі сур'ёзным падыходам да стварэння дзіцячага спектакля. Але гэта вымагае вялікіх грошай. Якасці не будзе, калі думаць: дзіцячы спектакль можна стварыць хутчэй, лягчэй, танней.

Пры ДАВТе БССР нядаўна адкрылася дзіцячая оперная студыя. Будзем спадзявацца, што з цягам часу яна дадатна паўплывае на эстэтычнае выхаванне маладых гледачоў, сістэмы якога ў тэатры пакуль няма. А ці ёсць яна ў філармоніі?

ШТО Ж, Беларуская дзяржаўная філармонія быццам бы стала робіць справу па эстэтычным выхаванні школьнікаў. Паглядзіце, колькі абанементаў для маладых слухачоў у кожным сезоне! Па нядзелях канцэрты-лекцыі з арыгінальнымі назвамі, іх вядуць кваліфікаваныя штатныя музыказнаўцы. Дзе ж вынік гэтай шматгадовай работы? Чаму філарманічная зала на вячэрніх канцэртах часцяком амаль пустая? Ці не значыць, што ўсе тыя лекторыі для школьнікаў не рыхтуюць пастаяннага слухача і каэфіцыент карыснага дзеяння ад іх мізэрны?

Я звярнулася да вядомага лектара-музыказнаўцы БДФ М. Казініка, які мае вялікі вопыт працы з маладзёжнай аўдыторыяй, умее яе зацікавіць. Вось што ён сказаў:

— Перадусім, я лічу, філарманічная зала — не месца для выхавання, хаця не адмаўляю, што філармонія павінна мець некалькі сваіх невялікіх залаў, у якіх бы па сваім плане ажыццяўляла праграму эстэтычнага выхавання юнацтва. Наведванне ж вялікай філарманічнай залы—гэта свята. Гэтаксама лічу, што «Маладзёжны музычны клуб», які я вяду некалькі гадоў,—не лікбез, а дыскусійная форма зносін са слухачамі.

Чаму пуста на канцэртах? Тут далёка не заўсёды вінаватыя слухачы, іх нізкі культурны ўзровень. Паглядзіце на нашу афішу—якое абмежаванае кола выканаўцаў, як нецікава фарміруецца рэпертуар! Ды і закасцянелая форма канцэрта, што дагэтуль існуе, даўно ўжо вычарпала сябе. Гэтага толькі не разумеюць ці не могуць зразумець адказныя за канцэртную справу. Хутчэй за ўсё—не могуць, бо сам працэс адукацыі ў нашай кансерваторыі, ды і не толькі ў кансерваторыі, а і ў музычным вучылішчы, музычнай школе пабудаваны так, каб забіць жывыя адносіны да музыкі. Ці шмат вы сустрэнеце выхаванцаў нашых музычных устаноў, якія б сваім палымяным словам маглі настроіць аўдыторыю на ўспрыманне складанай музыкі, якія б маглі напісаць цікавы артыкул ці перадачу, якія б любілі музыку, адчувалі яе эмацыянальна і маглі заразіць гэтай любоўю тых, хто не ведае музычнага мастацтва? Думаю, нямнога такіх музыкантаў. А калі яны ёсць, дык не дзякуючы кансерваторыі, а наперак ёй, дзякуючы сваёй асабістай зацікаўленасці, неабыякавасці.

Прадбачу абурэнне многіх музыказнаўцаў, яны часта папракаюць мяне ў залішняй эмацыянальнасці, дылетантызме. Але я лічу, што галоўнае—эмацыянальна падрыхтаваць слухача да ўспрымання музыкі, зацікавіць яго, настроіць яго душу на высокую хвалю мастацтва. Практыка паказвае, што гэты шлях апраўдвае сябе. Сведчанне таго—тысячы пісьмаў ад слухачоў, што я атрымліваю з розных куткоў нашай краіны, дзе выступаў з гутаркамі. Галоўнае, я лічу, як мага больш людзей далучыць да мастацтва.

Што ж да дзейнасці многіх нашых музыказнаўцаў, дык часта, калі я чытаю іхнія навуковападобныя артыкулы, думаю: каму яны патрэбныя? Слухачам? Не. Кампазітарам?—Таксама не. Дык каму? Відаць, самім жа музыказнаўцам. Атрымліваецца нейкае заганнае кола, з якога выбіты СЛУХАЧ—самае галоўнае. Дарэчы, напрыклад, у ЗША увогуле няма такой прафесіі — «музыказнавец». Ёсць гісторык мастацтва, прапагандыст музыкі, рэдактар выдавецтваў, радыё і тэлебачання.

Проціпастаўленне кансерваторыі і музыкантаў-практыкаў накшталт мяне (прабачце за такую дзёрзкасць, але гэта вельмі важная, характэрная з'ява не толькі для мяне, таму і гавару) нагадвае мне канфлікт Моцарта і Сальеры — музычнага ВЫХАВАННЯ і музычнай АДУКАЦЫІ. Помніце, у трагедыі Пушкіна Моцарт радуецца таму, што скрыпач, хаця і няўмела, найграе ягоную тэму, а Сальеры жахліва абураецца — ён жа так фальшыва граў! Моцарт АДЧУВАЕ музыку (у дадзеным выпадку — шчырасць народнага музыкі), а Сальеры ацэньвае яе як халодны эксперт, жрэц музычнай адукацыі.

Я прыгадваю, як аднойчы ў далёкай беларускай вёсцы пасля нашай гутаркі-канцэрта, дзе выконвалася Арыя альта са «Страсцей паводле Матфея» І.-С. Баха, плакалі дзве бабулі, узрушаныя музыкай і словам пра яе. Лічу, што яны значна бліжэйшыя да ўспрымання мастацтва за многіх студэнтаў БДК...

У рэшце рэшт, гэта ўсё пра тое ж, чаму пустуе зала філармоніі...

Я лічу, што філармонія не можа цалкам вырашыць пытанне эстэтычнага выхавання моладзі. Пытанне вельмі складанае і не вырашыцца да тае пары, пакуль мы не зажывём па законах цывілізаванага грамадства. А што можна было б зрабіць зараз?

Усе праблемы ўпіраюцца ў школу. Музыкай павінна быць напоўнена выкладанне ў школе. І справа, лічу, не толькі ў збалансаванасці фізікі, матэматыкі і літаратуры, музыкі, а і ў тым, што на ўроках і літаратуры, і гісторыі, і фізікі, і матэматыкі музыка павінна выкарыстоўвацца як мацнейшы эмацыянальны сродак уздзеяння. Калі б на ўроку літаратуры, напрыклад, пры тэме «Пушкін» уключалі фрагменты з опер Чайкоўскага або на ўроку фізікі гаварылі, што Эйнштэйн быў цудоўным музыкантам, карысць была б і для засваення саміх немузычных прадметаў. (Чаму я раблю акцэнт на музыцы? Вядома ж, што менавіта яе больш за ўсё любіць моладзь, яна найбольш уплывае на фарміраванне асобы). Але для гэтага патрэбны НАСТАЎНІКІ! Ужо зараз набор у педагагічныя інстытуты павінен быць іншы. Паглядзіце, які культурны ўзровень студэнтаў педінстытутаў! Помню, як мы былі ў адным калгасе з канцэртам, дзе выконвалася музыка Вівальдзі. У той жа час там «рабілі на бульбе» студэнты Мінскага педінстытута, і ніхто, ніводзін з іх (!) не наведаў гэты бясплатны канцэрт. Няма патрэбы ў высокім мастацтве, няма інтэлігентнасці, дык які ты будзеш настаўнік?!

Пакуль цяжкая машына нашай адукацыі развернецца, мы, відаць, страцім яшчэ не адно пакаленне. Таму я прапаную рэальную, на мой погляд, меру, якая можа запрацаваць ужо зараз, якая не вымагае многа грошай, — гэта стварэнне ў кожным горадзе Дома музыкі. Паспрабую растлумачыць. Я не веру, што ў бліжэйшыя сто гадоў вырашыцца пытанне музычнай адукацыі, пачынаючы з дзіцячага сада. Але ёсць група моладзі, якую можна назваць групай павышанай рызыкі, — падлеткі 13—15 гадоў, старшакласнікі — самы цяжкі ўзрост. Ім неабходна падтрымка, увага, дапамога і яны так цягнуцца да музыкі, але ў асноўным да эстрады, рок-гуртоў. Дык вось іх, старшакласнікаў, у гэтым Доме музыкі «шокавай тэрапіяй», рэзкім эмацыянальным уздзеяннем можна прыцягнуць да сапраўднай высокай музыкі. Трэба прапускаць праз гэты Дом УСІХ старшакласнікаў, даць ім ШАНЦ пазнавання. У выніку няхай з тысяч школьнікаў сур'ёзнай музыкай зацікавіцца 10 %—і то добра. А многія ж з іх жывуць і нават не падазраюць, які цудоўны свет побач. Трэба ім дапамагчы, зацікавіць, даць літаратуру, методыку пашырэння ведаў, а там няхай вырашаюць самі.

У маёй практыцы было шмат выпадкаў, калі пасля канцэрта падыходзілі маладыя слухачы і гаварылі: вы зрабілі пераварот у нашай свядомасці, чаму нам раней пра гэта ніхто не расказваў?

Наша задача — даць шанц выбару УСІМ! Для гэтага не так ужо многа і трэба: невялікае памяшканне з утульнай залай і пакоем для фанатэкі, стэрэапрайгравальнік і магнітафон, праектар для слайдаў. Хто дапаможа сродкамі, хто адгукнецца? Ёсць у нас такія людзі? Камсамол усе сілы кінуў на рок-музыку. Музычнае таварыства... Пакуль таксама не відаць сістэмы ў яго дзейнасці. Ды і наконт грошай—на жаль, у нас хутчэй знайсці спонсараў на конкурсы прыгажунь, не тых, хто гучней крыкне, чым на школу, на дзяцей...

НАРЭШЦЕ, я зацікавілася высновамі вучонага-псіхолага Л. Навіцкай. Яны гучаць пераканаўча:

— Без музыкі, без эстэтычнага выхавання ў школе. ВНУ не абысціся, калі дбаць пра выхаванне ініцыятыўнай, творча актыўнай асобы, якая, хочацца думаць, неабходная нашаму грамадству. Дык вось, як ні парадаксальна, з павелічэннем заняткаў у студэнтаў, з увядзеннем новых прадметаў у школьнікаў чалавек не робіцца разумнейшы, а здольнасць да ТВОРЧАГА мыслення ў яго катастрафічна падае, стан стомленасці, нежадання думаць пераходзіць у звычку.

Каб мець паўнацэннага, карыснага члена грамадства, у навучанні неабходны баланс паміж знакава-лічбавай (прадметы тыпу фізікі, матэматыкі, хіміі) і вобразнай (літаратура, музыка, жывапіс, пластыка) інфармацыяй. Гэты баланс, на жаль, парушаецца ва ўмовах дынамічнага развіцця НТР. Непамерны рост знакавай інфармацыі стварае пагрозу парушэнню сістэмнасці працы двух паўшар'яў мозгу.

Інфармацыйная хваля апаноўвае падрастаючае пакаленне, яго мозг захлынаецца, пра што сведчыць ЗНІЖЭННЕ функцыянальнага стану мозгу ў нашых школьнікаў. Стэрэатыпнасць інфармацыйных паведамленняў на занятках стварае ўмовы, якія спараджаюць хваравітасць, стомленасць мозгу. Але я думаю, што нам больш неабходны такія ўмовы, пры якіх працэс мысліцельнай дзейнасці быў бы аптымальны, калі чалавек самастойна можа творча засвоіць матэрыял любой складанасці. Тут патрэбна збалансаванасць паміж знакавым і вобразным зместам навучання, калі, напрыклад, два ўрокі матэматыкі балансуюцца двума ўрокамі музыкі і жывапісу, што ідуць пасля. Гэта неабходна для выхавання не робата, які стэрэатыпна мысліць, а ініцыятыўнай творчай асобы. Таму не дзіва, што для засваення багацця знакавай інфармацыі, той жа фізікі, матэматыкі, трэба актыўна вывучаць мастацтва: і музыку, і жывапіс, і пластыку.

На Захадзе гэта зразумелі даўно. Невыпадкова ў Японіі ўрокі музыкі праводзяцца з першага па апошні класы, у ЗША ў многіх тэхнічных ВНУ павялічваюць долю курсаў гуманітарнага цыкла і г. д., бо разумеюць, што інжынер з развітым вобразна-эмацыянальным мысленнем дасць грамадству значна больш.

ЦЯЖКА нараджаўся гэты артыкул. Калі я паспрабавала асэнсаваць нашу сістэму эстэтычнага выхавання моладзі, дык быццам адчула сябе ў лабірынце і часта заходзіла ў тупік. Колькі тут бессэнсоўнасці і проста абсурд! А, можа, прычына — ў адсутнасці сістэмы? Ці не таму і тут, як амаль усюды ў нас, галоўнае — не разумная канчатковая мэта, а сам працэс, не якасць, а колькасць? Безумоўна, і ў Міністэр-

стве культуры, і ў Міністэрстве народнай адукацыі БССР заклапочаны вырашэннем праграмы эстэтычнага выхавання. Але на што накіраваны намаганні і сродкі, прычым немалыя? Ну, скажам, на павелічэнне колькасці музычных школ. Навошта? Калі там будзе весціся справа так, як яна вялася дагэтуль?! Калі большасць дзяцей выходзіць з такіх школ, ненавідзячы музыку, і да музычнага інструмента ўжо не падыходзіць да канца жыцця? Лепш бы тыя сродкі выдаткаваць на рэальнае паляпшэнне справы музычнага выхавання.

Я падзяляю меркаванне, якое ўжо выказвалася ў публікацыях «ЛіМа»: у музычных школах павінны вучыцца толькі таленавітыя дзеці, сетку ДМШ трэба нават скарачаць. А вось у агульнаадукацыйных школах зрабіць музыку такім жа важным прадметам, як літаратура, матэматыка, фізіка з выкладаннем з першага па апошні класы. Іншая справа — як выкладаць музычную літаратуру, якія патрэбны настаўнікі?

Пагаворым і пра гэта.

На Беларусі выкладчыкі, настаўнікі музыкі (пазначу ўсе прадметы музычнага цыкла адным гэтым словам) — выхаванцы, у асноўным, музычна-педагагічнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. (Сярэднія спецыялізаваныя навучальныя ўстановы паўтараюць іх накіраванасць).

Задумаемся, на што скіравана дзейнасць кансерваторыі? У чым яе сэнс?

Тут рыхтуюць салістаў-выканаўцаў, з якіх 99% ніколі не будуць салістамі; музыказнаўцаў-навукоўцаў, большасць з якіх на развіццё навукі ніяк не ўплывае; харавікоў-дырыжораў, якія чамусьці ніяк не ўздымуць прэстыж харавой справы ў рэспубліцы; выкладчыкаў музыкі, якія не ведаюць ні дзіцячай, ні падлеткавай псіхалогіі, не валодаюць ні рыторыкай, ні методыкай выхавання. А ўсе разам ніяк не ўплываюць на павышэнне культурнага ўзроўню моладзі ў прыватнасці і народа ўвогуле, ніяк не спрыяюць стварэнню высокай духоўнай атмасферы ў грамадстве. Безумоўна, БДК мае шэраг дасягненняў, цікавых выпускнікоў, але тут гаворка ідзе пра агульную скіраванасць, уплывовасць яе дзейнасці. І хаця ў кансерваторыі ёсць і рэдактарская практыка, і метадыка, і псіхалогія — усё гэта для «птушкі». Пра гэта адкрыта амаль не гавораць, а, можа, нават і не надта думаюць, але вынік навучання, у асноўным, менавіта такі.

Калі сумленна задумацца, дык увесь гэты навучальны працэс з ягонымі вынікамі пакажацца глыбока амаральным, трэба пра гэта крычаць, а мы ўсе спакойна жывём і штампуем бясплодных музыкантаў. Калі ўлічыць, што яркіх талентаў у прыродзе мала, дык дзеля чаго вучыць паводле закаснелай схемы астатніх? Цяпер, як ніколі, патрэбныя асветнікі. прапагандысты мастацтва. Бацькаўшчына ў небяспецы — бездухоўнасць, абыякавасць агарнула значнае кола моладзі, а «носьбіты духоўнай культуры» жывуць, нібы ў колбе, далёкія ад усіх працэсаў у грамадстве...

Педагагічны інстытут таксама выпускае спецыялістаў, не вельмі падрыхтаваных да жывой працы ў агульнаадукацыйнай школе.

Звярніце ўвагу на тое, што кажа спецыяліст, загадчык кафедры Мінскага педагагічнага інстытута Н. Грышановіч:

— Я ўпэўнена, што патрэбна РЭВАЛЮЦЫЯ ў музычнай адукацыі. Нас душыць акадэмізм, няправільнае разуменне прафесіяналізму. У нас, выкладчыкаў розных музычных дысцыплін, няма ўмення працаваць адзіным фронтам дзеля фарміравання свядомасці, светапогляду студэнта, яго актыўнай творчай і грамадзянскай пазіцыі. Патрэбны рэвалюцыйныя змены, а гэта неспакой, клопат, лепш ціха сядзець і вучыць, як вучылі яшчэ мяне: рабіць стаўку на развіццё памяці, слыху, на веданне біяграфіі кампазітара і г. д. Гэта, безумоўна, лягчэй. А развіваць здольнасць да самастойнага творчага аналізу, каб самому разбірацца ў незнаёмым творы, знайсці асацыяцыі з іншымі з'явамі мастацтва — гэта быццам нікому не патрэбна. Наша навучанне фармальнае, усе музычныя прадметы раз'яднаныя, кожны педагог круціцца ў вузкім коле сваіх праблем. Нам жа трэба выхоўваць студэнта такім чынам, каб ён САПРАЎДЫ РАЗУМЕЎ музыку, мог зрабіць яе сродкам духоўных зносін.

Абсурдныя і нашы навучальныя планы. Падумайце толькі: на працягу ДВУХ курсаў на музычна-педагагічным факультэце трэць часу забірае медыцына! Затое мастацтва ў плане няма, на апошнім курсе толькі каля 30 гадзін даецца «для знаёмства» з нацыянальным мастацтвам!

А як у нас праводзяцца дзяржаўныя экзамены? Як ацэньваюцца студэнты? Яны здаюць кіраванне хорам, экзамен па фартэпіяна, дзе павінны выконваць складаную канцэртную праграму. А простую песеньку падабраць па слыху яны так і не здольныя (практычнае ж жыццё вымагае ад іх часцей менавіта гэтага). Нашы выкладчыкі скасавалі нават такую магчымасць, якая закладзена ў новай праграме, як абарона дыплому па выніках эксперыменту ў школе. Выкладчыкі лічаць гэта немэтазгодным (у педінстытуце!), яны лепш будуць паказваць сваіх студэнтаў з сольнымі праграмамі. Як і паўсюль, праца «на паказ», а не дзеля канчатковага выніку.

Аднак пры ўсіх недахопах у падрыхтоўцы нашых студэнтаў яны ўсе ўжо зараз маглі б весці на прыстойным узроўні ўрокі музыкі ў агульнаадукацыйных школах. Але вось тут мы падыходзім да самага цікавага.

Каля 50 чалавек канчае штогод наш факультэт — гэта нямала. А з іх у школе застаецца чалавек пяць, і тых праз некалькі гадоў менее. Чаму нашы выпускнікі не ідуць у школы? Здавалася б, і зарплату павялічылі, але не ідуць.

Вясковыя школы — малакамплектныя, і настаўнік музыкі не набярэ там стаўку. У настаўніка ФІЗКУЛЬТУРЫ стаўка не залежыць ад колькасці гадзін, а ў музыканта залежыць. Настаўнік-музыкант на вёсцы не пражыве, калі апроч урокаў не «возьме» клуб ці яшчэ штонебудзь.

У гарадской школе іншая справа — гадзіны ёсць аж на дзве стаўкі, і тым не менш сёння ў 16 школах Мінска няма настаўнікаў музыкі! Уцякаюць з гарадскіх школ. І хаця наш інстытут не дае методыку працы ў дзіцячых садах, нашы выхаванцы ідуць лепш туды ці ў школы з музычным ухілам, абы толькі не выкладчыкамі ўрокаў музыкі ў агульнаадукацыйных, дзеля чаго іх рыхтавалі. Парадокс: настаўнік музыкі, які вельмі патрэбны сёння ў школе, не патрэбны самой школе, бо яна жыве старымі ўяўленнямі пра выхаванне, і настаўнікі музыкі... выцясняюцца школай.

Так, дагэтуль яе кіраўніцтва ўвогуле не цікавіцца ўрокамі музыкі. Дырэктары, завучы заходзяць на любыя заняткі, акрамя музычных. Яны — лішнія, хаця гэта адзіная нагода, дзякуючы якой можна эстэтычна выхоўваць чалавека, вучня. У большасці школ, нават сталічных, няма нармальных кабінетаў музыкі з сучаснай радыёапаратурай, з фартэпіяна. Здзіўляюцца, што моладзь захапляецца адно толькі рокам — а што робіць школа, каб пашыраць музычны кругагляд вучняў? Дома школьнікі слухаюць рок-музыку на стэрэаапаратуры ў добрай якасці, а ў школе?

Кабінета музыкі няма, апаратуры, інструментаў няма, педагог-піяніст школе ўвогуле не патрэбны, патрэбны баяніст, акардэаніст, гітарыст, каб мог хадзіць з інструментам па класах і развучваць песні накшталт «Надзеі», «Вальсу аб вальсе», «Песні народнага адзінства» і г. д., «агучваць» школьныя лінейкі. Дырэктару школы патрэбны тапёр, які б правёў ранішнік, вечар, падрыхтаваў нумар для агляду самадзейнасці, развучыў з дзецьмі песні, потым усіх выставіў у хор — чым паболей, — каб тыя гучна пракрычалі песню. Вядома, харавая культура тут адсутнічае, бо ўмоў у школе для сапраўдных заняткаў харавымі спевамі таксама няма.

Як афіцыйна ацэньваецца эстэтычнае выхаванне ў школе? Калі ёсць там музычныя калектывы, якія занялі месца на раённых, гарадскіх аглядах, тады з эстэтычным выхаваннем усё добра. Але хор гэты як творчая адзінка не існуе, гэта фікцыя! І ўрокаў музыкі таксама няма. А ёсць паказуха! Вось дзеля гэтага і падбіраюць дырэктары настаўнікаў музыкі. Не патрэбны тут адукаваныя, высокапрафесійныя кадры. У школах Мінска 50—60% настаўнікаў музыкі не маюць музычнай адукацыі, а спецыялістам месца няма... Такое і стаўленне да самога прадмета, да настаўніка — дыскрымінацыйнае. Калі трэба вучняў зняць з урока, здымаюць не з фізікі, не з матэматыкі, а з музыкі, прычым дасюль у школе ўпарта называюць яго не ўрок музыкі, а «спевы».

Я ўпэўненая, што ў школе ў выкладанні музыкі трэба перанесці акцэнт з пазакласнай работы на вучэбную. Але гэта будзе тады, калі кіраўніцтва — райана, гарана, дырэктары школ зразумеюць важнасць эстэтычнага выхавання, зразумеюць, што без урока музыкі не выхаваць творчай, духоўна багатай асобы, паўнацэннага члена паўнацэннага грамадства. Пакуль такога разумення няма.

Што ж да думкі М. Казініка наконт Дома музыкі, мне здаецца, гэта не вырашыць праблему. Неабходна СІСТЭМАТЫЧНАЕ эстэтычнае выхаванне з шасці гадоў, а то і раней. Дом музыкі не зможа ахапіць усіх старшакласнікаў, яго прапускная здольнасць не зможа быць вялікай. Лепш, на маю думку, захаваць урокі музыкі ў старэйшых класах школы, а да гэтага прыдасца яшчэ і Дом музыкі — вось тады, магчыма, нешта скранецца.

Увогуле, я лічу, тым, хто заклапочаны справай эстэтычнага выхавання моладзі, у каго ёсць канструктыўныя, прагрэсіўныя прапановы, трэба даць магчымасць эсперыментаваць. Напрыклад, стварыць калектыў аднадумцаў з адзінай наватарскай канцэпцыяй, нешта накшталт аўтарскай школы. Даверыць яму па-свойму распрацаваць навучальны план падрыхтоўкі настаўнікаў музыкі, патрэбных СЁННЯ, распрацаваць сваю методыку, даць магчымасць ажыццявіць гэта на практыцы. Чаму музычна-педагагічныя факультэты інстытутаў павінны быць усюды аднолькавыя? Калі б далі дазвол зрабіць свой арыгінальны план нашаму педінстытуту, магчыма, і ў нас знайшліся б творчыя, зацікаўленыя людзі. Хаця зноўтакі школе пакуль яны не патрэбныя...

ПРАБЛЕМЫ, праблемы... Ці ёсць выйсце з гэтага лабірынта? Чаму па-ранейшаму тыя, хто рыхтуе настаўнікаў музыкі, адносяцца да розных міністэрстваў — музычна-педагагічны факультэт да Міністэрства народнай адукацыі, кансерваторыя да Міністэрства культуры? Чаму кожнае з іх распрацоўвае ўсё новыя праграмы, а воз праблем — ні з месца?

Кожны ў сваім замкнёным коле быццам і чэсна робіць сваю справу, а між тым агульны вынік жахлівы: услухайцеся, як гавораць школьнікі, як яны сябе паводзяць, якая ў іх мова — і стане ясна, што да культурнага грамадства нам ой як далёка. Але гэта толькі знешнія праявы бескультур'я. Значна страшней груз духоўных страт — эмацыянальная глухата, безыніцыятыўнасць, абыякавасць, жорсткасць. І калі ўспомніць, якімі большасць дзяцей прыходзяць у школу — жывымі, зацікаўленымі, усхваляванымі, дык трэба прызнаць, што наша таталітарная сістэма выхавання робіць усё, каб не ўзгадаваць індывідуальнасць, асобу, а зрабіць вінцік сістэмы. А машына, тым часам, пачала раскручвацца ды рассыпацца...

Як жа будзем жыць далей?! Магчыма, новы беларускі парламент усё ж зразумее, што першачарговай задачай побач з эканамічнай рэформай павінна быць распрацоўка і прыняцце перспектыўнай канкрэтнай праграмы па адукацыі і эстэтычным выхаванні моладзі, бо тут — пытанне будучыні нашай суверэннай рэспублікі. А пакуль час ідзе, і чым далей мы адкладваем вырашэнне праблем нашага духоўнага жыцця, тым менш спадзяванняў на прасвятленне гэтай будучыні.

Ірына МІЛЬТО.

А ПАКУЛЬ — ВОСЬ ТАК...

Фота А. КЛЕШЧУКА.

БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ

Да выхаду ў свет фальклору беларусаў-перасяленцаў

Інстытут гісторыі, філалогіі і філасофіі Сібірскага аддзялення АН СССР пачынае выданне фальклору народаў Сібіры і Далёкага Усходу. Мяркуецца выдаць 60 тамоў вуснай народнай творчасці як карэнных народаў рэгіёна — якутаў, удэгейцаў, эвенкаў і іншых, так і перасяленцаў — украінцаў, беларусаў, татар, яўрэяў. Для падрыхтоўкі беларускага тома ў Акадэмію навук БССР прыехала дацэнт кафедры рускай літаратуры, Далёкаўсходняга дзяржуніверсітэта, фалькларыст СВІРЫДАВА Любоў Міхайлаўна, з якой мы і гутарым.

— Любоў Міхайлаўна, адкажыце напачатку, як узнікла ідэя такога грандыёзнага выдання?

— Задума шматтомніка належыць вучоным Бурацкай акадэміі навук. Збіранне фальклору ў нашых рэгіёнах распачалося ў 50-ых гадах, з 60-ых вялася экспедыцыйная работа, даследаваліся так званыя «фальклорныя гнёзды».

— У тым ліку і беларускія?

— Так. Перасяленні ў Сібір з Беларусі і Украіны асабліва масавымі былі ў пачатку стагоддзя. Найперш пасылалі хадакоў — як бы ў разведку. Тыя вярталіся з фантастычнымі апісаннямі краю, дзе зямля з небам сыходзяцца і дзе адзін толькі недахоп: не знайсці каменя, каб прыціснуць капусту ў бочцы. Паданні сведчаць, што, ад'язджаючы ў далёкі край, сем'і бралі з сабой па каменю...

— Цікавы факт. А як жа, скажыце, падключыліся да работы беларускія навукоўцы?

— Мы зразумелі, што без іх дапамогі проста не абыдземся. Першыя сустрэчы былі арганізацыйныя, нас наведаў доктар філалагічных навук прафесар К. Кабашнікаў, ён і будзе рэдактарам беларускага збору. Потым — летась і сёлета — у якасці кансультантаў прыязджалі У. Васілевіч, І. Карашчанка, Т. Варфаламеева. Мы сумесна працавалі, паднялі надзвычай цікавыя пласты беларускага фальклору, які, безумоўна, уяўляе сабой мастацкую каштоўнасць.

— Якія з жанраў найбольш захаваліся ў перасяленцаў з Беларусі?

— Вялікай разнастайнасцю вызначаюцца абрадавыя песні, у тым ліку вясельныя. Цудоўныя балады. І непераўзыдзеныя замовы ад хвароб.

— Мабыць, на чужой зямлі ў іх была асаблівая патрэба?

— Магчыма. Трэба адзначыць, што перасяленцы стараліся жыць кампактна, адбылася своеасаблівая кансервацыя, што і дапамагло дзецям і ўнукам старажылаў захаваць традыцыйны лад жыцця і культурную спадчыну.

— Друкавацца творы будуць па-беларуску?

— Мушу прызнацца, што наконт гэтага ў нас былі сумненні. Аднак супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР пацвердзілі выдатную захаванасць мовы ў старых людзей і развеялі нашы сумненні.

— Ці ёсць цяжкасці ў здзяйсненні задумы?

— Фалькларыстамі Далёкага Усходу і Сібіры назбірана велізарная колькасць твораў беларускай вуснай народнай паэзіі, але памер кожнага тома ўсяго 20 аркушаў. На жаль, большасць матэрыялу застанецца па-за межамі выдання.

— Варта і нашым выдаўцам зацікавіцца гэтым унікальным матэрыялам, бо фальклор перасяленцаў для нас пакуль што некранутая цаліна. Засталося папытаць, калі выйдзе ў свет беларускі том шматтомніка?

— Мяркуецца выдаць яго ў 1994—1995 гадах.

— Будзем чакаць. Дзякую, Любоў Міхайлаўна, за гутарку.

НАШ КАР.

Тэатр

ХАЙ І НЕ САМЫ ЯРКІ ПРЫКЛАД...

МІНУЎ час, калі можна было падманваць сябе ілюзіямі, што ў нашым тэатры ўсё «на ўзроўні», усё «як у людзей». Зараз мы ведаем, што той узровень невысокі, а «ў людзей» проста не лепей за нас. Хварэе краіна, хварэе грамадства, — ці можа быць здаровым мастацтва?.. Балюча ўсведамляць усё гэта— але што яшчэ нам застаецца, як не глядзець праўдзе ў вочы? Можа, адна яна — горкая, як хінін, непадкупная, як лязо скальпеля, — здольная ўратаваць.

Аднак пакуль што дзе найменш убачыш і пачуеш праўду, дык гэта ў нашым тэатры. Не, наконт жахаў, бруду, лаянкі ці аголенасці, дык тут мы даўно ўжо «на ўзроўні». Нават «поспехаў дасягнулі»: выхавалі ўжо пласт гледачоў, якія ідуць у тэатр «на гэта». Толькі не будуць яны трывалымі гледачамі, паверце шматгадоваму вопыту, не будуць, бо «гэта», прытым у імпартнай сервіроўцы, знойдуць у відэатэцы...

А спакон веку глядач ішоў у тэатр — у Афінах і ў Маскве, у «Глобус», «Пале-раяль» ці ў Мастацкі — на спатканне з прыгажосцю і праўдай. І чым больш брыдкай ці хлуслівай была акаляючая рэчаіснасць, тым больш быў попыт на прыгажосць і праўду. Не верыцца, што стрымгаловы прагрэс зруйнуе і законы дыялектыкі. Але ці можна сядзець склаўшы рукі і чакаць, калі «крывая» вывязе з крызісу тэатр? Не вывязе «крывая», і доказы побач — пусцеюць залы, нават прынцып «усё на продаж» не дапамагае (за апошнія гады наш Мінск трывала набывае славу нетэатральнага горада). Пасля шчаслівых дзён «Аўдзея», «Дракона», «Памінальнай малітвы» ў купалаўцаў усталяваўся нейкі рэспектабельны сонны спакой, які не парушылі ні выбух «Вар'яцкага жыцця», ні туга «Эмігрантаў» — спектакляў прыстойных, але надвор'я не зрабіўшых. І ўжо зусім ніяк не адазвалася на тэатральным жыцці «Швейцарыя! Швейцарыя!» А можа, адазвалася?..

Зусім зразумелыя падставы, па якіх тэатры запрашаюць замежных рэжысёраў на пастаноўку. Іншы раз яны бываюць мастацкія, але часцей — у межах «культурнага абмену»: мы ў вас, вы ў нас... П'еса нядрэнная, хоць асаблівымі мастацкімі вартасцямі і не адзначана, пастаноўка — з тых, што трынаццаць на тузін, прыкметных акцёрскіх адкрыццяў не адбылося. Вось і ў прыдатных эпізодах артысты са смакам і з рознай мераю густу націскаюць, рэжысёр ім асабліва не замінаў, бо па першым знаёмстве не ведаў, хто на што здатны... І трагікамедыя, якая, валодаючы матэрыялам і балючым і смешным, мелася расказаць аб тым, як чалавек пражывае «не сваё» жыццё, аб адзіноце і холадзе вечнага расстання, аб несвабодзе і прымусу, аб летуценніках, фантазёрах, дзіваках, — ператварылася ў нешта не надта выразнае. Бо усё істотнае неяк сарамліва адсунулася ўбок, у цень, а ў святле рампы нас прыняліся з усіх сіл забаўляць — перш-наперш немудрагелістымі, але танцамі (нездарма сярод запрошаных быў і балетмайстар), якія выконвалі вартыя лепшай долі маладыя актрысы, а потым і ўсеагульнай ламбадай, якая выклікала рогат і рытмічныя воплескі адной паловы залы ў той час, калі другая апускала долу вочы...

Можа падацца, што зашмат увагі аддаём мы гэтаму сцісламу спектаклю, які не зрабіў і не зробіць надвор'я. Аднак, думаецца, гэта не прахадны эпізод, а — трывожны сімптом. Сёння ў мастацтве ўладарна царуе прынцып камерцыйнасці, а калі так — дык і тэатр вокамгненна можа ператварыцца са «школы» і «кафедры» ва ўстанову «індустрыі адпачынку». Небяспека відавочная, таму і трывожна. І няхай «Швейцарыя...» не самы яркі прыклад аблегчанасці тэатральнага мастацтва, але ж— сімптом...

Наогул неяк боязна за лёс тэатра — такога магутнага і такога, як аказалася, кволага. Што з ім будзе? Куды рушыць? Ці набудзе свайго гледача, ці не страціць яго зусім? І што будзе з акцёрамі, якія ўвачавідкі губляюць свой статус «уладароў думак»?

Сумныя разважанні, сумныя высновы. Здаецца, няма падстаў для аптымізму. Але вось у Беларускім тэатральным вясною ўбачыла навучальную работу трэцяга курса акцёрскага факультэта (педагога Андрэя Андросіка). Спектакль паводле твораў Шэкспіра, ён не меў яшчэ на той час сталай назвы — «Наш Шэкспір», «Спроба Шэкспіра» ці яшчэ як... Прагны Андросік інсцэніраваў амаль усяго Шэкспіра, а яго густа населены, імклівы, напружаны спектакль, здаецца, мог быць «па зубах» толькі вопытным, трэніраваным прафесіяналам — ці апантаным студэнтам, якія, не шкадуючы сябе, з галавою кідаюцца ў свет шэкспіраўскіх страсцей. Не шкадаваў, відаць, іх і педагог, ды й сябе таксама, і мы ўбачылі (нават яшчэ не ў глядзельнай зале вучэбнага тэатра, а ў аўдыторыі, прыстасаванай пад залу) маладых, але ўжо шмат чаму навучаных людзей. Яны ўзбуджальныя, пластычныя, акрабатычныя, добра валодаюць сцэнічнай мовай — і беларускай, і рускай, тонка адчуваюць іронію, трапна вядуць дыялогі, умеюць «прышпорыць» фантазію (я маю на ўвазе ўсіх разам, як бы мовіць, групавы партрэт трэцяга курса, не называючы імёнаў, пакуль што, на шчасце, яны выглядаюць адзіным цэлым). А галоўнае — студэнты разумеюць і адчуваюць тое, што робяць. Гэта яшчэ «аднабаковы» Шэкспір, дзе перавага аддаецца дзеянню, імклівому руху сюжэта, хоць і слова зусім не ў загоне, і думка ў вялікай пашане. Але ж трэба сачыць, як у гэтай ВУЧЭБНАЙ рабоце ведаюць цану і важкасць аднагоадзінага жэста, руху, паўзы, рытмікі, фразы, позірку, як умеюць у танцы перадаць насмешку ці пыхлівую пагарду... Так, пакуль што «аднабаковы» Шэкспір, але — ШЭКСПІР!..

Так, баюся, што захапленне маё дачаснае; так, не хочацца ў каторы ўжо раз расчароўвацца... Але ўсё-такі не трачу надзеі, што спраўдзяцца спадзяванні — нашы агульныя спадзяванні.

Лілія БРАНДАБОЎСКАЯ.

«Паводле Шэкспіра». Момант рэпетыцыі курса А. АНДРОСІКА (БДТМІ). Арыель у сцэне буры.

ДАЗВОЛЬЦЕ, ДЗЯДЗЕЧКА...

«ПРЭЗІДЭНТ» ДАЕ ІНТЭРВ'Ю

Сярод кур'ёзных фактаў, на якія так багаты наш няпэўна-пераходны час, гэты зойме ў гісторыі адмысловае месца.

Сяргей Шупа, знаўца замежных моў, перакладчык, рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», дзе мы побач працуем, падаў мне нумар «Вячэрняга Мінска» за 27 кастрычніка і голасам, у якім чулася і здзіўленне, і ўсмешка, спытаў:

— Вы гэта чыталі? Не абыхто, а сам прэзідэнт дае інтэрв'ю. Прачытайце, аж дух займае...

І сапраўды, адразу ж, з першых радкоў дыхнула грандыёзнасцю планаў, нейкім нябачным дасюль размахам задум і здзяйсненняў. Уражанне мацнела ад таго, што праект, роўны бадай што славутаму павароту сібірскіх рэк ці ракаўскаму парку цудаў, здзяйсняўся не на дзяржаўным, нават не на грамадскім, а на прыватным узроўні — узяў чалавек, задумаў, узмахнуў чароўнай палачкай і...

Паколькі працую ў выдавецтве, дык збольшага ведаю спецыфіку кнігавыдавецкай справы, тое, як сёння ўсё ўскладнілася: парушыліся дагаворныя абавязацельствы, стала дэфіцытнай папера, пабольшала залежнасць ад паліграфічнай базы. Узнікла пагроза над выданнем беларускамоўнай літаратуры, бо яна, нібы тая сірата, становіцца нікому непатрэбнай — куды выгадней, скажам, друкарам мець справу з так званай парнухай, іншымі відамі масавага «чтива», якое дае «жывую капейку». І раптам знаходзіцца чалавек, для якога ўсе названыя і не названыя праблемы нібы семкі — усё, аказваецца, можна лёгка вырашыць, падняўшы на ногі грамадскасць і зафрахтаваўшы замежныя фірмы. Чалавек стварае грандыёзны праект, называе яго, перайначыўшы словы Беларусь, «Руссю Белай» і ўжо ў якасці прэзідэнта выступае не толькі ад імя насельнікаў рэспублікі, але і ад усіх беларусаў свету...

Хто ж гэты ўсемагутны прэзідэнт? Гэта навуковец-гісторык і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Змітравіч Якутаў.

Пра фінансавае забеспячэнне незвычайных праектаў прамаўчым, бо гэта, магчыма, складае камерцыйную тайну прэзідэнта, якую ён не хоча абнародаваць. Але, калі шчыра, дык усім, хто цесна зросся з нацыянальнай культурай, неабыякава, хто, за чые грошы і з якімі мэтамі яе купляе. Памятаеце сказаныя з пачуццём высокай годнасці словы Максіма Багдановіча, што беларуская літаратура ні ў якім выпадку не згодзіцца чысціць боты капіталу?

Апрача ўсяго іншага, шаноўны прэзідэнт бярэцца забяспечваць беларускай літаратурай этнічныя беларускія землі — Бранскую, Смаленскую і Пскоўскую вобласці, якія, як вядома, цяпер знаходзяцца ў складзе РСФСР. Тут мяркуецца размясціць выдавецка-паліграфічныя магутнасці, якія будуць збываць гатовую прадукцыю — гэта значыць кнігі — мясцоваму насельніцтву. Задума выглядае знешне вельмі прывабнай, бо ці ж невядома, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца кнігагандаль у Беларусі пры рэалізацыі беларускамоўнай літаратуры. Але, выяўляецца, праблема гэтая будзе лёгка вырашана: кожная з названых абласцей, паводле слоў прэзідэнта, гарантуе збыт беларускіх кніг па 2—3 тысячы тыражу, гэта значыць не менш, чым па абласцях БССР. У нас, як вядома, усё ж ацалелі, насуперак афіцыйнай палітыцы, беларускамоўныя асяродкі: у школах сяк-так, а ўсё ж вучылі і вучаць чытаць па-беларуску. Нічога падобнага не засталося на ўключаных у склад Расіі землях — пра беларускія школы, якія там існавалі ў 20-я гады, даўно ўжо ўсе пазабываліся, там цяпер няма ні зямляцтваў, ні хоць бы нядзельных беларускіх школ, як, напрыклад, у Прыбалтыцы, Маскве, Сібіры. Дык вось, хочацца спытаць у Якутава: абапіраючыся на каго вы хочаце там распаўсюджваць беларускую літаратуру? Няўжо, калі не знізу, дык зверху, на ўзроўні партыйнага і савецкага начальства там завёўся нейкі беларускі сепаратызм? Неверагодна! Якутаў узяў і назваў адвольныя лічбы, яны маглі быць большымі, маглі быць меншымі, бо залежалі, хутчэй за ўсё, ад настрою і фантазіі, без рэальнага разумення, як збіраецца тыраж пад кожную канкрэтную кнігу...

Яшчэ больш, чым унутрысаюзныя, на зыбучай няпэўнасці пабудаваны замежныя справы нашага прэзідэнта. Маю на ўвазе дачыненні з беларускай эміграцыяй. Што датычыць замежных фірмаў — пас, маўчу, хоць наўрад ці ўсё тут о'кэй, як гэта сцвярджае Якутаў. Хацелася б толькі пажадаць, каб яго абмінула доля «Атланта» і «Путніка». Але мяне больш непакоіць іншае: імкненне прэзідэнта ўцягваць (хай выбачае за слова) у свае афёры беларускую эміграцыю. Я асабіста не веру, што эміграцыя кідаецца ў абдымкі абы да каго. Пра сваё цеснае супрацоўніцтва Якутаў кажа як пра факт здзейснены і ў якасці прыкладу называе імя выдатнай беларускай паэткі на эміграцыі Наталлі Арсеневай, якая нібыта ўступіла яму правы на выданне сваіх твораў. Я не маю магчымасці перамовіцца з шаноўнай спадарыняй Арсеневай, але на сто працэнтаў перакананы, што словы прэзідэнта — чыстай вады лухта. Названа ж імя Арсеневай чыста спекулятыўна, дзеля надання важкасці і пераканаўчасці сказанаму, а яшчэ з рэкламна-прапагандысцкімі мэтамі: давайце, сябры-пісьменнікі, перакідвайцеся сюды, вунь якія майстры слова лічаць за гонар мець справу са мной!..

У непраўдзівасці і спекулятыўнасці сваіх слоў упэўніў мяне сам Якутаў, таму і выказваюся, мабыць, рэзка, называю рэчы сваімі імёнамі. Маю на ўвазе перш за ўсё тое месца з інтэрв'ю, дзе гаворыцца пра гарачую падтрымку Якутавай дзейнасці пісьменніцкай грамадскасцю і... згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Прачытаўшы такое, не ўтрываў, патэлефанаваў Якутаву на працу, але там сказалі, што ён ужо выйшаў на заслужаны адпачынак і шукаць яго трэба дома.

Называю сябе, кажу, што прачытаў інтэрв'ю, распытваю пра дзейнасць «Русі Белай», цікаўлюся наконт цеснага супрацоўніцтва з «Бацькаўшчынай».

— О, конечно, конечно! — з імпэтам падхоплівае «прэзідэнт». — Налажено самое тесное сотрудничество. Я ведь вхожу в руководящие органы объединения...

— Прабачце, — сумеўся я, — у якія кіраўнічыя органы? Мяне, — тлумачу, — завуць Яўген Лецка, я з'яўляюся старшынёй рады «Бацькаўшчыны», а на чале ўсяго згуртавання стаіць прэзідэнт, аднагалосна абраны ўстаноўчай канферэнцыяй, Васіль Быкаў...

— О, да, да! Мы ведь с Василём в хороших отношениях. А с тобой, понимаешь, как-то не получилось встретиться, поговорить. Да это дело поправимое — будет полезно и для «Бацькаўшчыны», и для тебя. Материально и морально поддержим...

— Ага, сустрэнемся, пагаворым, — неяк няўцямна адказваю я і зняможана кладу слухаўку.

Калі-небудзь, бадай, і сустрэнемся, і пагаворым. Але вы ўжо, таварыш «прэзідэнт», прабачце — наўрад ці атрымаецца ў вас цеснае супрацоўніцтва са згуртаваннем «Бацькаўшчына».

Яўген ЛЕЦКА,
старшыня рады
згуртавання беларусаў
свету «Бацькаўшчына».

Беларускі шлях

Цяпер, калі, бадай, кожны з нас думае пра лёс Беларусі, беларускую дзяржаўнасць, ёсць патрэба звярнуцца да вытокаў самой ідэі беларускай дзяржаўнасці. Дзеля гэтага мы распачынаем публікацыю матэрыялаў пад рубрыкай «Беларускі шлях». Тут будуць змешчаны матэрыялы беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый, якія дагэтуль не публікаваліся. Спадзяёмся, што іх з зацікаўленасцю і карысцю прачытаюць сённяшнія лімаўскія чытачы.

Пасля далучэння Вялікага княства Літоўскага і часткі Польшчы да Расіі ў паўстаннях 1794, 1830—1831, 1863—1864 гг. барацьба вялася за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Пры гэтым відныя беларуска-літоўскія дзеячы (Якуб Ясінскі, Кастусь Каліноўскі ды інш.) заўсёды мелі на мэце аднаўленне аўтаноміі Вялікага княства Літоўскага і яго федэратыўныя сувязі з Польшчай. Але ў 80-я гг. XIX ст. беларускія народнікі ў сваім часопісе «Гомон» заявілі, што яны змагаюцца за асобныя інтарэсы беларускага народа, за аўтаномію Беларусі ў складзе новай, дэмакратычнай Расіі. Пра аўтаномію Беларусі ў складзе дэмакратычнай і федэратыўнай Расіі адразу ж загаварыла і Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ) — нацыянальная партыя, што ўзнікла ў 1903 г.

У 1914 г. пачалася першая сусветная вайна, а ў 1915 г. немцы акупіравалі заходнюю частку Беларусі з Вільняю. Упершыню беларусы атрымалі магчымасць адчыніць свае школы, настаўніцкія курсы, іншыя асветніцкія і культурныя ўстановы, выпускаць беларускія газеты. Усяго гэтага не было на ўсходзе Беларусі, які заставаўся пад уладай царызму. Таму няхай вас не здзіўляе арыентацыя беларускіх дзеячаў на Германію, на сярэднееўрапейскія краіны, што былі ў саюзе з Нямеччынай. Зрэшты, паражэння царызму ў гэтай вайне жадалі і расійскія бальшавікі. Для нас жа больш важна адзначыць, што, арыентуючыся на Захад, беларускія і літоўскія дзеячы хацелі аднавіць незалежнае Вялікае княства Літоўскае, а праўдзівей незалежную дзяржаву на тэрыторыі былога Княства. Беларускія дзеячы адмовіліся ад думкі пра федэрацыю з Расіяй (пра Польшчу я ўжо казаў). У той жа час нарадзілася ідэя саюзу (канфедэрацыі) незалежных Беларусі, Літвы, Украіны і Латвіі, «Злучаных Штатаў» ад Балтыйскага да Чорнага мора. Яе актыўным прапагандыстам быў адзін з заснавальнікаў БСГ, а ў час акупацыі старшыня Беларускага Народнага Камітэта ў Вільні, лідэр Беларускай Сацыял - Дэмакратычнай Работніцкай Групы Антон Луцкевіч. (Яго рэферат для беларускай дэлегацыі на Лазанскай канферэнцыі народаў Расіі надрукавана сёлета ў № 2 газеты «Свабода»).

Прашу паважаных гісторыкаў звярнуць увагу на дзве акалічнасці: і ў апублікаваных тут тэкстах, і ў архіўных матэрыялах фігуруе Беларускі Народны Камітэт у Вільні, а не Беларускі Нацыянальны Камітэт, як гэта можна прачытаць у некаторых працах. Другое: побач з Віленскім Камітэтам Беларускай Сацыялістычнай Грамады працавала Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Работніцкая Група. Яе, як мы ведаем, узначальваў А. Луцкевіч. Значыць, ён выйшаў з Грамады і стаў на цвёрдыя сацыял-дэмакратычныя пазіцыі яшчэ да расколу БСГ у 1918 г. Ці не быў гэта першы раскол у шэрагах партыі?

Анатоль СІДАРЭВІЧ.

УНІВЭРСАЛ

Канфэдэрацыі Вялікага Князьства Літоўскага

Лета 1915 мес. Грудня[1] 19 дня члены Літоўскіх, Беларускіх, Польскіх і Жыдоўскіх арганізацый прыступілі да **КАНФЭДЭРАЦЫІ ВЯЛІКАГА КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГА**, дабіваючыся супольнымі сіламі, абы Літоўскія і Беларускія землі, каторыя здаўна прыналежалі да **ВЯЛІКАГА КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГА**, а цяпер апанаваны Нямецкімі войскі, станавілі пры новых варунках гістарычных нераздзельнае цела на фундамэнце **НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, ЯК СУЦЭЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВЫ, ЗАСЬЦЕРАГАЮЧЫ ЎСІМ НАЦЫЯМ У ЯЕ МЕЖАХ УСЕ ПРАВЫ.**

Дзеля гэтага канфэдэраты звяртаюцца да ўсіх нацый, да ўсіх станаў, да ўсіх існуючых арганізацый і да ўсіх грамадзян Краю, клічучы, абы ўважаючы на важнасць вялікага гістарычнага мамэнту, забыўшыся крыўд узаемных, свар і недавер'я, маючы на мэце адно карысць супольнае Бацькаўшчыны, прылучыліся да **КАНФЭДЭРАЦЫІ ВЯЛІКАГА КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГА.**

РАДА ТЫМЧАСОВАЯ
Канфэдэрацыі Вялікага Князьства Літоўскага.

●

ГРАМАДЗЯНЕ!

Абвешчаная 19 грудня 1916 году Тымчасовай Радай Канфэдэрацыя Вялікага Князьства Літоўскага мае на мэце, як тое ў Унівэрсале яе адзначана, дайсьці вызваленьня Літвы і Беларусі, як дзяржаўнай адзінкі.

Кіруючыся да гэтай мэты, Канфэдэрацыя апіраецца на гэтакіх асновах:

Перш за ўсё Канфэдэрацыя лічыць, што ўсе надзеі на Расею — ня толькі пустыя, але і шкодныя. Больш чым сталетняе супольнае жыццё нашае з Расеяй найлепей паказала, што гэтае гасударства хоча з намі зрабіць. Праз увесь час супольнага з намі жыцця яно плянава і сістэматычна кіравалася да таго, каб сцерці ўсе адзнакі нашай самачыннасьці. І гісторыя астатніх ста дваццаці лет запоўнена ўся безупынным сьмяротным змаганьнем нашым за свой быт з прагавітай расейскай дзяржаўнасьцю.

На дарозе да вызваленьня нашага мы спатыкаем ворагаў ня толькі ў чыноўніцкай расейскай дзяржаўнасьці, але і ў большай часьці расейскага грамадзянства, каторае праз свае партыі, ня лічачы некаторых невялікіх груп, заўсёды выступала проці нашага руху да волі. З гэтай прычыны мы не сумляваемся і аб расейскім лібэралізьме, каторы кіруецца да таго, каб у свае рукі забраць уласьць пасьля царскіх чыноўнікаў.

Да якой ступені цэнтралістычнага асьляпленьня дайшла кіруючая часьць расейскага грамадзянства, могуць сьведчыць хоць бы галасы прэсы расейскай, каторая нават цяпер, калі нас ужо асвабадзілі ад ярма царскай апекі, не забываецца пры кожным здарэньні адзначываць, што бытцым то Край наш ёсць і далей павінен аставацца расейскім — «истинно русским на веки».

Сеці інтрыг, расстаўляных за граніцай і ў нашым Краю ў астатнія часы досі ахвочай і спрытнай рукою наймітаў расейскага царату, не павінны нас ашукаць ці ўсыпіць нашу чуткасьць.

Нашы надзеі на спаўненьне жаданьня волі Краю нашага кіруюцца цяпер у другую старану: да групіроўкі гасударств срэдне-эўрапэйскіх. Мы верым, што пасьля пабеды срэдне-эўрапэйскіх гасударств быўшыя заходнія правінцыі Расеі, а перш за ўсё землі польскія, літоўска-беларускія і надбальтыцкія павінны будуць адпасьць ад Расеі і стварыць гасударственыя адзінкі ў такой або сякой камбінацыі з срэдне-эўрапэйскімі гасударствамі, а пры гэтым былі бы прыняты пад развагу эманцыпацыйныя дамаганьня гэтых зямель і запэўнены варункі самачыннага развіцьця іх сацыяльна-культурнага і палітычнага жыцьця.

Гэткая мажлівасьць карысна ня толькі для гэтых краёў, але карысна і для срэдне-эўрапэйскіх гасударств. Бясспорна, гэтым апошнім важна ня толькі тое, каб Расея была аслаблена, але і тое, каб ад яе аддзяліцца мурам, каторы бараніў бы іх ад націску з усходу. Само самой разумеецца, што хоць болей-меней дальнавідная палітыка, якой можам спадзявацца, ад срэдне-эўрапэйскіх гасударств, будзе вымагаць, каб Краі, каторыя будуць служыць за такі мур, ня толькі цягнуліся да Срэдняй Эўропы з прычын зверхных і мінаючых, але і былі зацікаўлены такой лучнасьцю з прычын унутраных, пастаянных.

Ня думаем, каб цяпер ужо была пара прарочыць аб канкрэтных формах будучага ўкладу адносін срэдне-эўрапэйскіх гасударств, — пакуль акружжа ваюючых не сказала свайго астатняга станоўчага слова. Усё ж такі нам здаецца, што ўжо пара, каб заінтэрэсованыя стороны, а ў гэтым шчоце і наш Край, выказалі публічна сваю волю і свае справядлівыя дамаганьня.

У мысьль гэтага Канфэдэрацыя Вялікага Князьства Літоўскага жадаець:

1. абы землі літоўска-беларускія станавілі пры новым укладзе незалежную гасударственую адзінку з сэймам у Вільні, выбіраным на аснове агульных, роўных, простых і тайных выбараў, з забесьпячэньнем поўных правоў усім нацыям, каторыя жывуць на названых землях.

2. абы ў межах названых зямель[2] былі прынамсі землі, занятыя цяпер нямецкімі войскі, значыцца: Ковенская і Віленская губэрніі, беларуская і літоўская часьці Гродзенскай і Сувальскай губэрній, літоўскія часьці Курляндзкай губэрніі і часьці губэрніі Мінскай, каторая звязана з Віленскім цэнтрам — і абы ўсе гэтыя землі станавілі адно непадзельнае цэлае;

3. абы форма ўнутранага ладу і аснаўная канстытуцыя будучай вольнай літоўска-беларускай гасударственнай адзінкі не была накінута нам з верху, але была ўстаноўлена і зацьвержона ўстаноўчым сэймам у Вільні, выбраным агульнай, роўнай, простай і закрытай падачай галасоў.

Гэтыя аснаўныя нашы жаданьня, каторыя наш Край праз сьвядомыя грамадзкія арганізацыі высказываў у такой або сякой форме, у залежнасьці ад варункаў мамэнту, адпавядаюць усім справядлівым вымаганьням як шырэйшых кругоў грамадзянства нашага, так і асобных народаў нашага Краю.

Грамадзяне!

Мамэнт, каторы пастановіць аб долі нашага Краю, нашай супольнай Айчыны, набліжаецца шпаркімі крокамі. Будучына і дабрабыт Краю будзе ў значнай меры залежыць ад таго, якую пазыцыю мы займем. Будзьма ж растропнымі і дальнавіднымі, не паддаваймася толькі ўчуцьцю, каторае нас часта ашуківае, але разважайма аб долі нашай, долі цэлых будучых пакаленьняў халодным разумам, сягаючы далёка перад сабою.

Яднаймася навокал супольнага клічу, бо толькі ў еднасьці сіла. Кіньма сваркі і звадкі, ад каторых церпіць увесь Край. Падумайма разам ды шчыра аб долі гэтага Краю, бо ж усе мы, апрача жмені прыблуд, сыны нашай зямлі — нашай Літвы і Беларусі,

Не чакайма на тое толькі, што нехта для нас зробіць, не ашуквайма сябе, а возьмем сваю долю ў свае рукі: трывалым будзе толькі тое, што мы сваімі супольнымі сіламі заваюем, здабудзем і ўтрымаем.

Стойма, грамадзяне, моцна, цьвёрда і ў згодзе, бяз рожніцы станаў, нацый і веры, пры штандары нашай вольнай бацькоўшчызны — Літвы і Беларусі!

Люты 1916 г.

РАДА
Канфэдэрацыі Вялікага Князьства Літоўскага.

●

УНІВЭРСАЛ

Канфэрэнцыі Беларускага Народнага Камітэту, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Работніцкай Групы і Віленскага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

ГРАМАДЗЯНЕ!

На ўсім сьвеце прабіла гадзіна вызваленьня народаў. Прабіла яна і для народу Беларускага.

Перад намі — велізарная задача: узяць тую волю, якую суляць усім уцісканым народам ваюючыя дзяржавы, і збудаваць моцныя-вечныя асновы для вольнага жыцьця.

Магчымасьць развіваць сваю нацыянальную культуру і родную мову, ладзіць беларускую навуку ў школах — ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых, забяспечыць беларускай мове належнае мейсца ў урадовых установах, судзе, касьцёле і цэркві — гэта толькі часьць таго, чаго мы павінны дайсьці. Каб мець магчымасць усестароннага і матэрыяльнага развіцьця, наш народ павінен мець права самому ўпраўляцца на сваёй зямлі ў еднасьці і згодзе з грамадзянамі ўсіх нацыянальнасьцей Краю

НА АСНОВАХ ДЭМАКРАТЫЗМУ
з забеспячэньнем

СВАБОДНАГА ЭКАНАМІЧНА-ГАСПАДАРЧАГА РАЗВІЦЬЦЯ,
глаўнай асновы дабрабыту многамільённых рабочых мас.

Беларусь ад вякоў звязана ў суцэльны эканамічна-гаспадарчы арганізм з Літвой. Іх звязывае супольная арганізацыя і супольныя інтарэсы прамышленасьці і таргоўлі, супольныя тарговыя дарогі — рэкі і сыстэма чыгунак, каторыя на поўначы праз Курляндзію даюць вольны выхад да Балтыцкага мора, а на поўдні праз Украіну — да Чорнага мора, адкрываючы дарогу на ўвесь сьвет. Разарваць гэту гаспадарчую еднасьць — значыць разбіць самыя асновы эканамічнага жыцьця Беларусі і Літвы, значыць засудзіць нашу Бацькаўшчыну на вечную эканамічную залежнасьць ад чужынцаў. З гэтай прычыны беларускія грамадскія арганізацыі на сваей Канфэрэнцыі ў Вільні пастанавілі:

у гэты мамэнт, калі важыцца пытанне аб нашай будучыні, выставіць жаданьне

незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі і Літвы, абнімаючы ў новай беларуска-літоўскай дзяржаве ўсе беларускія і ўсе літоўскія землі з абодвых бакоў ваеннага фронту, у найцяснейшай еднасьці — згодна з пастановай рады работнікаў і салдатаў у Рызе — з Курляндзіяй, а также эвэнтуальна з Украінай.

Каб правясці гэта ў жыцьцё, мы трэбуем сазыву

УСТАНОЎЧАГА СЭЙМУ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ Ў ВІЛЬНІ,

на каторым дэпутаты ўсіх нацыянальнасьцей краю, выбраныя на асновах агульнай, роўнай, тайнай і беспасрэднай падачы галасоў, выявяць волю нашай Зямлі.

Гасударственны лад у будучай дэмакратычнай Беларуска-Літоўскай дзяржаве павінен быць збудаваны на гэткіх асновах:

1. аддача ўсей уласьці ў рукі народу;

2. унутранае разгранічэньне аўтаномных Беларускай і Літоўскай зямель паводлуг матчынай мовы жыхароў;

3. роўныя правы для ўсіх нацыянальнасьцей краю;

4. прызнанне ўрадавых правоў за ўсімі мяйсцовымі мовамі, забеспячэньне школьнай навукі ў матчынай мове.

На гэткіх асновах хочама мы будаваць будучыну нашага краю. На гэткім жа грунце стаіць і Беларускі Нацыянальны Камітэт у межах Расеі[3], каторы ў згодзе з часьцю літвінаў, у згодзе з польскім і жыдоўскім грамадзянствам з таго боку ваеннага фронту выставіў жаданьне непадзельнасьці вольнай Беларусі і Літвы.

Канфэрэнцыя кліча ўсё грамадзянства нашага краю бяз розьніцы нацыянальнасьці і веры, а ў першы чарод усіх беларусаў злучыць свае сілы і згодна падаць свой голас за тыя палітычныя ідэалы, якія выставіла арганізаванае беларускае грамадзянства з абодвых бакоў фронту, выставіла згодна **ЎСЯ БЕЛАРУСЬ.**

Няхай жыве незалежная і непадзельная Беларусь і Літва!

Няхай жыве Установчы Сэйм у Вільні!

Няхай жыве Воля, Роўнасць і Брацтва ўсіх народаў!

ВІЛЬНЯ, У ВЕРАСЬНІ 1917 г.

Увага: Канфэрэнцыя лічыць сваей павіннасьцю заявіць, што прадстаўленыя на ёй беларускія грамадскія арганізацыі, салідарна з Беларускім Нацыянальным Камітэтам у Расеі стоячы на грунце непадзельнасці гістарычнай Беларусі і Літвы, не маюць нічога супольнага з выдаванымі ад нейкага часу ў Вільні «лістоўкамі» і выстаўленай у іх думкай аб незалежнасьці Беларусі, адарванай ад Літвы, у еднасьці з сучаснай буржуазнай Польшчай: «лістоўкі» гэтыя становяць плод працы аднэй асобы, ідэі каторай навеяны са стараны — чужымі нашаму народу людзьмі[4].

---

1 Грудзень — снежань. Так гэты месяц называюць украінцы і палякі.

2 Маецца на ўвазе адроджаная дзяржава на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага.

3 Беларускі Нацыянальны Камітэт быў створаны ў Мінску ў сакавіку 1917 года. Яго матэрыялы мы апублікуем.

4 Чытачоў з гэтымі лістоўкамі мы пазнаёмім, а тут адзначым, што пэўныя ідэі «Сувязі Незалежнасці і Непадзельнасці Беларусі», выказаныя ў лістоўках, запазычаны аўтарамі гэтага універсалу.

Падрыхтоўка тэксту і каментарыі Анатоля СІДАРЭВІЧА.

Раман ТАРМОЛА

Сярод бяроз

Жанчына
аблівалася
слязамі,
Як свечка воскам,
што пад абразамі...
Малілася
за нечы
супакой
І не сцірала
горкі плач рукой.
Мне гэты плач
аддаўся ў сэрцы рэхам,
Бо ведаў я дагэтуль,
што заўжды
Яна душыцца ўмела
толькі смехам,
Не ведаючы гора і бяды.
Якія адгукнуліся ў ёй гены,
Такой шчаслівай
і пасляваеннай,
Што затапляе зараз
морам слёз
Магілу нечую
сярод бяроз?..

Кіцель

Абпалены,
З'явіўся ён ізноў
Адтуль,
дзе смерць,
і пахне горкім дымам...
І дзірачкі на ім ад ардэноў —
Сляды ад куль,
што праляцелі міма,
Пятнаццаць год як франтавік памёр.
Сам не прыходзіць...
Прысылае кіцель...
Вы на яго са страхам не глядзіце,
Ён тут як напамін,
а не дакор.
Ты,
сына сын,
дарэмна не гадай,
З якога куфра ён,
з якое шафы,
А лыжку з вілкаю падай,
Бо на вяселлі дзед ён,
а не шафер.
Хто ўмее бачыць,
можа разглядзець
Знаёмы твар,
і рукі,
і паставу
І разам пра зямельку песню спець,
Ні слова
не гаворачы
пра славу...

●

Пераблыталіся ў галаве
Кансерватары,
левыя,
правыя...
Сэрца ўсіх левакоў лявей,
Бо заўсёды
занята
справаю.
Не дае спыняцца жыццю
Адхіленнямі ўсялякімі,
Разгавецца,
як на куццю,
Балбатні пустымі прысмакамі.
Покуль ходзіцца,
сэрцу ісці,
Даражыць парой і мінутамі...
Найвышэйшая праўда ў жыцці —
Сэрца стук
ці маўчанне пакутнае.

●

Адбіткі ўласнага жыцця —
Мільярды метраў кінастужкі
Век разматаў,
нібыта сцяг,
І чорна-белы свет разгушкаў.
У столак
некалькі
спавіў
Сябе земшар жахлівым сцягам
І сам жахнуўся: на крыві
Замешана

Старонкі ўспамінаў

«Мы не контрыкі»...

У ГАДЫ маёй вучобы на газетна - выдавецкім аддзяленні літфака Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута (ВПІ) тут займаліся таксама Анатоль Астрэйка, Змітрок Астапенка, Клім Грыневіч, Алесь Пруднікаў, Ганна Сапрыка... Жыццё было надзвычай цяжкае. Мы, студэнты, атрымлівалі па картках 500 грамаў хлеба і адзін раз у дзень мелі магчымасць з'есці ў студэнцкай сталоўцы талерку нішчымнага крупніку. Так знясілеў, што без перадыху не мог узысці на трэці паверх. Гэта ў свае 22 гады. Хацеў я кінуць інстытут, але знайшліся добрыя людзі, якія падтрымалі мяне і маральна, і матэрыяльна. Павінен сказаць, што тады пачаліся «хапуны», часцей траплялі ў кабінеты ГПУ найбольш здольныя студэнты. Вось быў чалавек, вось знік. Так сталася з Васілём Багамольцавым (паэтычны псеўданім Васіль Леанідаў), з маім добрым сябрам тых гадоў Клімам Грыневічам. Я ўжо не кажу пра такіх пісьменнікаў, як Уладзімір Дубоўка, Міхайла Грамыка, Максім Гарэцкі, Язэп Пушча... Думалася са страхам — няўжо гэтыя выдатныя людзі — «ворагі народа»?

У 1935 годзе скончыў я Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут і быў накіраваны выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў адзіную ў тыя часы ў Смалявічах сярэднюю школу. Прыехаўшы туды, даведаўся, што адзін з маіх папярэднікаў быў тут арыштаваны, а хутка за ім знік і другі настаўнік. Міжволі падумалася: а ці не напаткае такі лёс і мяне?

У пачатку снежня 1936 года прыехаў да мяне швагер, студэнт літфака Мінскага педінстытута Аляксей Шынкевіч. Ён расказаў, што 10 маіх аднакурснікаў арыштаваны. Прапанаваў паехаць мне куды-небудзь на Урал ці Сібір, бо і мяне могуць арыштаваць. Я сказаў:

— За што? Што я, вораг народа?

— А твае аднакурснікі Грахоўскі, Валасевіч, Карцель, Каплунова, Майзель, Жукавец, Розна, Плашчынскі, Шыдлоўскі і іншыя — ворагі народа? — адказаў Аляксей.

І вось надышло 9-га снежня 1936 года. У той дзень я праводзіў урок у 6-ым класе. І толькі распачаў яго, як неспадзеўна шырока расчыніліся дзверы і ў клас зайшлі два чалавекі — загадчык Смалявіцкага раённага аддзела асветы Мікалай Абраменка і начальнік раённага аддзела НКУС Фрыдман.

— Урок спыняецца! — крыкнуў Абраменка, востра зірнуўшы на мяне. Я змоўк. Перапалоханыя вучні разгублена пазіралі на мяне і «гасцей».

— А чаму-у? — пачуўся вучнёўскі тонкі галасок.

— Не ваша справа! — гукнуў Фрыдман, пранізваючы вачыма мяне і пазіраючы на на партрэт Янкі Купалы, які вісеў на дошцы. — Вы, грамадзянін настаўнік, нават сёння прапаведуеце контррэвалюцыйную нацдэмаўскую творчасць Янкі Купалы...

— Урок закончаны, дзеці, — сказаў я ціха...

...Наглядчык — худы, вусаты, невысокага росту чалавек— з грукатам адчыніў жалезныя дзверы камеры. Я жахнуўся: камера па сваёй канфігурацыі нагадвала дамавіну — больш шырокая да закратаванага акенца і вузейшая да дзвярэй. У камеры было змрочна.

— Твой ложак з левага боку, — сказаў наглядчык і зачыніў дзверы.

Я прыхіліўся да сцяны ля дзвярэй і доўга стаяў, як аглушаны. Мне стала млосна, душна, у скронях стукала кроў, лоб змакрэў ад поту. У знямозе я апусціўся на цвёрды турэмны ложак, абхапіў галаву рукамі і заплакаў ад бяссілля.

Стомлены, знерваваны, я неўпрыкмет заснуў. Прачнуўся ад таго, што нечакана расчыніліся і тут жа з лязкатам зачыніліся дзверы. Я ўскочыў. Перада мной стаяў нізкарослы чалавек у старой ватоўцы, са схуднелым тварам, гарбаватым носам, пад якім тырчалі парыжэлыя ад тытуню невялікія вусы.

— Чаго напужаўся? Упершыню ў астрозе?—сіплаватым голасам спытаўся незнаёмы.

— Ага.

— А па якой прычыне апынуўся тут?

— Не ведаю. Кажуць, маіх аднакурснікаў, былых студэнтаў, узялі як ворагаў народа. Пэўна, і мяне...

— Які з цябе вораг? У цябе малако яшчэ на губах. Вот з мяне шпіёна, па-вашаму, шпіёна хочуць зрабіць, прымушаюць, каб падпісаў паперку. А ты, людска істота, камуніст?

— Не, камсамолец.

— Тут, у астрозе, шмат камуністаў і камсамольцаў. А чаму — не разумею.

Мы пазнаёміліся. Мой аднакамернік назваў сябе Антонам Семежам. Праз некалькі дзён яго забралі з камеры і назад ён ужо не вярнуўся. Неўзабаве я даведаўся, што яго расстралялі.

У камерах мне даводзілася сядзець і са старымі бальшавікамі (шкада, памяць не захавала іх прозвішчы), якія рашуча адвяргалі прад'яўляемыя ім абвінавачванні, не схіляліся перад здзекамі і катаваннямі.

У першыя дні допыту следчы, які вёў маю справу, гаварыў, што ні я, ні мае таварышы па інстытуце ні ў чым не вінаваты, што існаванне контррэвалюцыйнай арганізацыі на курсе — лухта, але нас усё роўна не выпусцяць, бо ёсць загад народнага камісара ўнутраных спраў Мікалая Іванавіча Яжова арыштоўваць у першую чаргу прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі. «Думаю, — гаварыў следчы, — гэты загад наркома ўзгоднены з нашым дарагім Іосіфам Вісарыёнавічам». Следчы раіў падпісаць усе абвінавачванні, каб не цягнуць час. «Так для вас будзе лепей», — казаў ён.

Пасля доўгага сядзення (амаль год) у турэмных камерах, ад сістэматычнага недаядання ў мяне пад пахамі з'явіліся пухіры, ад болю я павінен быў трымаць рукі над галавой, у такім стане сядзеў і перад следчым у час допыту. А допыты працягваліся не адну гадзіну. Бывала, паставіць следчы каля мяне свайго супрацоўніка, а сам ідзе па сваіх справах. Ад мяне патрабаваў падпісаць пратакол допыту, у час якога я быццам бы прызнаўся, што на нашым газетна-выдавецкім аддзяленні ВПІ існавала контррэвалюцыйная нацыяналістычная арганізацыя, створаная Цішкам Гартным, Міхасём Зарэцкім, Платонам Галавачом, Васілём Шашалевічам, у якую ўваходзіў і я з некаторымі аднакурснікамі.

2-га кастрычніка 1937 года Спецкалегія Вярхоўнага суда БССР пад старшынствам В. Карпіка большасць членаў «арганізацыі» асудзіла на 10 год пазбаўлення волі, мне і Мітрафану Жукаўцу далі па шэсць год зняволення і пяць гадоў паражэння ў грамадскіх правах.

Неўзабаве пасля суда мяне з іншымі асуджанымі ў вагоне з закратаванымі вокнамі прывезлі ў Магілёў, у перасыльную турму. Тут збіралі вялікі этап у далёкую невядомую дарогу.

Потым зноў былі вагоны з нарамі, з металічнай печкай-буржуйкай. Цягнік ішоў на ўсход. Больш стаялі на глухіх паўстанках, чым ехалі. Кармілі дрэнна: пераважна селядцамі і хлебам, ад якіх дужа хацелася піць. А вады давалі зрэдку, на якой-небудзь вялікай станцыі. Па першым часе ў вагоне было больш-менш цёпла, але чым далей ехалі, тым рабілася халадней. Па чарзе тоўпіліся каля печкі-буржуйкі, адгравалі рукі і ногі.

Нарэшце, у канцы снежня 1937 года, прывезлі нас у горад Марыінск, што ў Новасібірскай вобласці. Марозы тут стаялі страшэнныя, з паўночным пранізлівым ветрам, які па-тутэйшаму звалі «хіусам». Калі нас вывелі з вагона, хіус абпаліў твары, адразу закачанелі рукі і ногі. Нехта з вязняў папрасіў, каб хутчэй вялі, маўляў, замерзнем. Начальнік канвоя злосна скамандаваў у адказ:

— Лягай!

Мы ўсе, хочаш не хочаш, павінны былі легчы на ўтрамбаваны снег. Жанчыны, што праходзілі па вуліцы, спыніліся, гаротна і спачувальна глядзелі на нас.

Некалькі хвілін мы ляжалі на дарозе, пасля ўсё-такі нас паднялі і павялі ў халодны цагляны будынак. Адно, што тут не было так ветрана, як на вуліцы.

Тут я ўбачыў вядомага нашага літаратара Барыса Мікуліча, яго таксама прывезлі гэтым этапам. Ён быў дужа схуднелы, аброслы рыжаватай шчэццю. На ім была рудаватая, моцна зношаная футэрка, футравая шапка і чаравікі з гетрамі. Разам з ім былі паэт Міхась Багун і былы намеснік рэдактара газеты «Чырвоная змена» Ілары Дуброўскі, з якім мне даводзілася сустракацца ў рэдакцыі. Яны трымаліся адзін аднаго.

...Мы ляжалі на цэментнай падлозе, прыціснуўшыся адзін да аднаго, каб было цяплей. Прынеслі баланду, але посуду ніякага не было і прыйшлося піць той суп каму з чаго, нават з галёш. Трымалі нас тут некалькі тыдняў. Адной халоднай раніцай Міхась Багун не мог устаць. Яго вынеслі з памяшкання, і больш мы з ім не сустракаліся.

У студзеньскія сібірскія марозы нас пачалі збіраць у этап на Новаіванаўскі лагерны пункт. Ішлі пешкі, падтрымліваючы адзін аднаго. Пасля Барыс Мікуліч у «Повести для себя» («Нёман», № 3, 1987) напіша пра гэты этап; «Я шел по 30-градусному морозу в легкой меховой курточке, в ботинках и в перчатках — шестьдесят километров — и дошел, а многие здоровяки падали». Помню, як збіваў з ног вецер, як многія падалі ніцма і ўжо больш не ўставалі. Барыс Мікуліч адной рукой падтрымліваў мяне, другою — Дуброўскага.

На Новаіванаўскім лагерным пункце мы сядзелі ў бараках, пухнучы ад недаядання і знясілення, усе мы хварэлі на цынгу. Баракі былі перапоўнены, спаць даводзілася пад нарамі.

Мяне і Барыса Мікуліча доўга тут не трымалі, і 8-га сакавіка 1938 года мы апынуліся на Каменданцкім лагерным пункце ў Рашотах Краснаярскага краю. Зняволеныя будавалі тут чыгуначную ветку Рашоты — Багучаны. Асноўнымі прыладамі працы былі тачка і рыдлёўка. А сіл ужо не было. Пхнём тую тачку наперад, а яна з трапа саскочыць і перакульваецца. Тут Барыс Мікуліч захварэў на «курыную слепату». Як толькі прыцемкі — нічога не бачыць. Кармілі збольшага: рэдзенькі суп, які зняволеныя называлі супам-рататуем, і нішчымная каша. Але і яе было так мала, што, здаецца, толькі набраў лыжку, а міска ўжо пустая. Хлебарэзам у той час рабіла Ганна Яфімаўна Рафаловіч, асуджаная «тройкай» на 10 год катаргі як жонка «ворага народа». У яе быў сын Анатоль — зусім малады чалавек, яго таксама пасадзілі як сына «ворага народа». Старая не ведала, дзе ён знаходзіцца і што з ім. Мо таму Ганна Яфімаўна дужа спачувала ўсім зняволеным. Аднойчы, калі я падышоў да акенца, каб атрымаць на брыгаду хлеб, старая, хутка адлічыўшы патрэбную колькасць, пачала распытваць, за што і на колькі год мяне асудзілі, дзе раней да арышту рабіў. Расказаў я ўсё жанчыне. Расказаў і пра бяду, якая сталася з жонкай: пра яе заўчасныя роды і смерць дачушкі...

З таго часу яна давала мне дадатковую пайку хлеба, якой я дзяліўся з Барысам Мікулічам.

Большасць зняволеных былі «ворагамі народа», або «контрыкі». Некаторыя з контрыкаў вельмі любілі спяваць і часам, пасля цяжкага працоўнага дня, яны, пасеўшы на прызбах баракаў, спявалі рускія народныя і рэвалюцыйныя песні.

Аднойчы пачуў нашы песні нейкі прадстаўнік з Масквы і аж пазеляненеў ад злосці:

— Каб я ад гэтых контрыкаў больш песень не чуў! — зайшоўся ён.

— Мы не контрыкі! — запярэчыў Барыс Мікуліч. — Мы не ворагі нашага народа!

— А хто вы — сябры народа!?.. Сябры народа на свабодзе, а не ў лагерах. За паклёп на органы НКУС вас трэба

да шчасця
прага.
І распінаюць
факты
факт,
Ваюе
з сытасцю
галеча.
Выратавальнік сам
і кат
Падсудны род наш чалавечы.
А што як выбух скалане
без папярэдняй кананады
Зямлю...
І ўсе на той вайне —
Засвечаныя кінакадры...

●

Якая дзівосная сіла
У гэтай жанчыне жыла,
Што некага вечна любіла,
А некага вечна кляла.

Яна не прымала сярэдзін
І сэрца яе на зямлі
Мог вораг адно развярэдзіць,
Каханы хіба акрыліць.

Знайшла, як усе, на пагосце
Спакой для сябе, цішыню...
І вораг прыходзіць у госці
І той, што бліжэй за радню.

Прыводзіць жа іх да магілы
Яна, што так дзіўна жыла,
Што некага вечна любіла,
А некага вечна кляла.

На роздуме?

Адштурхнуўшы шчасліва
і бога і д'ябла,
Ты нічога ўзамен
сабе не ўзяла,
Толькі яблык разладу,
няспелы яблык
Для пустога стала.
Ты крычала ад голаду
ўсюды агіткі,
Абяцала здзяйсненне
вялікіх спраў,
А яны памясціліся
ў тонкім сшытку,
У тым самым,
што д'ябал у бога ўкраў...

Лёсу галубка

Позна
рабіць
зарубку
Мне на лёсе сваім,
Дзікага
лёсу
галубка
Пырхнула,
нібы дым,
Крыллем пралапатала,
Мільганула крыжом —
Божа,
як гэтага мала
І як многа ўжо...

Кінакадры

Расхінула
машына
барты —
І пасыпаліся не з дрэва
Наліўныя
жывыя
плады
Для спакусы Адама з Евай.
Ах, як яблыкі ўніз ляцяць!
А за імі
тут жа
пагоня —
Дзеці яблыкі хрубасцяць,
Згаладалыя быццам коні.
Ды астатнія
ўніз
імчаць,
Па асфальце
імкліва
коцяцца —
Круглабока
мільгае
ў вачах
Наліўная
духмяная
конніца.
Што за фільм? Не ўспомню ніяк...
І якое ў ім думкі зерне...
Колькі раз ён мяне,
аднак,
Да тых яблыкаў
яшчэ верне.
Можа,
справа ў машыны бартах,
Што расхрысталіся крылата,
Мо ў пладах,
наліўных пладах,
Што рассыпаліся,
як салдаты...

расстраляць!.. — і, звяртаючыся да начальніка лагернага пункта, загадаў: — У ізалятар яго, а потым на лесапавал!

У штрафны ізалятар-кандзей начальнік лагернага пункта Барыса не пасадзіў, а вось на лесапавал адправіў.

Аднойчы мы з ім спілавалі тоўстую, што не абхапіць рукамі, сасну. Трэба было яшчэ распілаваць яе на метровай даўжыні чурбакі і пакалоць на дровы. Сталі мы на каленькі, і пілуем. Раптам чуем: «Сцерагіся!» Памкнуліся ўскочыць на ногі, але позна — вялізнае дрэва падала проста на нас. На шчасце, лістаўніца нас не зачапіла. Ляжым, не ўстаём.

Падбег дзесятнік.

— Жывыя. Ну, дзякаваць Богу!

— Жывём і будзем жыць! — адказаў з усмешкай Барыс, устаючы.

Потым Мікуліча перавялі на другі лагпункт. Я ж некаторы час быў брыгадзірам лесанарыхтоўчай брыгады, потым стаў дзесятнікам, а пазней майстрам лесанарыхтовак (вольнанаёмных майстроў было мала). Тым часам пачалася вайна. 9 снежня 1942 года пасля адбыцця незаслужанага пакарання мяне вызвалілі з месц зняволення і прымусілі па дырэктыве № 185 НКУС СССР працаваць «па вольным найме».

Барыс Мікуліч быў вызвалены толькі ў жніўні 1946. Неўзабаве нам давялося сустрэцца. У «Повести для себя» ён напіша пра нашу сустрэчу: «Утром ушел к рейсовому и, ожидая, читал Фраги. Есть любопытные стихи. Ездил на 1-ый. Увидел меня Е. Г. (признаться — мне не хотелось к нему заходить), потащил к себе — у него «полная чаша», жена, очевидно, работящая и хорошая хозяйка, сыновья... ковры, свиньи, — ну где ему срываться отсюда! И все эти отговорки о «снятии судимости» — больше для отвода глаз. Много вспоминали, говорили о Минске, об общих друзьях. И он отговаривает ехать в Минск и вообще в Белоруссию».

Я сапраўды адгаворваў Барыса Міхайлавіча ехаць у Мінск і наогул у Беларусь, бо ведаў, што тых, хто прыехаў са зняволення, органы зноў арыштавалі і выслалі ў Сібір. У 1949 годзе яго выслалі ў Тасееўскі раён Краснаярскага краю.

Вялікія пакуты і здзекі давялося перанесці Барысу Мікулічу за 18 год паднявольнага жыцця. Але ён не зняверыўся, не сагнуўся, заўсёды заставаўся патрыётам сацыялістычнай радзімы, яе сумленным будаўніком. Шкада, што ён не дачакаўся святых вятроў перабудовы. Ён быў бы, я ўпэўнены, у шэрагах змагароў за перамогу дэмакратычных пераўтварэнняў, што адбываюцца ў нашым грамадстве...

Яфім ГАВАРУШКА,
ветэран працы.

Віншуем!

Сёння спаўняецца 80 гадоў празаіку Аляксандру МІРОНАВУ. З гэтай нагоды Рада Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру цёплыя віншаванні, да якіх далучаюцца і супрацоўнікі «ЛіМа».

САЛЮТ КАПІТАНУ!

Адзін з першых успамінаў майго маленства — канечны трамвайны прыпынак на паўночна-ўсходняй ускраіне Мінска, прыпынак, які называўся «Выстаўка» (у гонар першай сельскагаспадарчай выстаўкі БССР). Побач з прыпынкам, праз дарогу, шумеў сасновы бор, куды мама прыводзіла мяне «падыхаць лесам». Назва «Выстаўка» праіснавала ледзь не да пачатку пяцідзесятых, а вось сасновы бор яшчэ ў той час — у трыццатыя гады—стаў называцца паркам імя Чэлюскінцаў. І, значыць, увекавечыў і імя пісьменніка Аляксандра Міронава. Таму што Аляксандр Міронаў быў чэлюскінцам, адным з тых, кім захапляліся ў тыя часы хлапчукі ўсёй краіны.

Чатырохгадовы хлопчык, які хадзіў з мамай па алеях парку Чэлюскінцаў, — ці мог ведаць, што праз дзесяцігоддзі чэлюскінец Міронаў, чалавек з выразным абліччам сапраўднага «марскога ваўка» — загрубелы ад вятрыскаў твар, люлька ў роце, зоркі і разам з тым дзёрзка вясёлы погляд—паўстане перад ім як першы для яго жывы пісьменнік, рэдактар альманаха «Советская Отчизна» (цяпер—часопіс «Нёман»), пісьменнік, які возьме з рук збянтэжанага студэнта сшытачак вершаў, перагартае яго, даючы бязлітасную ацэнку большасці рыфмаваных практыкаванняў, а потым вырве некалькі старонак і скажа: «Гэта мы надрукуем!»

Вядома, першым жывым пісьменнікам мог стаць для мяне і хто-небудзь іншы. У тым, што я, пачынаючы паэт, сустрэўся менавіта з Аляксандрам Міронавым, што менавіта ён надрукаваў мае першыя вершы, есць элемент выпадковасці. Ёсць элемент выпадковасці і ў тым, што мне давялося пачынаць сваю літаратурную біяграфію ў той жа газеце, у якой Аляксандр Міронаў у гады свайго юнацтва быў рэпарцёрам — у «Звяздзе». І ўсё ж ёсць тут і заканамернасць: не маглі літаратары майго пакалення не састыкавацца з пакаленнем Міронава. Іх вопыт зрабіўся і нашым вопытам, нават іх блуканні і трагічныя памылкі пайшлі нам на карысць, бо і яны—вопыт. Можа, перш за ўсё—яны...

Гэты вопыт—разам з народжанымі часам ілюзіямі, разам з рамантызмам сталінскіх пяцігодак, ад якога гэтак цяжка было пазбавіцца, — застаўся ў прозе Аляксандра Міронава, у шматлікіх яго аповесцях і апавяданнях аб моры, аб людзях мора, у прыватнасці, у «Лёдавай Адысеі», у такіх рэчах, як «Далёка на Поўначы» і «Праз тысячу смерцяў». Не толькі ілюзіі змест гэтай прозы, але і праўда жыцця, атмасфера часу, сапраўдная героіка Вялікай Айчыннай.

Ёсць такая кніга—лоцыя. Гэта кіраўніцтва для плавання, якое змяшчае апісанне мораў, марскіх узбярэжжаў, меляў, небяспечных праліваў і гэтак далей. Без лоцыі ні адзін карабель не выходзіць у мора. І калі па традыцыі параўнаць з морам жыццё, дык можна сказаць, што творчасць Аляксандра Міронава — адзін з запісаў у лоцыі, і гэта добрасумленны запіс, шчыры, ад сэрца.

Сёння Аляксандру Міронаву спаўняецца восемдзесят год. А я па-ранейшаму бачу яго маладым, з люлькай, у капітанскім кіцелі, бачу яго зоркі і разам з тым дзёрзка вясёлы погляд. І, як матрос, як адзін з дзесяткаў, калі не сотняў тых, каго ён блаславіў на плаванне ў літаратуры, на свой запіс у лоцыі, я аддаю яму чэсць:

— Салют, капітан! Шчасця Вам і здароўя!

Валянцін ТАРАС.

«ЛіМ» ПАВЕДАМЛЯЕ

Пра што дамовяцца дэпутаты?

Як паінфармавала рэдакцыю парламенцкая апазіцыя БНФ, 23—24 лістапада ў Мінску адбудуцца перагаворы дэпутатаў Балтыйска-Чарнаморскіх рэспублік. У перагаворах удзельнічаюць дэпутаты апазіцыі Вярхоўных Саветаў Украіны і Беларусі і дэпутаты ад дэмакратычнай большасці Вярхоўных Саветаў Эстоніі, Латвіі і Літвы. Па дамоўленасці паміж дэлегацыямі вырашана, што пад час перагавораў журналісты не прысутнічаюць. Разам з тым, будуць праведзены дзве прэс-канферэнцыі— па агульнапалітычных пытаннях і выніковая, пасля завяршэння перагавораў.

Больш падрабязна пра гэтую неардынарную падзею «ЛіМ» паведаміць у наступным нумары.

За творчыя дасягненні

Прэзідыум праўлення МТ БССР надаў званне «Стыпендыят Музычнага таварыства БССР» на 1990-91 навучальны год па ўстановах культуры і мастацтва рэспублікі. За высокія творчыя дасягненні, добрую і выдатную паспяховасць, актыўны ўдзел у музычна-асветніцкай рабоце, прапагандзе беларускай музычнай культуры гэтага звання ўдастоены студэнтка БДК Ларыса Рыдлеўская, студэнтка Мінскага інстытута культуры Алена Якавенка, вучаніца Музычнага ліцэя пры БДК Кацярына Анохіна, навучэнец Маладзечанскага музычнага вучылішча Сяргей Дрозд, навучэнец Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча Дзмітрый Некрашэвіч, навучэнка Брэсцкага музвучылішча Аксана Альшэўская.

Н. В.

Беларускае таварыства ў Карэліі

У Петразаводску адбылося першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па стварэнні ў Карэліі Беларускага культурнага таварыства. На ім гаварылася, што нельга адрадзіць культуру Карэліі без адраджэння культур народаў, якія яе насяляюць, у тым ліку і беларусаў. Іх жа тут 57 тысяч. Абмеркаваны статут згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Старшынёй аргкамітэта выбраны беларускі спявак Лявон Габрусёнак.

«Харошкі» ў Італіі

З Рыма ад карэспандэнта ТАСС С. Старцава прыйшло паведамленне пра паспяховыя гастролі беларускага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» ў гарадах і камунах паўночнай Італіі. Гэты калектыў знаходзіцца тут па запрашэнні аддзялення таварыства «Італія—СССР» горада Пардзноне. Самабытныя канцэртныя праграмы, якія выконваюцца ансамблем на высокім прафесійным узроўні, па заслугах ацанілі гледачы Удыне, Трыеста, Кардзнонцы, Фларэнцыі.

Усе зборы ад канцэртаў і ахвяраванні пойдуць у фонд аказання медыцынскай і аздараўленчай дапамогі беларускім дзецям, што пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Для гэтага ў Італіі адкрыты спецыяльны рахунак.

Падручнікі на роднай мове

Законам аб мовах у Беларускай ССР, як вядома, прадугледжаны выпуск на беларускай мове падручнікаў па спецыяльных дысцыплінах для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Адным з першых да гэтай важнай справы падключылася выдавецтва «Вышэйшая школа». Нядаўна ў перакладзе на беларускую мову тут пабачыў свет дапаможнік Л. Стойлавай і А. Пышкавай, адрасаваны студэнтам педагагічных вучылішчаў,— «Асновы пачатковага курса матэматыкі».

Як сказала нашаму карэспандэнту галоўны рэдактар «Вышэйшай школы» Т. Майбарада, выдавецтва прадоўжыць выпуск падручнікаў на беларускай мове, а таксама навукова-тэрміналагічных слоўнікаў.

НАШ КАР.

ПОМНІК СЛАВЫ ПАЎСТАНЦКАЙ

У пачатку чэрвеня 1863 года конніца паўстанцаў на світанку ўварвалася ў мястэчка Ружаны. Паўстанцы раззброілі тут каманду ўнутранай аховы, узялі 22 ружжы, патроны, амуніцыю, порах і грошы, знішчылі паперы і архіў.

Актыўнасць паўстанцаў у гэтых краях вызначалася тым, што тут быў вялікі лясны масіў, які і цяпер называецца Ружанскай пушчай. Лясы і пушчы ў той час былі суцэльнымі, густымі і балоцістымі, з мноствам рэчак і невялікіх азёр. Адсюль паўстанцы нападалі на гарнізоны гарадоў і мястэчак, на невялікія атрады царскіх карнікаў. Гэтыя абставіны змусілі царскія ўлады раздзяліць пушчу шырокай прасекай на дзве часткі. На прасецы стаялі пасты пяхоты, пастаянна патрулявалі раз'езды казакаў. Гэтая прасека і цяпер называецца ў народзе Паляцкай трыбай.

Вясной 1863 года ў пушчы, недалёка ад вёскі Ласасіна, адбыўся жорсткі бой паўстанцаў з царскімі войскамі. Бой доўжыўся некалькі гадзін з пераменным поспехам. На месцы бою былі пахаваны загінуўшыя паўстанцы. Гэты невялікі ўзгорак захаваўся, і жыхары вёскі Ласасіны называлі яго Мяцежніцкай магілай. Больш за паўстагоддзе назад на гэтай магіле быў пастаўлены сціплы помнік. Потым помнік хтосьці разбурыў, усё вакол зарасло верасам і высокай лясной травой. Аб помніку зналі нямногія. Адшукаць пахаванне паўстанцаў у лесе аказалася нялёгка. Адзін стары жыхар вёскі Ласасіны абяцаў мне паказаць у лесе магілу мяцежнікаў, але пакуль сабраліся — чалавек памёр. Паказаць магілу паўстанцаў падрадзіўся былы ляснік, які жыў на ўзлеску. Але шукалі мы доўга і не знайшлі. Урэшце паказаў мне брацкую магілу паўстанцаў жыхар вёскі Ласасіны Якаў Фаміч Заяц, але таксама аж пасля дзвюх няўдалых спроб. Гэты чалавек шаноўнага ўзросту ў свой час прымаў удзел у пабудове помніка паўстанцам. Памылка была ў тым, што мы шукалі магілу ў лесе, а яна аказалася на ўзлеску, за 3 — 4 кіламетры на поўдзень ад Ласасіны, ва ўрочышчы Гантарня.

Магіла паўстанцаў — гэта вялікі і даволі мураваны прамавугольнік памерам 4,4×2,4 м. Пастамент паваліўся на бок. Абеліск з чорнага граніту ляжыць за межамі прамавугольніка. Вышыня абеліска 1,45 метра. На ім уверсе выбіты крыж, а пад ім надпіс па-польску: «Праху 40 паўстанцаў, польскіх, паўшых у 1863 г. у бітвах з захопнікамі — жыхары павета».

Якаў Фаміч сказаў, што помнік быў пабудаваны ў 1933 годзе, у 70-ю гадавіну паўстання, калісьці ён быў абгароджан драўляным плотам.

...У маўчанні схіляем галовы над магілай паўстанцаў-герояў. Яркае і цёплае сонца заліває лясную высечку. Ціхі ветрык перабірае былінкі сухой травы, шуміць у голлі блізкіх соснаў. Міжволі ўзнікаюць думкі: хто і адкуль гэтыя людзі, пахаваныя ў брацкай магіле? Якой парою бурлівага 1863 года гэта было? Як праходзіў бой паўстанцаў з царскімі карнікамі? Хто кіраваў паўстанцамі ў баі?

На гэтыя пытанні я пастараўся пашукаць адказы ў архівах...

Паўстанне 1863 года ў Беларусі і Літве вельмі напалохала цара, царскіх вяльмож і іх верных служкаў. На яго падаўленне цар паслаў амаль 200-тысячнае войска. А ва ўсіх паўстанцкіх атрадах было не больш як 20 тысяч чалавек, узброеных паляўнічымі стрэльбамі, косамі, віламі і сякерамі, а то і дубінамі.

Але паўстанцы смела ўступалі ва ўзброеныя сутычкі з выдатна ўзброенымі царскімі войскамі і нярэдка перамагалі іх нават у адкрытых баях. Сілу паўстанцам давала тое, што яны змагаліся за праўду, за зямлю і волю. Такім быў і крывавы, упарты бой, які разгарэўся 24 мая 1863 года ў лесе ля вёскі Ласасіны.

Аб ім распавядае дакумент, які захоўваецца ў Маскоўскім цэнтральным ваенна-гістарычным архіве. Дарэчы, ён, як і многія іншыя, змешчаны ў кнізе «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863 — 1864 гадоў. Матэрыялы і дакументы». (Выдавецтва «Наука», М., 1965 г.). Вось што ў ім гаворыцца:

«1863 год, мая 28. Рапарт пружанскага ваеннага начальніка маёра Крэмера камандуючаму войскамі ў Гродзенскай губ. З. С. Манюкіну аб адшуканні паўстанцкіх атрадаў і бітвах з імі.

(...) Прайшоўшы без адпачынку каля 30 вёрст у З з паловай гадзіны папалудні дагнаў шайку Слонімскага павета ў Ружанскай казённай дачы, ва ўчастку Пагарэлае, дзе быў пастаўлены паўстанцам конны пікет, з якога адзін быў схоплены, а ў З вёрстах у палосах дрыгвы, у гразкіх непраходных месцах, за невялікім ручайком, у густой засені лісцёвых дрэў выстаўлены быў паўстанцамі стралковы ланцуг, у якім некаторыя стралкі сядзелі на дрэвах. Выслаўшы наперад 3-ю стралковую роту ў ланцуг з 3 паўзводамі рэзерваў 9 роты, рабіў наступленне. Стралкі, падышоўшы да варожага ланцуга на адлегласць 50 крокаў, сустрэты былі густой стральбой, асабліва пры падбадзёрванні паўстанцаў кіраўнікамі шайкі, каб не адступаць, між якімі чуваць былі галасы: «Панове, храбрэй, іх бардзо мало, адна рота стрэльцаў, мы іх вшысткіх паб'ём!» Хочучы выманіць варожых стралкоў з густога лесу, я загадаў свайму ланцугу адступаць. Інсургенты, падбадзёраныя гэтым, кінуліся наперад, але былі спынены трапнымі стрэламі нашых стралкоў, варожы ланцуг заняў першапачатковую пазіцыю. Не маючы магчымасці выбіць, выстраламі іх з пазіцыі, я загадаў ісці ў атаку, і стралкі з лютасцю кінуліся ў гушчыню лесу, адкінулі варожы ланцуг, і ён, адступаючы бягом, заняў другую пазіцыю, за невялікай палянкай, дзе касінеры спрабавалі спыніць нашых стралкоў, але, сустрэтыя трапнымі стрэламі, спяшаючыся, адступілі за свой ланцуг. Раптоўна пачуліся бакавыя стрэлы, і казачы ўраднік, падляцеўшы да мяне, заявіў, што вораг робіць абход з левага боку. Умацаваўшы абодва флангі рэзервамі 9 роты, падаў сігнал наступлення, і паўстанцы пры адступленні рабілі спробы 8 разоў кідацца наперад з крыкамі «ўра», але кожны раз агонь стралкоў і часці 9 роты прымушалі іх уцякаць і хавацца ў густым лесе, а мы пачалі рабіць бесперапыннае наступленне...

(...) У 7 гадзін паўстанцы ў беспарадку малымі часткамі ад 3 да 5 чалавек і паасобку сталі разбягацца ва ўсе бакі, ужо не адказваючы на наш агонь і, кідаючы зброю, зусім схаваліся ў непраходнай дрыгве, прымыкаючай з левага боку да возера, за 4 вярсты ад вёскі Ласасіны, таксама і кіраўнікі шайкі паасобку выратаваліся ўцёкамі. Бачачы, што зусім марна праследаваць часткі разбітай шайкі, я палічыў патрэбным даць адпачынак і прывесці ў парадак атрад. Сабраўшы роты, прайшоў 14 вёрстаў у м. Ружаны, дзе адпачываў і пахаваў з цырымоніяй забітых ніжніх чыноў...

(...) Страты паўстанцаў павінны быць значнымі, на адным левым крыле налічылі казакі 127 трупаў, у ліку забітых — вайсковы лекар Каліноўскі і многія іншыя асобы, якія па выгляду і вопратцы не з простага звання. У паўстанцаў узяты ў палон беластоцкі памешчык Рафаіл Карыцкі. Атрад гэты да 700 чалавек пешых і 40 коннікаў складаўся з памешчыкаў, шляхты, чыноўнікаў, мяшчан, гімназістаў Беластоцкай, Гродзенскай і Свіслацкай гімназій, адстаўных салдат і часткова з дзяржаўных сялян, меў правільную арганізацыю, г. зн. разлічаны на роты. Галоўны кіраўнік інсургентаў і камісар ваяводства Гродзенскай губерні эмігрант Ануфры Духінскі, адстаўны палкоўнік, які прыбыў з Парыжа...»

На самай справе, як сведчаць архіўныя дакументы, боем паўстанцаў кіраваў не адстаўны палкоўнік Духінскі, які ў пачатку бою быў адрэзаны казакамі ад асноўных сіл паўстанцаў і не прымаў удзелу ў бітве, а паплечнік і шчыры сябра Кастуся Каліноўскага — Валерый Урублеўскі.

Адносна страт паўстанцаў у гэтай бітве царскі служка Крэмер у пагоні за чынамі і ўзнагародамі заняўся яўным ашуканствам. З яго рапарта відаць, што толькі на левым крыле бою казакі налічылі 127 забітых паўстанцаў. А яшчэ ж было і правае крыло! А на абеліску напісана, што ў магіле пахавана 40 паўстанцаў.

Калісьці расказваў мне стары селянін з вёскі Ласасіны, што два паўстанцы пасля гэтага бою схаваліся ў Ласасінскім маёнтку ў стозе саломы. Казакі старанна шукалі паўстанцаў, прабіваючы пікамі і шаблямі салому. Яны нават прабілі аднаму паўстанцу нагу, але ён, нягледзячы на востры боль, не падаў голасу.

Як мы бачым, звесткі архіўнага дакумента не аб'ектыўныя, у ім многа хлусні. Але, тым не менш, ён — яркае сведчанне вялікай мужнасці і ахвярнасці паўстанцаў у іх мужнай і цяжкай барацьбе.

М. ПЯНКО,
настаўнік-пенсіянер.
Пружанскі р-н,
вёска Клепачы.

АБ'ЯВЫ

УВАГА, КОНКУРСЫ!

Калегія Міністэрства культуры БССР, прэзідыум праўлення Беларускага фонду культуры, прэзідыум праўлення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, прэзідыум праўлення Саюза мастакоў Беларусі і прэзідыум праўлення Саюза архітэктараў БССР прынялі сумесную пастанову аб правядзенні адкрытых рэспубліканскіх конкурсаў на распрацоўку лепшых эскізных праектаў помнікаў Кастусю Каліноўскаму (у 1990—1991 гадах) у Гродне, Васілю Вашчыле (1993 г.) у Крычаве, Кірыле Тураўскаму (1993 г.) у Тураве, Сімяону Полацкаму (1992 г.) у Полацку, Францішку Багушэвічу (1992 г.) на Смаргоншчыне, Максіму Багдановічу (1990—1991 гг.) у Гродне.

У конкурсах могуць прыняць удзел як асобныя грамадзяне, маючыя творчую кваліфікацыю (мастакі, архітэктары, дызайнеры), так і творчыя калектывы. На конкурсы падаюцца наступныя матэрыялы:

1. Мадэль помніка 80—100 см, макет у маштабе 1:20;
2. Генплан у маштабе 1:500;
3. Перспектыва ці фотамантаж (на падрамку 100 х 100 см у чорна-белай графіцы);
4. Тлумачальная запіска.

Усе конкурсныя матэрыялы прадстаўляюцца пад дэвізам (шасцізначнай лічбай, вышыня шрыфту 1 см), які наносіцца ў правым верхнім вуглу ўсіх планшэтаў, а таксама на дэвізным канверце, у якім павінны знаходзіцца дадатковыя звесткі, падпісаныя ўсімі аўтарамі, аб працэнтным размеркаванні прэмій паміж імі.

Конкурсныя праекты прымаюцца з 9.00 да 18.00 гадзін па адрасу: г. Мінск, вул. Казлова, 3, Палац мастацтваў. Накіраваныя на конкурс матэрыялы іншагародніх аўтараў будуць прымацца па адзнакам паштовых аддзяленняў.

У мэтах шырокага абмеркавання спецыялістамі матэрыялаў прадугледжваецца арганізаваць выстаўкі праектаў.

Ход абмеркавання праектаў і вынікі конкурсаў будуць асвятляцца сродкамі масавай інфармацыі.

За лепшыя праекты з ліку прадстаўленых на кожны конкурс абвяшчаюцца наступныя прэміі:
адна першая — 2000 рублёў,
адна другая — 1500 рублёў,
адна трэцяя — 1000 рублёў.

Аўтары праектаў, атрымаўшых першыя прэміі, карыстаюцца пераважным правам на іх рэалізацыю. Праграмы і ўмовы конкурсаў удзельнікам прадстаўляе Дырэкцыя мастацкіх выставак Міністэрства культуры БССР. Тэлефоны для даведак 27-01-41, з іканаграфічным і іншым даведачным матэрыялам можна пазнаёміцца ў Дзяржаўным музеі БССР (вул. К. Маркса, 12, тэл. 26-11-14).

Конкурс на помнік Кастусю Каліноўскаму ў Гродне праводзіцца па 1 кастрычніка 1991 г.

Конкурс на помнік Максіму Багдановічу ў Гродне — па 1 снежня 1991 г.

Конкурс на помнік Сімяону Полацкаму ў Полацку — па 1 кастрычніка 1992 г.

Конкурс на помнік Францішку Багушэвічу на Смаргоншчыне — па май 1992 года.

Конкурс на помнік В. Вашчыле ў Крычаве — па сакавік (уключна) 1993 г.

Конкурс на помнік Кірыле Тураўскаму ў Тураве — па сакавік (уключна) 1993 г.

Арганізатары конкурсаў просяць будучых удзельнікаў творчага спаборніцтва засяродзіць сваю ўвагу найперш на помніках Кастусю Каліноўскаму і Максіму Багдановічу, бо менавіта гэтыя конкурсы павінны даць вынікі ўжо ў будучым годзе.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62; бухгалтэрыя — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.